ВІЦЕБСКІ КРАЙ

2

ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Да 385-годдзя выдання “Буквара” Спірыдона Собаля

2

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ
І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА
«ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА»

УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ «ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

ВІЦЕБСКІ КРАЙ

Т. 2

Матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля

24 лістапада 2016 г., Віцебск

Мінск 2017

УДК 947 (Р476.5)
ББК 63.3 (4 Беи-Вит)5
В54

Рэцэнзенты:
дэкан гістарычнага факультэта ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»,
доктар гістарычных навук, прафесар В. А. Космач,

загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі дзяржаўнай навуковай
установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
кандыдат гістарычных навук А. Б. Доўнар,

загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава»,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. М. Дулаў

Рэдакцыйная калегія:
Т. М. Адамян (гал. рэд.), В. М. Камендантава, Л. І. Рагачова,
В. М. Аўсяннікава, А. М. Васілеўская, Н. В. Фенчанка

На вокладцы – царква Аршанскага Куцеінскага манастыра Магілёўскай губерні

Віцебскі край : матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай
В54 канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля, 24 лістапада 2016 г., Віцебск / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей», Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Кафедра гісторыі Беларусі ; [рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2017. – Т. 2. – 336 с.
ISBN 978-985-7125-21-0

У т. 2 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля, якая адбылася 24 лістапада 2016 г. у ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна».

Выданне адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

УДК 947 (Р476.5)
ББК 63.3 (4 Беи-Вит)5

ISBN 978-985-7125-21-0

© Дзяржаўная ўстанова «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2017
© Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2017

ПРАДМОВА

24 лістапада 2016 г. у ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» адбылася II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край», прысвечаная 385-годдзю выхаду ў свет «Буквара» Спірыдона Собаля. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна, Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава.

Для ўдзелу ў канферэнцыі было пададзена больш за 60 заявак ад краязнаўцаў, гісторыкаў, супрацоўнікаў архіваў, музеяў, бібліятэк, вышэйшых навучальных устаноў з Беларусі, Расіі, Латвіі. Сярод беларускіх удзельнікаў мерапрыемства былі прадстаўнікі з Мінска, Віцебска, Брэста, Гомеля, Магілёва, Полацка, раённых цэнтраў Віцебскай і Брэсцкай абласцей. Каля 50 выступоўцаў прынялі ўдзел у рабоце наступных секцый: «Гістарычнае краязнаўства», «Літаратурнае краязнаўства і мастацкая культура», «Культурна-асветныя ўстановы ў сістэме сучаснага краязнаўства», «Рэлігійнае жыццё: гісторыя і сучаснасць». Шырокая тэматыка дакладаў закранала разнастайныя пытанні гісторыі Беларусі, гісторыі мастацтва і кнігадрукавання, літаратуразнаўства, краязнаўства.

У т. 2 штогадовага выдання «Віцебскі край» увайшлі матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. Яно адрасавана гісторыкам, музейным супрацоўнікам, архівістам, краязнаўцам, бібліятэкарам, педагогам, усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

ГІСТАРЫЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА

Агееў А.Р. *(г. Магілёў)*

ДЗЕЙНАСЦЬ СПІРЫДОНА СОБАЛЯ Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІХ ШКОЛЬНЫХ СУВЯЗЕЙ КАНЦА XVI – XVII ст.

У XVI – пачатку XVII ст. на беларускіх землях фарміруецца сістэма асветы, адпаведная новаму часу: узнікаюць пратэстанцкія, каталіцкія і праваслаўныя школы. Яны ўсё шырэй адкрываюцца пры кляштарах, саборах, цэрквах і зборах. Аб дзейнасці першых навучальных устаноў на Магілёўшчыне засталося вельмі мала сведчанняў. Тым не менш гістарычныя дакументы відавочна сведчаць, што ў XVII–XVIII стст. украінскія і магілёўскія землі знаходзіліся ў адной культурнай прасторы, а іх узаемасувязі і ўзаемаўплывы ярка выявіліся ў галіне асветы і школьнай адукацыі, найперш праваслаўнай.

На ўсходніх землях Беларусі ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. найбольш шырокае распаўсюджванне сярод пратэстанцкіх плыняў атрымаў кальвінізм. Менавіта кальвіністаў можна лічыць першапраходцамі новага этапу развіцця асветы і адукацыі на беларускіх землях, якія здолелі стварыць сваю школьную сетку. У 1570 г. у Беларусі налічваліся 163 кальвінісцкія зборы. На Магілёўшчыне яны дзейнічалі ў Магілёве, Оршы, Шклове [2, с. 141].

Каталіцкія навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі былі прадстаўлены саборнымі, кафедральнымі, манастырскімі, дыяцэзіяльнымі школамі. Станаўленню навукі, развіццю еўрапейскай сістэмы адукацыі ў Беларусі садзейнічала дзейнасць каталіцкай арганізацыі «Таварыства Езуса». У XVII ст. намаганнямі езуітаў школы і калегіумы былі створаны ў Оршы, Бабруйску, Магілёве, Мсціславе і іншых гарадах усходняй Беларусі [2, с. 119]. Невялікія школы існавалі пры езуіцкіх рэзідэнцыях і місіях у Клімавічах, Расне. З мэтай прыцягнення моладзі ў езуіцкія школы навучанне ў іх вялося не толькі на лацінскай, польскай мовах, але і на беларускай. У Магілёве езуіцкая рэзідэнцыя, заснаваная вядомым царкоўным дзеячам Я. Здановічам, дзейнічала з 1680 па 1779 г. Ёй падпарадкоўваліся езуіцкія місіі ў Гомелі, Фашчаве, Хальчы, Чачэрску і інш. Каля 1684 г. пры рэзідэнцыі была адкрыта музычная бурса, з 1691 г. працавала школа.

Праваслаўнае насельніцтва не жадала саступаць прадстаўнікам іншых веравызнанняў як у плане матэрыяльнага дабрабыту, так і ў духоўнай сферы. Развіццё пратэстанцкай і каталіцкай агульнадаступнай школьнай адукацыі мела відавочную празаходнюю арыентацыю і стала выклікам для праваслаўнай супольнасці, якая ўласнай адукацыйнай традыцыі яшчэ не выпрацавала. Але адказ патрабаванням часу быў дастаткова хутка знойдзены. У 1585 г. была

адкрыта брацкая школа ў Вільні, а ў 1586 г. пачала працаваць Львоўская школа, якая стала першай брацкай школай на ўкраінскіх землях. Пры падтрымцы праваслаўнай шляхты ў канцы XVI – пачатку XVII ст. у Вільні, Львове, Магілёве, Брэсце, Луцку, Галоўчыне, Кіеве, Мінску, Пінску, Слуцку, Крычаве, Мсціславе, Оршы, Шклове, Полацку і іншых беларускіх і ўкраінскіх гарадах утвараюцца буйныя праваслаўныя брацтвы. Гэтыя рэлігійна-нацыянальныя арганізацыі праваслаўнага гарадскога насельніцтва Беларусі і Украіны ў XVI–XVIII стст. арганізоўвалі свае брацкія школы. Да пачатку XVII ст. у Рэчы Паспалітай існавала ўжо каля 30 такіх школ.

Магілёў дазвол на стварэнне гарадской школы атрымаў разам з наданнем яму Стэфанам Баторыем магдэбургскага права ў 1577 г., але ва ўмовах Лівонскай вайны горад не здолеў ім скарыстацца. Толькі ў 1590–1592 гг. (але ў ліку першых на беларускіх землях) магілёўскія мяшчане стварылі брацтва і адкрылі брацкую школу пры Спаскім манастыры [2, с. 53]. У Магілёўскай, як і ў Віленскай школе, з самага пачатку выкладалі чатыры мовы – царкоўнаславянскую, «простую мову» (беларускую), латынь і польскую – а таксама вывучалі дыялектыку, рыторыку, арыфметыку, геаметрыю, астраномію, геаграфію. Навучанне вялося на царкоўнаславянскай і беларускай мовах [4, с. 22–23, 54]. Выкладанне лацінскай і польскай моў з моманту заснавання вылучае магілёўскую школу з ліку іншых брацкіх школ на тэрыторыі Беларусі. У гэты ж час узнікаюць брацкія школы ў Шклове, пры Баркалабаўскім манастыры, у Куцейне пад Оршай і Буйнічах пад Магілёвам. У брацкіх школах навучаліся дзеці розных слаёў гарадскога насельніцтва. У большасці школ акрамя моў вывучаліся дыялектыка, астраномія, арыфметыка, музыка, а гісторыя і геаграфія як асобныя прадметы не выкладаліся. Брацкія школы кіраваліся статутамі, у аснове якіх ляжалі педагагічныя прынцыпы, распрацаваныя і прадстаўленыя ў статуце Львоўскай брацкай школы. Гэты статут быў своеасаблівым узорам для магілёўскай школы. У статуце Магілёўскай брацкай школы 1597 г. так і гаворыцца: «…беручы прыклад з іншых мест», што хутчэй за ўсё ўказвае на запазычанне вучэбнай праграмы Львоўскай школы 1590 г. [5, с. 27–29; 6, с. 30].

Першымі настаўнікамі ў магілёўскай школе былі ў асноўным выхадцы з Кіева: Касовіч, «студэнт з Кіева», навучаў латыні, Цімафей Грыбач і Павел Іеўлеў – рускаму чытанню, Афанасій Стралецкі – «пачаткам латыні», Фёдар Тарасовіч – маральнасці. Вядомыя імёны настаўнікаў: Каткоўскі, Фама Тавбаровіч і Радко, Ігнат Іяўлевіч, Д. Макарэвіч, Васілеўскі, Сава Андрэевіч, які меў ступень магістра, а значыць вучыўся ў нейкім універсітэце [4, с. 56–57].

У 1624 г. будынак магілёўскай школы перайшоў да ўніятаў, аднак у 1633 г. выкладанне аднавілася. У 1654 г., пасля таго як рускія войскі занялі Магілёў, цар Аляксей Міхайлавіч дараваў брацкаму вучылішчу правы, роўныя з кіеўскай школай. Пасля вяртання ў 1667 г. горада ў склад Рэчы Паспалітай выкладанне ў школе па-ранейшаму адбывалася па праграме кіеўскай калегіі.

Брацкія друкарні Украіны і Беларусі выдалі вялікую колькасць вучэбных дапаможнікаў. Першыя ў Беларусі друкарні з'явіліся на ўсходзе краіны (у Буйнічах пад Магілёвам (1635), Бялынічах (1638–1653) і Куцейне пад Оршай) паралельна з друкарнямі ў Вільні, Брэсце і Нясвіжы. Асабліва актыўна мясцовае кнігадрукаванне пачало развівацца з пачатку XVII ст., калі ў 1616 г. была створана друкарня пры Магілёўскім брацтве, якая з перапынкамі працавала да 1773 г. Магілёў і Куцейна сталі галоўнымі цэнтрамі кірылічнага кнігадрукавання Беларусі з другой чвэрці XVII ст. Менавіта ў гэты час склалася Магілёўская школа гравюры. Яе стварэнню садзейнічалі кнігавыдаўцы Спірыдон Собаль і Фёдар Грышановіч, мастакі-гравёры Максім і Васіль Вашчанкі, Фёдар Ангілейка [1, с. 26]. Магілёўскія друкарні былі вядомы далёка за межамі нашага рэгіёна і надалей.

Сярод выбітных асоб асветы і школьнай адукацыі гэтага часу, спадчыну якіх немагчыма і непатрэбна дзяліць украінскаму і беларускаму народам, вылучаюцца Лаўрэнцій Зізаній, Мялецій Сматрыцкі, Спірыдон Собаль. На мяжы XVI–XVII стст. у Буйнічах пад Магілёвам настаўнічаў беларускі і ўкраінскі асветнік, педагог, царкоўны дзеяч Лаўрэнцій Зізаній. Ён працаваў выкладчыкам брацкіх школ у Львове (да 1592 г.), Брэсце (1592–1595), Вільні (1595–1597), хатнім настаўнікам сына крычаўскага старасты Б. Саламярэцкага (1597–1600) і дзяцей князя А.К. Астрожскага (1600–1602), пасля ў князя Я. Карэцкага на Валыні (да 1618 г.). У 1596 г. у Вільні Лаўрэнцій Зізаній першым у Беларусі і Украіне надрукаваў азбуку «Наука ку читаню и розуменю писма словенскаго» з малюнкамі. У гэтым жа годзе ім была выдадзена «Грамматіка словенска съвершеннаго искуства осми частій слова». Буквар і граматыка Зізанія мелі значны ўплыў на развіццё мовазнаўчай навукі ўсходніх і паўднёвых славян. Свой унёсак у развіццё брацкіх школ Беларусі зрабіў аўтар вядомай «Граматыкі славенскай…» беларускі і ўкраінскі асветнік, пісьменнік-палеміст, царкоўны і грамадскі дзеяч Мялецій Сматрыцкі. З 1600 г. ён жыў у князя Б. Саламярэцкага ў в. Баркулабава на Магілёўшчыне (па іншых звестках, у Буйнічах).

Біяграфія буйнейшага беларускага асветніка XVII ст. Спірыдона Собаля з'яўляецца яскравым прыкладам сувязей і ўзаемаўзбагачэння школьных сістэм Магілёўшчыны і Кіеўшчыны. Будучы рэктар Магілёўскай і Кіеўскай брацкіх школ нарадзіўся ў Магілёве ў сям'і магілёўскага бурмістра Б.І. Собаля ў канцы XVI ст. Напэўна, адукацыю атрымаў у Кіеве. У Магілёўскай брацкай школе пачаў працаваць настаўнікам, а затым стаў яе рэктарам. З 1624 г. пачынаецца настаўніцкая праца ў Кіеўскай брацкай школе, дзе ў 1626 г. яго выбіраюць рэктарам.

Значна лепш нам вядомы друкарскі перыяд у жыцці асветніка. У 1628–1630 гг. у Кіеве каля Уваскрасенскай царквы на Падоле Спірыдон Собаль друкаваў кнігі ў доме мітрапаліта Іова Барэцкага, пасля смерці якога вярнуўся ў Беларусь. З 1630 г. у Куцейне пад Оршай і затым у Буйнічах пад Магілёвам

(каля 1635) ён прымаў удзел у заснаванні друкарань, дзе працягваў выдаваць кнігі. Акрамя кніг для царквы Спірыдон Собаль выдаў кнігі для хатняй малітвы, кнігі маральна-павучальнага зместу, пераклады з грэчаскай мовы і буквары. Менавіта дзякуючы апошнім ён найбольш вядомы.

На сённяшні дзень адзіны вядомы экзэмпляр першага «Буквара…» Спірыдона Собаля захоўваецца ў Львове ў Музеі ўкраінскага мастацтва. Яго можна лічыць першым беларускім спецыялізаваным падручнікам. Спірыдон Собаль не толькі надрукаваў першы «Буквар…», але і ўпершыню ўвёў ва ўжытак само слова «буквар», якое пазней замацавалася як назва першага падручніка, па якім дзеці пачынаюць вучыцца чытаць і пісаць. «Букварь сиречъ, начало ученіа детем начинающим чтенію извыкати» быў выдадзены ў Куцейне ў 1631 і 1636 гг., а ў Магілёўскай брацкай друкарні ў 1636 г. – «Букварь языка славеньска».

Куцеінскі «Буквар…» утрымліваў першапачатковыя веды па граматыцы, якія давалі магчымасць авалодаць тэхнікай пісьма і чытання. Кніга мела 40 аркушаў. Яна стала шырока вядома ва Украіне, ВКЛ і Масковіі. 44 літары алфавіта, вялікія і маленькія, спачатку друкаваліся ў звычайным, а затым у зваротным парадку. Пасля ішлі двухлітарныя і трохлітарныя склады, многія – як самастойныя словы: «рай», «май», «мне»… Далей навучэнцам прапаноўваліся словы на асобныя літары. У буквары ўтрымліваюцца звесткі аб націску, знаках прыпынку, скланенні назоўнікаў, прыметнікаў, дзеепрыметнікаў. Пад назвай «Парадеігмата» была прадстаўлена табліца пяці скланенняў старославянскай мовы. Спецыяльны раздзел чытанкі прысвечаны хрысціянскім запаведзям, накіраваным на фарміраванне высокіх маральных якасцей.

У Магілёўскай брацкай школе ў 20-я гг. XVII ст. вучыліся вядомыя праваслаўныя дзеячы Ігнат і Фама Іяўлевічы, што дазволіла ім паступіць адпаведна ў Замойскую і Кракаўскую акадэміі. Фама Якаўлевіч Іяўлевіч (Еўлевіч), – культурны і рэлігійны дзеяч Рэчы Паспалітай, польскамоўны паэт, гуманіст, нарадзіўся ў Магілёве, у 1628–1631 гг. быў рэктарам Кіеўскай брацкай школы. Пасля ўтварэння Кіева-Магілянскага калегіума вярнуўся ў Магілёў.

Такім чынам, плённасць украінска-беларускіх культурных кантактаў засведчана часам. Узорам для брацкіх школ быў статут Львоўскай брацкай школы, а пазней праграмы кіеўскага калегіума. Для праваслаўнай школьнай адукацыі XVII–XVIII стст. цэнтрам падрыхтоўкі школьных кадраў з'яўляўся Кіеў. Назіралася ўзаемная ратацыя настаўнікаў, пры гэтым пераважаў рух настаўнікаў з Кіева на Магілёўшчыну. Беларускія і ўкраінскія брацкія школы з пункта гледжання агульнаеўрапейскіх працэсаў можна разглядаць у кантэксце станаўлення гарадскіх і цэхавых школ Еўропы. У выданні вучэбных дапаможнікаў вялікую ролю адыгралі магілёўскія друкары, сярод якіх адным з самых вядомых і плённых лічыцца Спірыдон Собаль.

ЛІТАРАТУРА

1. **Агеев, А. Г.** Перекрестки могилевской истории / А. Г. Агеев, Я. И. Климуть, И. А. Пушкин. – Минск : Туринфо, 2004. – 216 с. : ил.

2. **Асвета** і педагагічная думка ў Беларусі : са старажыт. часоў да 1917 г. / [М. М. Абраменка і інш. ; рэдкал.: М. А. Лазарук (адк. рэд.) і інш.]. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 464 с.

3. **Блинова, Т. Б.** Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 425 с.

4. **Жудро, Ф. А.** История могилевского Богоявленского братства / Ф. А. Жудро. – Могилев на Днепре : Скоропечатня и литография Ш. Фридманда, 1890. – 112 с.

5. **Науменко, В. В.** Очерки истории образования Могилевщины / В. В. Науменко, В. С. Богданов, А. Р. Агеев ; под общ. ред. Л. С. Смотрицкого. – Могилев : МГОИРО, 2012. – 504 с. : ил.

6. **Самусік, А. Ф.** Магілёўская брацкая школа ў святле эвалюцыі агульнаеўрапейскай гуманістычнай сістэмы педагогікі XVI–XVII стагоддзяў / А. Ф. Самусік // Гістарычнае і сацыякультурнае развіццё Магілёва : зб. навук. прац / уклад. І. А. Пушкін, В. В. Юдзін. – Магілёў, 2007. – С. 27–33.

Анисяев М.А. *(г. Минск)*

ОРГАНИЗАЦИЯ БОРЬБЫ С ДЕЗЕРТИРСТВОМ НА ЗАПАДНОМ ФРОНТЕ В 1919–1920 гг.

Первые бои между частями Западного фронта и польскими легионерами в марте 1919 г. показали слабую обученность соединений Красной Армии, что явилось результатом формирования их в походных условиях. Особенностью Западного фронта было и то, что его части и соединения создавались как национальные формирования из населения Беларуси и советских прибалтийских республик, образовавшихся в этот период. Это создавало благодатную почву для проявления элементов сепаратизма и местничества. Стремление некоторых военных руководителей этих республик обособить воинские соединения, изъять управление ими из подчинения командования Западного фронта способствовало нарушению единства управления частями фронта [1, с. 68]. Красная Армия отступала, над Беларусью нависла угроза оккупации войсками Польши.

Чрезвычайно сложной была и политическая обстановка в районе боевых действий. Националисты настраивали население прифронтовой полосы против советской власти, в тылу войск действовала польская агентура. Контрреволюционными элементами проводилась идеологическая обработка личного состава Красной Армии. В то же время в частях политическая работа среди красноармейцев находилась не на должном уровне, имели место недостатки в снабжении частей продовольствием, денежным довольствием и

обмундированием – все это не могло не оказать влияния на наименее устойчивую часть красноармейцев, особенно из среды местного населения. Участились случаи массового отказа от исполнения приказов, боевые позиции самовольно покидали иногда целые подразделения.

Уклонение от мобилизации и дезертирство наносили огромный вред Красной Армии. Они не только уменьшали ее численность, но в ряде случаев усиливали банды, деморализующе влияли на неустойчивые в идейном и моральном отношении красноармейцев. В тылу войск действовали многочисленные банды, численность которых доходила до нескольких сотен. По данным председателя Минской губернской комиссии по борьбе с дезертирством, на июль 1919 г. только в семи уездах губернии уклонялось от призыва «самое меньшее» 28–35 тыс. человек [4].

Борьба с дезертирством была возложена на созданные при военных комиссариатах губернские и уездные (тыловые) комиссии, работой которых руководила Центральная комиссия, и поэтому она в прямые задачи особых отделов (военной контрразведки) не входила. Первоначально особым отделам отводилась пассивная роль – при обнаружении уклоняющихся от воинской повинности лиц передавать их в распоряжение местных комиссий по борьбе с дезертирством. В мае 1919 г. в результате непрекращающегося дезертирства и активных боевых действий со стороны Польши сложилась напряженная обстановка на Западном фронте. Эти обстоятельства заставили военно-политическое руководство страны принять срочные меры по укреплению боеспособности армии и тыла. С целью организации действий по ликвидации вооруженных дезертиров создавались оперативные тройки в составе председателя губернской комиссии по борьбе с дезертирством, представителей губернского партийного комитета и Губчека. На них возлагались координирующие действия, а вся ответственность за борьбу с дезертирством в губернии оставалась за губернской комиссией по борьбе с дезертирством.

Однако жизнь очень скоро показала недостаточность деятельности губернских оперативных троек. Учитывая это, 6 июля 1919 г. в Смоленске Реввоенсовет Республики (РВСР) организовал Оперативный штаб по борьбе с дезертирством. Тем самым РВСР сделал попытку объединить и скоординировать усилия оперативных троек на территории Западного фронта в борьбе с дезертирством и по укреплению общественного порядка на местах.

По мнению автора, указанные меры не могли устранить данную проблему, так как решали только частные задачи; основные условия возникновения дезертирства как явления не устранялись, поэтому оно оставалось на высоком уровне. Видя такое положение, РВСР выразил обеспокоенность тем, что «работа существующих органов не дает положительных результатов, бандитизм получает все большее и большее распространение» [6]. Реагируя на это беспокойство, РВС Западного фронта по своей инициативе в ноябре

1919 г. разработал Положение о чрезвычайной тройке по борьбе с дезертирством и бандитизмом в пределах фронта. Необходимость реорганизации и упорядочения деятельности органов, ведущих борьбу с дезертирством, была очевидна. В этой связи РВСР приказом № 1927 от 17 ноября 1919 г. предписал образовать полевые комиссии по борьбе с дезертирством и при реввоенсоветах фронтов, армий и при штабах дивизий в составе трех членов: комиссара штаба, представителей политотдела и особого отдела. Председателем комиссии назначался комиссар штаба. На эти комиссии возлагалась вся борьба с дезертирством во фронтовой и прилегающей к фронту полосе. В соответствии с этим приказом РВСР Западного фронта 23 декабря 1919 г. образовал полевую комиссию в составе военного комиссара штаба фронта, сотрудника политотдела и военного следователя особого отдела Павульсона [7]. Процесс создания полевых комиссий по борьбе с дезертирством на Западном фронте затянулся до весны 1920 г.

Летом 1920 г. Западный фронт готовился к решительным боям с войсками Польши. 15-я армия Западного фронта по условиям стратегической обстановки имела задачу нанести главный удар по противнику на территории Витебской губернии. Однако там с наступлением теплого времени появилась банда дезертиров, причем деятельность ее имела очень активный характер [8]. РВСР потребовал, чтобы в течение ближайших трех недель уклонение от явок, незаконные отлучки и дезертирство были «вырваны с корнем» [9]. Борьба с дезертирством велась как путем широкой агитации, так и карательными мерами: облавами, арестами и конфискацией имущества у дезертиров и их укрывателей; к наиболее злостным дезертирам применяли расстрел [2, с. 4]. При ликвидации вооруженных банд полевые комиссии в качестве основной силы для облав, создания заградительных отрядов использовались отдельные роты и полки особого назначения при реввоенсоветах армии, а с июня 1920 г. – отряды особого назначения при особых отделах. От умелого их применения зависел успех борьбы с дезертирством. Так, три отдельные роты, находящиеся в Сураже и Велиже, своим присутствием сорвали попытку дезорганизовать бандитами сплав леса по Западной Двине.

В этот же период СТО своим постановлением от 12 мая 1920 г. установил неделю добровольной явки, освобождающей дезертиров от ответственности. Выполняя это постановление, партийные организации и ревкомы Витебской и Гомельской губерний провели широкую разъяснительную работу среди населения о добровольной явке дезертиров. Эта кампания ожидаемых результатов не дала [10]. Количество дезертиров к маю 1920 г. превысило 400 тыс. Этому способствовало крайне негативное отношение крестьянства к продразверстке и всякого рода реквизициям [10]. Однако мер к более активной борьбе с бандитизмом и действительному их искоренению почти не принималось.

Командование Западного фронта, учитывая предстоящее общее наступление, в целях обеспечения безопасности тыла Красной Армии, борьбы с польским шпионажем и бандитизмом решило провести генеральную чистку тыла от дезертиров и «вредного элемента» путем ликвидации банд и выселения за тыловую линию лиц польской национальности.

Для организации этих мероприятий на основании приказа РВС Западного фронта были созданы Особые комиссии по очистке прифронтовой полосы от «вредного элемента» [11]. Особые отделы входили в состав этих комиссий. Однако единого мнения о категории выселяемых не было. Так, 10 мая 1920 г. в Витебске комиссия в составе заместителя начальника особого отдела 15-й армии С.С. Турло, заместителя заведующего секретным отделом Витебской губернии Губчека Громова и начальника гарнизона Масена обсудила вопрос об очистке прифронтовой полосы, в частности Витебска и губернии, от подозрительного и «вредного элемента». Комиссия предложила произвести регистрацию лиц обоего пола польской национальности от 16 до 60 лет по особой анкете [12]. Однако присутствующий представитель Особого отдела Всероссийской чрезвычайной комиссии по борьбе с контрреволюцией и саботажем (ВЧК) Маковский категорически настаивал на регистрации и литовцев. Для получения санкции председатель комиссии С.С. Турло по прямому проводу в тот же день переговорил с членом РВС Западного фронта Н.С. Тихменевым, который и предложил вопрос о регистрации литовцев пока оставить открытым, так как указаний о регистрации лиц литовской национальности не было. На следующий день пришла телеграмма ВЧК о регистрации только поляков.

12 мая 1920 г. был разработан и опубликован в газете приказ, согласно которому предписывалось «всем гражданам польской национальности обоего пола, проживающим в г. Витебске и уезде, в возрасте с 16 до 60 лет зарегистрироваться в помещении особого отдела... Лица, не зарегистрировавшиеся до 16 мая с. г., будут считаться белогвардейскими шпионами и караться по законам военного времени... Лица, укрывшие шпиона или содействующие укрывательству таковых, будут караться наравне со шпионами» [13]. Однако на регистрацию начали являться не только поляки, но и белорусы, литовцы и другие, исповедовавшие римско-католическую веру [14], поскольку по обычаю считали себя поляками. В связи с чем 13 мая 1920 г. был опубликован дополнительный приказ, согласно которому регистрации подлежали лишь лица польской национальности, независимо от вероисповедания [15].

27 июня 1920 г. РВС Западного фронта ужесточил меры и издал приказ № 1393 о выселении из боевой зоны всех поляков в возрасте от 16 до 55 лет. Коменданты штабов дивизий, бригад и полков при содействии особого отдела начали выселение из боевой зоны за тыловую линию всех поляков по их бывшему социальному положению и прошлому, представлявших враждебный советскому строю элемент:

– бывших помещиков, владельцев крупных предприятий, торговцев, директоров фабрик, заводов, банков, управляющих имениями, заводами и предприятиями;

– лиц подозрительных, против которых не было достаточных улик для привлечения к судебной ответственности;

– состоятельных крестьян, которые привлекали других лиц для обработки земли;

– лиц свободных профессий, которые нелояльно относились к советскому строю;

– лиц, не имеющих определенных занятий и источников к существованию [16].

Выселению не подлежали поляки – члены РКП(б) и трудовое население. Ответственность за выселение вышеперечисленных категорий в глубь России возлагалась на губернские ЧК, которые осуществляли это через губернские, уездные и волостные ревкомы и исполкомы. В первую очередь выселяли мужчин, во вторую подозрительных женщин. Семьи тех и других оставались на месте. Одновременно РВС Западного фронта ужесточил репрессии, издал приказ о конфискации имущества как у дезертиров, так и их укрывателей [5, с. 104]. Июнь кульминационный в развитии репрессий: караются не только дезертиры, но и те, кто их укрывает. В результате организационно-массовой, политико-воспитательной работы и в основном карательных мер тыл Западного фронта был в значительной мере очищен от дезертиров, бандитов и враждебного элемента [17].

По мнению автора, огульный подход к выселению по национальному признаку, необоснованные конфискации привели к нарушению законности. Это озлобляло людей. Чтобы избежать высылки, многие переходили на нелегальное положение и в конечном итоге составляли основное ядро бандитских формирований, с которыми приходилось впоследствии (вплоть до июля 1922 г.) бороться [3, с. 102]. Положение в Беларуси продолжало оставаться напряженным.

Первоначальная недооценка командованием серьезности предстоящей борьбы с дезертирством и, как следствие, отсутствие выработки соответствующей системы мер впоследствии привели к росту такового. Применение же в основном карательных мер, которые подрывали престиж советской власти, доверие к ней, давало организаторам антисоветских выступлений дополнительные аргументы. Особые отделы в этой борьбе использовались как вспомогательные органы. Когда дезертирство начало перерастать в бандитизм, наносящий непосредственный ущерб армии, командование поменяло тактику борьбы: особые отделы стали привлекаться к разработке чекистско-войсковых операций, для которых потребовалось их основное оружие – негласный аппарат.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Бобылев, П. Н.** На защите Советской республики / П. Н. Бобылев. – Москва : Наука, 1981. – 151 с.

2. **Карасев, А.** Юность чекиста / А. Карасев // Советская Белоруссия. – 1999. – 30 апр.

3. **Майданов, И. И.** Из истории деятельности советской спецслужбы 1921–1929 гг. : на материалах Белорусской ССР / И. И. Майданов. – Москва : МГО–ПУ, 1995. – 130 с.

4. **Национальный** архив Республики Беларусь. – Фонд 200. – Оп. 1. – Д. 58. – Л. 40 об.

5. **Петриков, П. Т.** Ревкомы Белоруссии / П. Т. Петриков. – Минск : Наука и техника, 1975. – 285, [2] с.

6. **Российский** государственный военный архив (РГВА). – Фонд 104. – Оп. 5. – Д. 12. – Л. 141.

7. **РГВА.** – Фонд 104. – Оп. 4. – Д. 18. – Л. 813.

8. **РГВА.** – Фонд 201. – Оп. 1. – Д. 72. – Л. 15 об.

9. **РГВА.** – Фонд 104. – Оп. 5. – Д. 6. – Л. 175.

10. **РГВА.** – Фонд 200. – Оп. 1. – Д. 44. – Л. 49.

11. **РГВА.** – Фонд 104. – Оп. 4. – Д. 2626. – Л. 524.

12. **РГВА.** – Фонд 200. – Оп. 1. – Д. 169. – Л. 31.

13. **РГВА.** – Фонд 200. – Оп. 1. – Д. 169. – Л. 36.

14. **РГВА.** – Л. 33.

15. **РГВА.** – Фонд 200. – Оп. 1. – Д. 169. – Л. 32.

16. **РГВА.** – Фонд 104. – Оп. 4. – Д. 2626. – Л. 524.

17. **РГВА.** – Фонд 201. – Оп. 2. – Ед. хр. 760. – Л. 13.

Арлова А.Г. *(агр. Бачэйкава, Бешанковіцкі раён)*

АДЛЮСТРАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА І КУЛЬТУРНАГА МІНУЛАГА в. БАЧЭЙКАВА Ў МАСТАЦКІМ ФІЛЬМЕ «ДЖЭНТЛЬМЕН І ПЕВЕНЬ» (1928 г.)

Аграгарадок Бачэйкава Бешанковіцкага раёна (раней вёска) знаходзіцца на скрыжаванні шашэйных дарог па абодва бакі р. Ула за 21 км ад г. п. Бешанковічы і за 72 км ад Віцебска. Годам заснавання лічыцца 1460 г., таму што ў Літоўскай метрыцы вёска ўпамінаецца менавіта пад гэтай датай.

Пра далёкае мінулае Бачэйкава і Бачэйкаўскага парку апавядаюць кнігі В.П. Цеханавецкага «Хроника одного поместья. Бочейково» (1905) і Р. Афтаназі «Гісторыя старых рэзідэнцый» (1991). Гэта першакрыніцы нашых ведаў аб тым як жылі, чым займаліся ўладары маёнтка і простыя сяляне. Але мясцовыя жыхары, старажылы вёскі захавалі ў памяці той момант, калі ў Бачэйкаве ў 1928 г. здымаўся мастацкі фільм «Джэнтльмен і певень».

Пра гэты факт мы не знайшлі друкаваных крыніц, нават кінагісторыкі не валодалі такой інфармацыяй. З 65 фільмаў (з іх – 45 нямых), выпушчаных студыяй Белдзяржкіно, «Джэнтльмен і певень» займае восьмы радок у спісе. Доўгія гады мы не маглі паглядзець гэтую стужку поўнасцю, у нашым распараджэнні былі толькі тры першыя часткі з субцітрамі на ўкраінскай мове. Былы Дзяржфільмафонд СССР (зараз Дзяржфільмафонд Расіі) знаходзіцца ў Расійскай Федэрацыі (г. Дамадзедава, Маскоўская вобл.). У Беларусі няма большасці іграваых стужак савецкага перыяду. Супрацоўнікі Дзяржфільмафонду Расіі згадзіліся на платнай аснове адрэстаўрываць і перадаць у Музей гісторыі беларускага кіно частку фільмаў, але сродкаў на набыццё фільмакопій выдзялялася мала. Таму ў 2011 г. Міхаіл Генадзьевіч Высоцкі *(брат аўтара артыкула – склад.)* аказаў Музею гісторыі беларускага кіно спонсарскую дапамогу – за яго грошы была набыта копія фільма «Джэнтльмен і певень». Такім чынам, да гістарычнага матэрыялу пра в. Бачэйкава далучыўся яшчэ адзін фільм.

Старажылы вёскі расказваюць, што летам 1928 г. здымачная група ехала па дарозе з Мінска ў пошуках месца для здымак. З левага боку адкрыўся прыгожы, увесь у кветках луг і цудоўны двухпавярховы палац, які тануў у зелені старасвецкіх дубоў. Адразу было вырашана тут спыніцца. У той час у палацы быў размешчаны дзіцячы дом, вакол якога было шмат будынкаў рознага прызначэння. Кінаэкспедыцыя заставалася тут жыць да канца здымак.

Былы настаўнік Бачэйкаўскай школы Мікалай Іванавіч Талстой успамінае: «У гэтым фільме ў так званых “масоўках” здымаліся мой бацька Талстой Іван Васільевіч, 1911 года нараджэння, і яго малодшы брат Талстой Гурый Васільевіч. Быў наладжаны адбор жадаючых, таму што іх было шмат. Яшчэ трэба было насіць сафіты, якія працавалі ад паравога генератара, трымаць іх у руках у час здымак. За гэта вельмі добра плацілі. За дзень працы бачэйкаўцы атрымлівалі паўрубля. У той час гэта было вельмі многа. У “масоўках” прымалі ўдзел таксама і выхаванцы дзіцячага дома».

Спачатку фільм назвалі «Пеўні пераклікаюцца», але ў канчатковым варыянце ён атрымаў назву «Джэнтльмен і певень». Джэнтльмен – гэта асоба высакароднага паходжання, у пераносным сэнсе – добра выхаваны чалавек. Але ж фільм – сатырычная камедыя, таму аўтары, якія прытрымліваліся жанру, не проста крытыкуюць графа Бадзецкага, а высмейваюць яго, з гратэскам прадстаўляюць як варожы элемент, чужы новаму сацыялістычнаму грамадству. Тэма ідэалагічнага супрацьстаяння была вельмі актуальнай у даваенным кінематографе. Дарэчы, у 1937 г. гэты фільм трапіў у «чорны спіс», таму што галоўным героем быў вораг народа.

Кінастужка пачынаецца цітрам «Устаноўленая Рыжскім мірным дагаворам 1921 г. мяжа паміж панскай Польшчай і Савецкай Беларуссю прайшла праз памесце польскага графа Бадзецкага». На савецкай тэрыторыі засталася лепшая частка памесця з палацам. Там гаспадарыць вясёлы піянерскі атрад.

Пеўні, якія пераклікаюцца па розныя бакі мяжы, напамінаюць графу пра тое, як аднойчы раніцай пад іх крык у яго палац уварваліся сяляне-бунтаўшчыкі. Таму граф Бадзецкі адчувае панічны страх кожны раз, калі чуе «ку-ка-рэ-ку!». Ён страляе па іх, загадвае слугам знішчыць усіх пеўняў. На савецкі бок уцякае карова Манька. За ёй следам ідзе пастух Васіль. Ён застаецца ў БССР, бо тут у яго з'яўляецца магчымасць вучыцца.

На тэрыторыі БССР рыхтуюцца да свята, а на польскім баку адзначаюць імяніны графіні. Васіль перадае запіску сваёй каханай Ядзі, а графу – карыкатуру на яго. Заканчваецца трэцяя частка стралянінай графа па пеўнях.

У тых частках, якія ў нас не захаваліся, расказваецца пра тое, што граф Бадзецкі ўбачыў на служанцы чырвоную хустачку і кінуўся на яе. Ядзя ўцякла цераз мяжу да свайго Васіля. Фільм заканчваецца на аптымістычнай ноце, што характэрна для стужак таго часу.

У.У. Балюзек (1881–1957) быў не толькі рэжысёрам фільма «Джэнтльмен і певень», але і мастаком. Сцэнарыстамі кінастужкі з'яўляюцца І. Далгапольскі і Л. Іерыхонаў, аператарамі – М. Казлоўскі, А. Кальцаты, мастакамі – У. Балюзек і У. Ягораў. Вобраз графа Бадзецкага стварыў акцёр Леў Дабраволькі. Гэта быў пяты фільм з яго ўдзелам. Ядзю сыграла артыстка В.Г. Баранава, акцёр К.А. Гун – ролю вахмістра Янэка і целаахоўніка графа. У кіно ён пачаў здымацца з 1927 г. Працаваў у ленінградскіх тэатрах. Памёр у 1983 г. Пастуха Васю сыграў С.Л. Кузняцоў (1879–1932), які яшчэ ў 1925 г. атрымаў званне заслужанага артыста савецкіх тэатраў рэспублікі, а ў 1929 г. – званне народнага артыста рэспублікі. Свае ролі артысты сыгралі цудоўна. Гэта было нямое кіно, і кінаакцёры выкарыстоўвалі міміку для таго, каб глядач мог зразумець усе пачуцці. Таму артыстаў здымалі буйным планам. Такім чынам, фільм цікавы не толькі тым, што адкрывае новую старонку гісторыі в. Бачэйкава, але і дэманструе асаблівасці кінематографа таго часу.

Здымкі фільма праходзілі на вуліцы і ў самім палацы. У першай частцы кінастужкі можна бачыць сам палац, які з'яўляўся ўзорам прафесіянальнага дойлідства (Дадатак 1, фота 1, 2, 3). Будынак зроблены з улікам тагачасных тэндэнцый у архітэктуры і густу заказчыка. Ён прамавугольнай формы, складаецца з паўпаверха, другога паверха і мансардавага жылога паверха. Гэта заходні паркавы фасад. Да 1908 г. мансардавага паверха не было, што можна вызначыць па здымках ранейшага часу. Для павелічэння жылой плошчы зрабілі мансарды, і былы дах стаў вышэйшым. За кошт схілу рэльефу будынак маштабна павялічыўся і меў манументальны палацавы характар. Фасад упрыгожваў сярэдні паўкруглы крапаваны пілястрамі эркер з трыма арачнымі вокнамі пад сплюшчаным купалам. Да эркера прылягала абшырная паўкруглая тэраса з двухбаковым лесвічным каскадам з балюстраднай агароджай, якая вяла ў парк. Пад тэрасай знаходзіўся ўваход у жылы скляпеністы паўпаверх. Вокны паркавага боку мелі такія ж прамаву-

гольныя праёмы і памеры як і на ўсходнім фасадзе. Частыя шыбы ў вокнах вытрыманы ў стылі XVIII ст. Дах на палацы двухспадовы. Ён упрыгожаны авальнымі люкарнямі (невялікімі аконнымі праёмамі на даху).

Яшчэ ў першай частцы фільма можна бачыць будынак, куды служанка Ядзя нясе ваду. Тут з садовага боку жыла чэлядзь, размяшчаліся гаспадарчыя памяшканні. Гэтыя будынкі да нашага часу не захаваліся.

У другой частцы фільма здымкі адбываюцца на лузе, дзе пасвяцца каровы. У Бачэйкаве яго завуць Карнёвым лугам. З боку лугу, на захад ад палаца, бачны вул. Ульская, р. Ула з яе стромкім берагам, з высокімі старымі дрэвамі. У наш час луг зарос дрэвамі і кустоўем. Калі яго здымалі са статкам кароў, то ў кадр трапіў будынак аранжарэі, у якой раслі пальмы, абрыкосы, кіпарыс, ружы, хрызантэмы (Дадатак 1, фота 4). З 1972 да 1993 г. ён выкарыстоўваўся ў якасці бальніцы, пакуль не пабудавалі новую. Будынак знаходзіўся ў аварыйным стане: лесвіцы, што вялі на другі паверх, згнілі, дах пацёк, таму былую аранжарэю разабралі. Яшчэ ў кінастужцы можна бачыць будынак флігеля, які захаваўся да нашага часу. Трапілі ў кадр і выхаванцы дзіцячага дома, які існаваў тут з 1925 г. (Дадатак 1, фота 5).

У трэцяй частцы фільма мы бачым будынак палаца з боку заезду. Аднак ён выглядае не так, як на фотаздымку з архіва А. Цеханавецкага, бо ў 1908 г. быў убраны шчыпец порціка (на яго месцы зрабілі балкон). Раней па галоўнай восі размяшчаўся невялікі чатырохкалонны порцік. У пакатым трохвугольным франтоне была прарэзана акруглая люкарня. У фільме мы бачым двухпавярховы будынак з драўляным другім паверхам.

Такім чынам, у фільме «Джэнтльмен і певень» можна ўбачыць як выглядаў палац Цеханавецкіх і яго ваколіцы ў 1928 г. А. Мальдзіс у артыкуле «Три вагона ценностей, вывезенных в Москву» пісаў, што сёння «ад сядзібы захаваліся асобныя каменныя будынкі – флігель і домік лоўчага, якія маюць гістарычную і архітэктурную каштоўнасць». Фільм «Джэнтльмен і певень» ажывіў старонкі гісторыі в. Бачэйкава і праілюстраваў творчы патэнцыял беларускіх майстроў. Кадры фільма з яе выявамі далучаюць нас да вечных катэгорый прыгожага, даюць жывое адчуванне гістарычнага развіцця, выхоўваюць і ўзмацняюць павагу да роднага краю.

Вывучаны матэрыял дапоўніў нашы веды з першакрыніц пра далёкае мінулае Бачэйкава. Параўнаўшы кадры з фотаздымкамі з архіва А. Цеханавецкага, мы ўбачылі якія змены зведаў будынак у канцы XIX ст.

Гісторыя стварэння фільма адкрыла новую старонку кінематографа Беларусі – Белдзяржкіно. Пасля таго, як кінастужка была набыта, М.Г. Высоцкі адправіў яго копію графу А. Цеханавецкаму ў Лондан. 16 хвілін фільма размешчаны на сайце «БССР-online».

Гэты фільм адкрывае новую старонку гісторыі і культуры нашай вёскі, спрыяе духоўнаму сталенню асобы і больш глыбокаму ўспрыманню нацыянальных каштоўнасцей.

ЛІТАРАТУРА

1. **Мальдис, А.** Последний из князей Мстиславских и Заславских / А. Мальдис // СБ. Беларусь сегодня. – 2009. – 13 июня. – С. 20.

2. **Цехановецкий, В. П.** Хроника одного поместья. Бочейково / В. П. Цехановецкий. – Витебск : Губерн. Типо-Литография, 1905. – 43 с.

Базарэвіч Г.Х. *(г. Віцебск)*

КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНЫЯ І ЗАБАЎЛЯЛЬНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ВІЦЕБСКА ЯК КРЫНІЦА ДАХОДАЎ ДЛЯ ГАЛАДАЮЧЫХ ПАВОЛЖА Ў 1921–1923 гг.

Голад у Паволжы, які пачаўся ў 1921 г., вымусіў шукаць крыніцы сродкаў для выратавання пацярпелых ва ўвядзенні падаткаў на культурна-адукацыйныя і забаўляльныя мерапрыемствы. Арганізацыяй такіх падзей у Віцебску займаліся не толькі прафесійныя ўстановы, але і самадзейныя калектывы, прыватныя ініцыятывы. Далучаліся да такіх мер і гурты самадзейнасці пры прафесійных саюзах і вайсковых частках, а таксама вучэбныя калектывы. Забаўляльныя мерапрыемствы ў большасці сваёй былі аднатыпныя: спектакль альбо канцэрт, танцы ці латарэя [1, арк. 20].

З пачатку кампаніі па аказанні дапамогі насельніцтву Паволжа, якое галадала, у 1921 г. уводзілася 25% адлічэнне з даходу ад продажу квіткоў на мерапрыемства. З улікам таго факта, што мастацкія ўстановы знаходзіліся ў цяжкай эканамічнай сітуацыі, спагнанне гэтага падатку яшчэ больш ускладняла становішча. Часта праводзіліся спектаклі і канцэрты для паляпшэння стану ўласнага калектыву, але пасля ўвядзення «галодных» падаткаў амаль цалкам былі пазбаўлены такой магчымасці.

Самадзейныя суполкі пры прафесійных калектывах таксама маглі падтрымаць і палепшыць стан сваіх супрацоўнікаў арганізацыяй мерапрыемстваў, адным словам – зарабіць грошы. Але пасля ўвядзення адлічэнняў на карысць галадаючых гэтым планам не наканавана было спраўдзіцца. Напрыклад, пажарная ахова Віцебска ладзіла рэгулярныя катанні на параходзе з духавым аркестрам. Адна з такіх акцый пасля аплаты выдаткаў з выручаных грошай і падатку на дапамогу павалжанам прывяла не да прыбытку, а, наадварот, да дэфіцыту [3, арк. 79]. У такіх выпадках губернская камісія прымала рашэнне аб вызваленні ад падатковых плацяжоў.

Школы, што ладзілі забаўляльныя мерапрыемствы, ад якіх паступалі сродкі, павінны былі здзейсніць унёсак на карысць галадаючых. Але існавала магчымасць гэтага пазбегнуць, для чаго культкамісіі школы звярталіся ў губернскую камісію па аказанні дапамогі галадаючым (губкамдапгал) і ат-

рымлівалі вызваленне ад падатку. Звычайна прычынай для гэтага служыла неабходнасць узмацніць унутраныя сродкі навучальнай установы [2, арк. 2].

Актыўнай арганізацыяй лекцыйна-дыскусійных вечароў займаўся латышскі культурна-асветніцкі клуб [2, арк. 4]. Аналіз каштарысных даных сведчыць аб тым, што памер выдаткаў на арганізацыю мерапрыемстваў і даходаў часта быў калі не аднолькавы, то амаль што роўны. Пры ўстаноўленай фіксаванай стаўцы 30% ад чыстага даходу сумы, што заставаліся ўстанове, былі мізэрныя. Разгледзім канкрэтны прыклад, калі выдаткі на арганізацыю мерапрыемства амаль цалкам адпавядалі прыбытку. Вядомы мастак К. Малевіч ад правядзення ў латышскім клубе адкрытай лекцыі «Новое доказательство в искусстве» (лекцыя была прысвечана развагам мастака аб неабходнасці новаўвядзення ў мастацтве), пасля адлічэння 40% на карысць галадаючых, 15% за арэнду памяшкання і 20% за рэкламу, мусіў атрымаць толькі 25% ад збору [4, арк. 186]. Пасля звароту ў губернскую камісію мастацкага аб'яднання «УНОВИС» («Утвердители нового искусства») памер унёску паменшылі да 15% [4, арк. 187]. У фондах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці захоўваюцца афіша да лекцыі і пісьмовая ўмова яе аўтара – мастака М. Векслера – да К. Малевіча аб памеры аплаты за рэкламу.

Адлічэнні праводзіліся і з даходу ад продажу квіткоў на спектаклі, якія праводзіліся ў клубе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, клубе народнай сувязі, чыгуначным тэатры і інш. Сродкі ўносіліся ў губфінаддзел на бягучы рахунак губкамдапамгала [2, арк. 7]. 15% збор уводзіўся з кінапаказаў, такія ж адлічэнні рабіліся з папулярных баляў-маскарадаў [2, арк. 24]. З красавіка 1922 г. была прынята пастанова, адпаведна якой прыватныя і грамадскія ўстановы, а таксама воінскія часткі павінны былі ўнесці 40% ад збору [3, арк. 67].

Для рэгіянальных устаноў гэта стала вострай праблемай, якая ставіла пад пагрозу існаванне аматарскіх калектываў. Таму ў губернскую камісію пачалі прыходзіць звароты аб памяншэнні ці зняцці падатку [1, арк. 70]. Такое было магчыма толькі пры ўмове, што падчас арганізацыі мерапрыемства не будзе ніякіх выдаткаў, а даход пойдзе на культурна-асветніцкія патрэбы [3, арк. 68].

І зноў жа сума адлічэнняў спаганялася з чыстага даходу. Гэта азначала, што толькі пасля ўсіх выдаткаў: аплаты працы тэхнічнага персаналу, дэкаратараў, музыкантаў, на набыццё пачастункаў, канцылярскіх тавараў, праводзіўся разлік, падчас якога адлічаліся грошы на карысць галадаючых Паволжа. Найбольшы расход сродкаў заўжды быў у самадзейных калектывах. Гэта было абумоўлена адсутнасцю базы (касцюмаў, грыма, дэкарацый) для арганізацыі вечарын, спектакляў, баляў. 12 мая 1922 г. віцебскім аддзяленнем «Культур-Лігі» ў Паказтэатры быў арганізаваны літаратурна-музычны вечар, прысвечаны творчасці пісьменніка Шолам-Алейхема. Валавы збор склаў 25 750 руб., выдаткі – 19 400 руб., астача – 6350 руб. [3, арк. 73].

На просьбу «Культур-Лігі» аб памяншэнні ўнёску з 40% да 10% па той прычыне, што гэта першы вечар установы, якая не мае аніякіх сродкаў, губкамдапамгал адказаў адмоўна.

Спектаклі і канцэрты ставіліся не толькі прафесійнымі калектывамі, але і аматарамі, суполкамі мастацкай самадзейнасці пры прафесійных саюзах і вучэбных калектывах. Такія ініцыятывы ўхваляліся, і вышэйстаячыя ўстановы садзейнічалі вылучэнню памяшкання – часта гэта былі залы тэатраў, клуба імя Хайкіна, польскага і латышскага клубаў. Калі арганізатары мерапрыемства заяўлялі аб тым, што даход пойдзе на падтрымку галадаючых, то вызваляліся ад падаткаў на карысць пацярпелых павалжан [3, арк. 11].

Справаздачныя матэрыялы дазваляюць часткова прасачыць і рэпертуар пастановак. Так, напрыклад, у чыгуначным тэатры ў пачатку 1922 г. ставіліся п'есы «Пецярбургскія трушчобы», «На бойкім месцы», «Двайнік», «Кацюша Маслава», «Невядомая», «Дачка вуліцы», «Дарога ў пекла», «Ноч», «Сцяпны асілак» [2, арк. 48, 49, 50, 106]. Праводзіліся вечары гумару і смеху [2, арк. 51].

Кантроль за выкананнем распараджэння аб адлічэннях праводзіўся штодзённа. Праўленне Саюза работнікаў асветы і мастацтваў абавязана было прадастаўляць штодзённую справаздачу аб колькасці рэалізаваных квіткоў і суме, якая прызначалася для падтрымкі пацярпелых [2, арк. 31].

Спагнанне адлічэнняў не з'яўлялася выключэннем і для калектываў, якія гастраліравалі. З улікам таго, што кошты на прыезджых выканаўцаў былі вышэйшыя, то і даход ад такіх мерапрыемстваў быў большы ў параўнанні з мясцовымі. Некаторыя артысты давалі паказы і канцэрты цалкам бясплатна, тады ўвесь прыбытак ішоў у фонд дапамогі галадаючым. Канешне, прымаючы бок нёс адпаведныя выдаткі – гэта і абслугоўванне памяшканняў, клопат пра артыстаў, садзейнічанне ў бясплатным ці льготным праездзе. Так, напрыклад, вядомая эстрадная расійская і савецкая спявачка Н.В. Дулькевіч 1 мая 1922 г. дала ў Віцебску дабрачынны канцэрт [3, арк. 47]. Такім жа чынам весяліў народ Петраградскі цырк Чынізэлі. Сярод жаданых гасцей быў і У. Маякоўскі. Планавалася арганізаваць літаратурны вечар з яго ўдзелам [5, арк. 1]. Вядома, што Віцебск паэт наведаў толькі ў 1927 г.

Здараліся і досыць кур'ёзныя выпадкі, апісанне якіх можна знайсці ў рапартах асобага кантралёра У. Цінькова. Напрыклад, Мінская яўрэйская трупа, што арганізоўвала ў Віцебску спектакль, быццам бы наўмысна не ўнесла 15% на карысць галадаючых, што складала 113 750 руб. Пра гэта камісія дапамогі галадаючым паведаміла ў Мінск і патрабавала выкарыстаць меры па спагнанні грошай і прыцягненні да адказнасці арганізатараў [2, арк. 44]. Змест рапарта У. Цінькова вылучаецца сваім эмацыянальным стылем: «Приезжая Еврейская труппа авантюристов из гор. Минска уехала в гор. Минск и увезла с собой зарегистрированные билеты не отдавши нам 15%», таксама паведамляецца, што: «…с большим трудом вырвали свои деньги за помещение» [2, арк. 46 зв.].

Не выключаны былі выпадкі спекуляцыі, якой не ўдалося пазбегнуць нават пры строгім кантролі. На мерапрыемствы было дазволена прадаваць толькі зарэгістраваныя квіткі, улік карашкоў дазваляў высветліць памеры збору. Здараліся сітуацыі, калі на мерапрыемствы прадаваліся незарэгістраваныя квіткі, а гэта азначала, што даход, які быў атрыманы, не абкладаўся падаткам і ўвогуле нідзе не фіксаваўся [3, арк. 20].

Вядома, што пры воінскіх частках таксама існавалі вайсковыя камісіі дапамогі галадаючым, якія арганізоўвалі спектаклі і канцэрты. Аднак яны не неслі справаздачы ў губкамдапамгал, аргументавалі гэта тым, што падпарадкаваныя франтавой камісіі дапамогі пацярпелым. Тым не менш, па ацэнцы кіраўніцтва губернскай камісіі, усе мерапрыемствы, што ладзіліся з мэтай дапамагчы павалжанам, рэальнай дапамогі не давалі. Шматлікія праверкі паказалі, што пад дэвізам дапамогі спраўляліся балі, вечарыны і танцы, якія мелі адмоўны ўплыў. Больш за тое, з мэтай утойвання грошай прадаваліся незарэгістраваныя квіткі. Маральны аспект таксама трымалі пад кантролем, рэзка асуджаліся «танцы до потери сознания», якія пад шыльдай аказання дапамогі галадаючым ладзілі ў 44-м стралковым палку [3, арк. 42].

Па гэтай прычыне пленум губкамдапамгала вырашыў абавязаць воінскія камісіі, што займаюцца арганізацыяй падобных мерапрыемстваў, рэгістраваць квіткі і ўносіць 40% ад прыбытку. Аднак камісія па аказанні дапамогі галадаючым пры Заходнім фронце паведаміла, што ўсе паступленні і так накіроўваюцца ў фонд франтавой камісіі [3, арк 58]. Такім чынам, ніякіх іншых адлічэнняў не прадугледжвалася, таму што сродкі і так ішлі на карысць галадаючых. Акрамя гэтага, пры вайсковых фарміраваннях адчыняліся дзіцячыя дамы, у якіх утрымліваліся дзеці Паволжа.

Праз тры гады пасля вынаходніцтва Льва Сяргеевіча Тэрмена па ініцыятыве губернскай камісіі па барацьбе з наступствамі голаду ў Віцебску адбыліся два канцэрты радыё-электра музыкі. Рэалізацыю квіткоў узяла на сябе таксама камісія праз сваю кавярню «Сальвэ» і вінна-гастранамічную краму па Смаленскай вуліцы [5, арк. 15]. Дэманстрацыя дасягненняў навукі ў вобласці мастацтва моцна ўразілі публіку. У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці захоўваецца ліст падзякі, які адрасаваны Л.С. Тэрмену ад Віцгубкампаследгала і касы ўзаемадапамогі студэнтаў-электрыкаў [5, арк. 31].

У Пудацкім клубе фабрыкі імя Вароўскага з глядзельнай залай на 168 месцаў кінасеансы пачаліся з 1 мая 1926 г. паказам фільма «Двухногія шакалы» [8, арк. 68]. У 1926 г. у Пудаці дэманстраваліся фільмы: «Павукі і мухі» (12 чэрвеня), «Вока за вока», «Мінарэт смерці», «Чыгуначны кароль» (ліпень – верасень), «Джэк Бясстрашны» (10 кастрычніка), «Стрэл у лесе» (17 кастрычніка), «Бязрадасная вуліца» (30 кастрычніка), «Ён, яна і Гамлет» (7 лістапада), «1905 год» (14 лістапада), «Чорт у горадзе» (5 і 17 снежня), «З-за ружы» (12 снежня), у 1927 годзе – «Сын правадыра», 1-я серыя (15 студзеня), «Сын правадыра», 2-я серыя (23 студзеня), «Тарко» (30 студзеня), «Дзявяты вал» (6 лютага), «Нашчадак араба» (13 лютага), «У тыле белых» (20 лютага), «Хатка на Байкале» (6 сакавіка), «У чырвоным коле» (19 сакавіка), «Каштанка» (3 красавіка), «Сінабар», у 3 серыях (17 красавіка, 29 мая і 17 чэрвеня), «Знатны замежнік» (21 красавіка), «Касец Пятро» (1 мая), «Пад страхам смерці» (17 чэрвеня) [6, арк. 18, 26 зв., 27–27 зв., 33, 105, 124, 148, 202, 226, 288, 362–362 зв., 363, 364–364 зв., 366, 367 зв., 370; 8, арк. 130, 200].

У Суражскім Народным доме ў 1926–1927 гг. ішлі карціны «Мусульманка», «Святло ў цемры», «Апошні іспыт», «Два прэтэндэнты», «Міс Туці-Фруці», «Дзяўчына з правінцыі», «Яўрэйскае шчасце» [7, арк. 102, 200; 9, арк. 23].

У клубах завода «Ноўка» і фабрыкі імя Вароўскага кіно дэманстравалася адзін раз на тыдзень па нядзелях, у Суражскім Народным доме – 2 разы на тыдзень (па суботах і нядзелях) [7, арк. 104].

Як бачна, асноўная частка фільмаў спачатку была замежнай вытворчасці з прыкметнымі, сенсацыйнымі назвамі. Сярод іх былі і знакамітыя шэдэўры сусветнага кінематографа, такія, як «Бязрадасная вуліца». Аднак ужо з 1927 г. фільмы айчыннай вытворчасці пачынаюць пераважаць. Напрыклад, з 1 чэрвеня па 1 верасня 1927 г. на экранах Віцебскага і Суражскага раёнаў з 10 паказаных фільмаў толькі тры былі замежнымі [9, арк. 23–23 зв.]. З пачатку 1928 г. пачынаецца дэманстраванне першых беларускіх фільмаў – дакументальнага «Беларусь» і гульнявога «Прастытутка» [9, арк. 81, 129].

Глядач, асабліва працоўны, жадаў бачыць на экране самога сябе, сваё жыццё, праблемы, барацьбу за лепшы лад. Напрыклад, добрае ўражанне на гледачоў Пудаці пакінуў савецкі фільм «Напалеон-газ», які прапаноўваўся ўвазе ў ліпені 1926 г. [7, арк. 174]. Пра фільм «Чыгуначны кароль» у верасні 1926 г. фабкам фабрыкі імя Вароўскага адгукаўся як аб поўным глыбокага сэнсу і змястоўнасці. У лісце да Віцебскага Белдзяржкіно падкрэслівалася, што фабрыка жадае і ў далейшым мець такія ж карціны [7, арк. 235]. Згодна з праведзеным у 1926 годзе анкетаваннем, фабрыка імя Вароўскага і завод «Ноўка» аддавалі перавагу рэпертуару фільмаў рэвалюцыйнага зместу, Суражскі Нардом (які абслугоўваў у асноўным сялян з навакольных вёсак) – «змяшанаму» [7, арк. 104]. Кінасеансы часта прымяркоўваліся да рэвалюцыйных свят – 1 мая і 7 лістапада, адпаведным павінен быў быць і рэпертуар [9, арк. 43].

Білет на сеанс у канцы 1920-х гг. каштаваў 15–20 кап., члены прафсаюзаў мелі 50% зніжкі [8, арк. 83–84]. Віцебскае аддзяленне мела з аднаго кінасеанса прыбытак у 10 руб. з фабрыкі ў Пудаці, 12 руб. – з завода «Ноўка», 5–6 руб. – з Суражскага Нардома. Апошняе тлумачылася дрэннымі ўмовамі працы кінаўстаноўкі і немагчымасцю браць за білет звыш за 20 кап. [8, арк. 81–82].

Фільмы дастаўляліся з Віцебска параходам да Суража ці Курына [7, арк. 104], адтуль на гужавым транспарце – да Ноўкі і Пудаці. Гэта выклікала шмат нараканняў, асабліва па тэрмінах дастаўкі. Практыкавалася і высылка па пошце, але карціны прыходзілі ў хаатычным стане [7, арк. 201].

Якасць дэманстравання кінафільмаў у Віцебскім і Суражскім раёнах у 1920-я гг. была вельмі дрэннай. З боку Віцебскага Белдзяржкіно частымі былі скаргі на псаванне стужкі – збіванне перфарацыі, дрэнную намотку, разрывы стужкі, забруджанне алеем і г. д. Гэта было вынікам нездавальняючай работы кінаапаратаў, а таксама нявопытнасці кінамеханікаў, некаторыя з якіх увогуле былі незнаёмыя з прынцыпамі работы кінаапаратуры. Стужкі

страчвалі да 50% якасці, што ацэньвалася ў 1000 руб. [9, арк. 122]. Падобныя выдаткі прымушалі Віцебскае Белдзяржкіно некалькі разоў спыняць высылку фільмаў у Пудаць і Ноўку, больш за тое – звяртацца ў грамадзянскія суды [7, арк. 70]. Згодна з рэзалюцыяй Віцебскага Белдзяржкіно ад 20 жніўня 1927 г., водпуск карцін мог быць ажыццёўлены толькі пры ўмовах работы кваліфікаванага механіка, які мусіў прайсці эксперную камісію Белдзяржкіно ў Віцебску [8, арк. 122]. Але гэта амаль не змяніла сітуацыі.

Другой падставай для скарг гледачоў была адсутнасць раскладаў пастаноўкі карцін, высылка фільмаў у самы апошні момант і адной і той жа карціны па некалькі разоў [16].

У пачатку 1930-х гг. назіраецца рост колькасці кінаўстановак на тэрыторыі Віцебскага і Суражскага раёнаў. Так, на 1 красавіка 1932 г. меліся кіназалы пры Янавіцкім Нардоме (150 месцаў), прыстані воднікаў у Суражы (150 месцаў), кардоннай фабрыцы імя Вароўскага ў Пудаці (130 месцаў), шклозаводзе «Ноўка» (216 месцаў), Лужаснянскім ільнаводчым тэхнікуме, літоўскай школе ў Дыманове, школе імя Калініна ў Сялютах [14, арк. 29–32].

У сярэдзіне 1930-х гг. у кіно Віцебскага і Суражскага раёнаў прыйшоў гук. 1 мая 1935 г. быў адкрыты гукавы кіназал пры Народным доме ў Суражы. На яго абсталяванне было выдаткавана 14 тыс. руб. [18]. У 1938 г. гукавое кіно было наладжана пры Доме чырвоных партызан у в. Сялюты [11].

Аднак і нямы кінематограф не здаваў сваіх пазіцый. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны гукафікацыя кінастацыянараў і кінаперасовак у Віцебскім раёне не была завершана. Гэтаму перашкаджала, акрамя іншага, і адсутнасць у многіх населеных пунктах электрычнасці. Нават у адным з апошніх перадваенных нумароў (ад 21 чэрвеня 1941 г.) газета «Віцебскі рабочы» паведамляла аб наборы на месячныя курсы механікаў негукавых кінаперасовак, заняткі на якіх павінны былі пачацца 1 ліпеня 1941 г. [4].

У канцы 1930-х гг. кінематограф трывала ўвайшоў у побыт жыхароў Віцебшчыны і Суражчыны. Уводзіліся новыя формы працы, такія, як арганізацыя раённых кінафестываляў. Першы такі фестываль адбыўся ў чэрвені – ліпені 1939 г. як водгук на зварот сельскай інтэлігенцыі і калгаснага актыва Дукорскага сельсавета Рудзенскага раёна Мінскай вобласці. У 10 раёнах Віцебскай вобласці (у тым ліку і ў Суражскім – у Янавічах) было праведзена 19 сеансаў, больш за 3500 чалавек прагледзелі карціны «Ленін у Кастрычніку», «Ленін у 1918 годзе», «Вялікае зарава», «Прафесар Мамлок», «Балотныя салдаты», «Вялікі грамадзянін», трылогію аб Максіме [3]. Кінасправа вылучала і сваіх ударнікаў. Так, кінамеханік гукавой перасоўкі Віцебскага раёна С.П. Лінкевіч правёў у маі 1939 г. 48 сеансаў замест запланаванага 21, абслужыў больш за 5,5 тыс. калгаснікаў. Заробак кінамеханіка-ўдарніка склаў 800 руб. Усесаюзны камітэт па справах кінематаграфіі ўзнагародзіў Лінкевіча знакам «Ганароваму кінематаграфісту» [12].

Меліся, аднак, і шматлікія недахопы ў кінафікацыі. Аб непісьменных шыльдах з анонсамі фільмаў, безбілетніках-«зайцах», п'янстве кінамеханікаў і кантралёраў, сапсаваўшых дэманстрацыю фільма ў Суражы, пісалі ў жніўні 1936 г. карэспандэнты газеты «Ударнік» Васіль Нёман і Эль Кудравы [15]. Рабочы Янавіцкай пякарні М.Н. Сетаў скардзіўся падчас раённага кінафестывалю 1939 г. на тое, што працоўныя Янавіч не бачылі такіх фільмаў, як «Выбаргскі край», «Ленін у Кастрычніку», «Аляксандр Неўскі» [1].

У 1939 г. у Віцебскім раёне мелася восем кінаўстановак пры клубах [13, с. 56]. У 1940 г. іх было ўжо 14 (13 стацыянарных і 1 перасоўка), у тым ліку – тры нямыя [2, с. 248]. У Суражскім раёне ў той жа час меліся тры стацыянарныя ўстаноўкі (усе гукавыя) [13, с. 64]. Але гэтыя лічбы нельга лічыць дакладнымі. У «Пашпарце Віцебскага сельскага раёна Віцебскай вобласці» ўказаны толькі чатыры кінаўстаноўкі – Сасноўская, Сялюцкая, Старасельская, Бараўлянская [5, арк. 167]. Гэта дазваляе меркаваць, што некаторыя кінаўстаноўкі існавалі толькі на паперы.

Такім чынам, у 1920–30-я гг. былі зроблены першыя крокі кінафікацыі Віцебшчыны. Хоць і не без цяжкасцей, кінематограф знаходзіў у той складаны час шляхі да душ і сэрцаў простых людзей.

ЛІТАРАТУРА

1. **Алан, В.** Магутны сродак коммуністычнага выхавання / В. Алан // Віцебскі рабочы. – 1939. – 10 чэрв. – С. 3.

2. **Витебская** область : экономико-статистический справочник. – Витебск, 1940. – 264 с.

3. **Віктараў, Г.** Абласны кіно-фестываль / Г. Віктараў // Віцебскі рабочы. – 1939. – 17 ліп. – С. 2.

4. **Віцебскі** рабочы. – 1941. – 21 чэрв. – С. 4.

5. **Дапамога** пенсіянерам // Віцебскі рабочы. – 1938. – 17 ліп. – С. 1.

6. **Дасягненні** кіномеханікаў // Віцебскі рабочы. – 1939. – 6 лют. – С. 4.

7. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 1-п. – Воп. 1. – Спр. 266.

8. **ДАВВ.** – Фонд 366. – Воп. 1. – Спр. 2.

9. **ДАВВ.** – Фонд 366. – Воп. 1. – Спр. 3.

10. **ДАВВ.** – Фонд 366. – Воп. 1. – Спр. 4.

11. **ДАВВ.** – Фонд 366. – Воп. 1. – Спр. 11.

12. **ДАВВ.** – Фонд 1319. – Воп. 1. – Спр. 1.

13. **Культурное** строительство БССР / Упр. народохозяйственного учета Белорусской ССР. – Минск : Изд. УНХУ БССР, 1940. – 112 с.

14. **Национальный** архив Республики Беларусь. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 436.

15. **Нёман, В.** Чаму ў Суражы сумна / В. Нёман, Э. Кудравы // Ударнік (Суражскі раён). – 1936. – 4 жн. – С. 2.

16. **Па некалькі** раз прысылаюць адну кіналенту // Віцебскі пралетарый. – 1930. – 30 верас. – С. 4.

17. **Собрание** узаконений и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства БССР № 7. Отдел первый. – 1925. – 3 марта.

18. **У Суражы** будзе гукавое кіно // Ударнік (Суражскі раён). – 1935. – 16 крас. – С. 1.

Марціновіч С.В., Ліпава Г.В. *(агр. Акцябрская, Віцебскі раён)*

З ГІСТОРЫІ КАЛГАСА ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА І в. АГАРОДНІКІ ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

Вёска Агароднікі зараз – невялікі населены пункт у складзе Тулаўскага сельсавета Віцебскага раёна. Гарадская мяжа Віцебска амаль ушчыльную падыйшла да вёскі. Сёння ўсе навакольныя землі належаць камунальнаму ўнітарнаму сельскагаспадарчаму прадпрыемству (КУСГП) «Эксперыментальная база “Тулава”» [12, с. 726], а перад Вялікай Айчыннай вайной тут меўся асобны калгас імя Станіслава Ланцуцкага – адна з перадавых гаспадарак раёна на той час [8, арк. 52].

Упершыню Агароднікі згадваюцца ў дакументах пад 1628 г. У Літоўскім межавым дакуменце пры акрэсленні межаў маёнтка Тулава населены пункт быў згаданы як уласнасць зямяніна Восіпа Васілевіча [12, с. 726]. За некалькі стагоддзяў аб маленькай вёсцы амаль не захавалася звестак. Да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі сяляне, яе жыхары, працавалі на памешчыкаў Енькаў, Прэйсаў, Старажылеўскіх, Стружымецкіх, Стрылецкіх, Фруцкіх, Саенкаў. У 1917 г. згодна з ленінскім «Дэкрэтам аб зямлі», сяляне-працаўнікі атрымалі зямлю ва ўласнае карыстанне. Але зямлі – галоўнага сродку вытворчасці для селяніна – на ўсіх не хапала. Гэта выклікала жудасныя трагедыі. У 1927 г. селянін вёскі Кацярыніна (каля Агароднікаў) Іван Іваноў зарэзаў касой роднага брата Андрэя – не падзялілі бацькоўскую зямлю [13].

17 снежня 1929 г. у Агародніках была створана калектыўная гаспадарка – першая ў Рудніцкім сельсавеце [11]. У наступным 1930 г. калгасу было нададзена імя польскага рэвалюцыянера Станіслава Ланцуцкага [1].

Сённяшняму пакаленню амаль невядома гэта імя, але ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. польскі рэвалюцыянер Станіслаў Ланцуцкі быў добра вядомы ў працоўных масах Савецкага Саюза. Яго называлі «адным з устойлівых змагароў польскага пралетарыята» [10, с. 5]. Таму трэба сказаць некалькі слоў пра гістарычную асобу, імя якой насіў калгас у Віцебскім раёне.

Станіслаў Ланцуцкі нарадзіўся ў 1882 г. у Польшчы ў працоўнай сям’і. Працаваў на чыгунцы і прадпрыемствах Перамышля, Кракава, у Вітковіцах. Прымаў удзел у рэвалюцыйным руху, быў членам сацыял-дэмакратычнай, потым камуністычнай партыі Польшчы. У 1922 г. Станістава Ланцуцкага абралі ў польскі сейм ад Саюза пралетарыяту горада і вёскі. Але ўжо ў 1924 г. Ланцуцкага пазбавілі дэпутацкай недатыкальнасці і ў хуткім часе арыштавалі. Падставай для арышту была прамова Ланцуцкага ад 19 ліпеня 1924 г., якая быццам бы насіла супрацьдзяржаўны характар [10, с. 92]. Рэвалюцыянера трымалі ў турмах Мокатава, Перамышля і іншых, нават нягледзячы на апраўдальны прысуд. Да трох гадоў турмы Ланцуцкаму дадалі яшчэ тры гады катаргі. І толькі дзякуючы амністыі 1928 г. ён быў выпушчаны на волю, а ў 1929 г. пераехаў у СССР.

Станіслаў Ланцуцкі напісаў некалькі кніг успамінаў, выдадзеных на рускай мове – «З турэмнага дзённіка», «Аповесць аб турэмных днях» (1930), «Успаміны» (1931). Таксама ЦК Міжнароднай арганізацыі дапамогі змагарам рэвалюцыі выдаваў інфармацыйныя бюлетэні, прысвечаныя Ланцуцкаму. Польскі рэвалюцыянер жыў і працаваў у Маскве, з'яўляўся персанальным пенсіянерам, быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

14 ліпеня 1937 г. Станіслаў Ланцуцкі быў беспадстаўна арыштаваны органамі Народнага камісарыяту ўнутраных спраў (НКУС) за ўдзел у «польскай тэрарыстычнай арганізацыі» і 20 верасня 1937 г. расстраляны. Пасля гэтага імя Ланцуцкага было выкрэслена з гісторыі, нягледзячы на тое, што 29 красавіка 1955 г. яго рэабілітавалі «за адсутнасцю складу злачынства» [9].

Верагодна, імя Ланцуцкага было дадзена калгасу ў Рудніцкім сельсавеце Віцебскага раёна таму, што ў Агародніках і навакольных вёсках жыло шмат палякаў.

Як ужо было адзначана, 17 снежня 1929 г. у былым маёнтку пана Прэйса ў Агародніках група актывістаў – батракоў і беднякоў – стварыла калгас. Спачатку ён аб'ядноўваў усяго 11 гаспадарак [11]. Першымі калгаснікамі былі Закржэўскі Іван Станіслававіч, Міхееў Макар Усцінавіч, Арлоў В., Пржэвальскі Станіслаў, Бейнаровіч С., Хаванскі, Сцяпанаў, Цвяткоў Васіль (старэйшы працаўнік калгаса, якому было 72 гады) [2].

У першыя гады існавання калгаса імя Ланцуцкага жыццё яго працаўнікоў было вельмі цяжкім. У 1929–1930 гг. у калгасе было 11 гаспадарак, 60 га ворнай зямлі, 52 га сенажацей, 27 коней, 8 кароў. Са складаных машын была толькі адна жняярка і адна касілка. Дзяржаве ў той час калгас здаваў па загатоўках хлеба 20 ц зерневых. Хлеб размяркоўваўся паміж калгаснікамі на едака, штомесячна па 36 фунтаў на душу (каля 14,4 кг). Улік працы быў вельмі заблытаны. Тры калгасныя гаспадаркі не мелі ўласных кароў [11]. У першы год было абагульнена ўсё, нават птушка. Прыбавілася маёмасць, канфіскаваная ў высланых кулакоў. Наспех скалачвалі ў хлявах, пунях парканы для абагульнення жывёлы. Дысцыпліна была расхістана [1].

Па акрузе распаўсюджваліся чуткі аб тым, што калгасы ў хуткім часе разваляцца. Жанчын пужалі «100-мятровымі коўдрамі» і «абагульненнем жонак». Некаторыя з калгасніц патрабавалі ад мужоў выхаду з калгаса, пагражаючы разводам. Мужчын таксама запалохвалі хуткай вайной і прыходам з Польшчы «пілсудчыкаў». Старшыні калгаса і актывістам пагражалі забойствамі. Асабліва шмат гаспадарак пакінула калгас пасля артыкула Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў» у сакавіку 1930 г. [1].

Але ў наступным 1931 г. у калгас імя Ланцуцкага ўвайшлі 37 гаспадарак беднякоў і сярэднякоў. На 100 га пашырылася пасяўная плошча, на 98 га – сенажаці. Колькасць коней дасягнула 49, рагатай жывёлы – 60 галоў. Калгас закупіў адну жняярку і адну касілку, былі пабудаваны два амбары для захоўвання збожжа. Дзяржаве былі здадзены 110 ц зерневых і 2 т бульбы.

Было ліквідавана размеркаванне хлеба «па едаках», уведзены працадні, на якіх калгаснікі атрымлівалі па 1500 г зерневых [11].

У 1932 г. калгас узрос яшчэ на 30 гаспадарак (усяго 75 двароў, 338 жыхароў), было далучана 140 га ворыўнай зямлі, 50 га сенажацей, на 11 галоў павялічылася колькасць працоўнай жывёлы, на 48 галоў – рагатай. Былі закуплены 2 новыя жняяркі, 1 малатарня, пабудавана 12 сховішчаў для агародніны, 2 авіны. Адным з першых калгас імя Ланцуцкага правёў электрычнасць. Была пабудавана трансфарматарная будка, электрыфікавана праўленне, 2 гаспадаркі (у тым ліку – лепшага ўдарніка Сцяпанава Сяргея Іванавіча), скотнікі, стайні, амбары, арганізавана электрамалацьба. Па загатоўках калгас здаў дзяржаве 200 ц зерня, што лічылася вялікай лічбай. На працадзень калгаснік атрымліваў 1,5 кг зерневых, 2,8 кг бульбы, 0,5 кг агародніны, 65 кап. грошай. Але і ў гэты час пяць гаспадарак заставаліся бескароўнымі [11].

У 1932 г. адбылася важная падзея ў жыцці калгаса – адчыніла свае дзверы Рудніцкая школа-сямігодка. Для яе быў вылучаны былы кулацкі дом, а потым – яшчэ тры будынкі. У школе вучыліся 220 дзяцей, з іх 150 – дзеці працаўнікоў калгаса імя Ланцуцкага. Школа была электрыфікавана, пры ёй былі абсталяваны сталярная і слясарная майстэрні [4].

У 1933 г. у калгас імя Ланцуцкага ўваходзілі ўжо 88 сялянскіх гаспадарак, мелася 400 га ворыўнай зямлі, 230 га сенажаці, 70 коней, 145 галоў рагатай жывёлы. Былі закуплены 3 сенакасілкі, 2 сартыроўкі, 14 камплектаў баронаў «зігзаг», 5 парных плугоў, 5 акучнікаў. Пабудаваны скотнік на 100 галоў, 6 калгасных гаспадарак было надзелена цялятамі. На працадзень калгасніку выдавалася 1,8 кг зерневых, 2,7 кг бульбы, 0,5 кг агародніны, 20 кап. грошай [11].

У 1934 г. калгас імя Ланцуцкага сабраў добры ўраджай, таму на працадзень калгаснікі атрымалі ўжо па 2,7 кг зерневых, 5 кг бульбы, 0,6 кг агародніны, 20 кап. грошай. У калгас уступіла 11 аднаасобных гаспадарак, пасяўная плошча павялічалася на 40 га, сенажаць – на 60 га, пагалоўе працоўнай жывёлы – на 18 галоў, рагатай – на 35 галоў. Калгас закупіў 3 новыя жняяркі, пабудаваў новую стайню, электрыфікаваў 10 гаспадарак, скотнік, амбары, стварыў 2 малацільныя пункты, хату-лабараторыю, бібліятэку, гурткі на ліквідацыі непісьменнасці і вывучэнні агратэхнікі. Дзве калгасныя гаспадаркі атрымалі цялят [11].

У 1935 г. у калгасе імя Ланцуцкага жылі 115 сямей, мелася 500 га ворыўнай зямлі, 300 га сенажаці, 80 га канюшыны, 89 галоў працоўнай жывёлы, 219 галоў рагатай жывёлы. Калгаснікі пабудавалі амбар на 100 тон збожжа, стайню на 30 галоў, цялятнік на 80 галоў. Было закуплена 2 трыеры. Калгасны працадзень каштаваў 2,75 кг зерневых, 6,4 кг бульбы, 0,5 кг агародніны, 35 кап. грошай. У калгасе мелася свая насценгазета «За тэмпы» [11].

Такім чынам, у сярэдзіне 1930-х гг. калгас імя Ланцуцкага Рудніцкага сельсавета лічыўся адной з самых заможных і культурных гаспадарак

Віцебскага раёна. Старшынёй калгаса з 1932 г. быў Іван Станіслававіч Закржэўскі, член Камуністычнай партыі з 1932 г. Лепшымі працаўнікамі лічыліся Фёдар Усцінавіч Рыжыкаў (брыгадзір 4-й паляводчай брыгады), Сямён Васільевіч Цвяткоў (брыгадзір 3-й паляводчай брыгады), машыністы Г. Вінаградаў, Г. Леўшын, С. Дубянкоў, Б. Пазнякоў, Д. Дабравольскі, А. Старыковіч, І. Рыжыкаў, У. Пазнякоў, І. Старыковіч, І. Еленскі, скотніца Фруза Максімава і іншыя [13].

18 верасня 1935 г. калгас імя Ланцуцкага, першы ў Віцебскім раёне, атрымаў Дзяржаўны акт на вечнае карыстанне зямлёй. З гэтай нагоды адбылося агульнакалгаснае свята. На ім прысутнічалі таксама калгаснікі з Міхалёўскага, Шумнянскага, Заронаўскага і Сялюцкага сельсаветаў, працоўныя фабрыкі «Сцяг Індустрыялізацыі» (арганізавалі святочны канцэрт), завода «Чырвоны металіст». Нават Віцебскі аэраклуб паслаў свой самалёт. На свяце прысутнічаў Нарком земляробства БССР Бенек, сакратар Віцебскага гаркама КП(б)Б Жураўлёў. Акт на вечнае карыстанне зямлёй быў уручаны калгасу старшынёй Віцебскага гарсавета Аверыным [3].

У 1937 г., пасля расстрэлу Станіслава Ланцуцкага, калгас яго імя быў перайменаваны. На карце Віцебскага раёна 1939 г. гаспадарка пазначана як калгас імя Леніна [5, арк. 2]. У тым жа 1939 г. у вёску Агароднікі было сселена насельніцтва вёсак Волкава, Храноўшчына, Асінаўка-2, Кацярыніна (да гэтага, у 1936 г. – Скуратава, Асінаўка-1, Заходнікі, Жабчына). На пачатку 1941 г. у Агародніках мелася 93 двары, пражывала 398 чалавек [12, с. 726].

У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі ў Агародніках усе 93 двары і забілі 14 мірных жыхароў. У Германію на катаржныя работы было вывезена 38 чалавек, вярнулася назад 28. На фронце загінула 20 вяскоўцаў, у партызанах – 7 [12, с. 726].

Пасля вайны былы калгас у Агародніках адрадзіўся пад назвай «калгас імя Леніна». У сакавіку 1950 г. калгасы імя Леніна і імя Мархлеўскага былі аб'яднаны ў адну гаспадарку – калгас імя Леніна з цэнтрам у вёсцы Агароднікі [7, арк. 12]. Новы калгас знаходзіўся ў вельмі складаным фінансавым становішчы, не мог выплаціць кошт набытай тэхнікі [6, арк. 8].

4 сакавіка 1959 г. агульны сход калгаснікаў гаспадарак «Уперад да камунізму», «Віцебскі» Акцябрскага сельсавета, імя Дзяржынскага і імя Леніна Варонаўскага сельсавета прынялі рашэнне аб аб'яднанні ў адзіны саўгас «Сялюты». 6 сакавіка 1959 г. Рашеннем № 58 Віцебскага райвыканкама калгас імя Леніна Варонаўскага сельсавета быў ліквідаваны. Яго землі і маёмасць увайшлі ў новы саўгас «Сялюты» [6, арк. 14–15]. Зараз в. Агароднікі адносіцца да КУСГП «Эксперыментальная база "Тулава"».

Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей працягвае збор матэрыялаў па гісторыі калгасаў Віцебскага раёна, у тым ліку калгаса імя Ланцуцкага, у мэтах дапаўнення музейнай экспазіцыі «Чалавек слаўны працай».

ЛІТАРАТУРА

1. **Азаронак.** Нараджэнне калгаса / Азаронак // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 20 верас. – С. 2.

2. **Аллан, Д.** Жыццё Васіля Цвяткова / Д. Аллан // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 18 верас. – С. 2.

3. **Аллан, Д.** Вялікае калгаснае свята / Д. Аллан, А. Сіпко // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 20 верас. – С. 1.

4. **Брыскін, А.** Бацькі і дзеці / А. Брыскін // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 18 верас. – С. 3.

5. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 1-п. – Воп. 1. – Спр. 16.

6. **ДАВВ.** – Фонд 571. – Воп. 2. – Спр. 429.

7. **ДАВВ.** – Фонд 1967. – Воп. 1. – Спр. 116.

8. **ДАВВ.** – Фонд 10058-п. – Воп. 1. – Спр. 322.

9. **Ланцуцкий, С.** Повесть о тюремных днях (из дневника) / С. Ланцуцкий. – Москва : ЦК МОПР СССР, 1930. – 96 с.

10. **Ланцуцкий Станислав Францевич** // Память о бесправии. Мартиролог расстрелянных в Москве и Московской области [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.sakharov-center.ru/asfcd/martirolog/?t=page&id=10226. – Дата доступа: 23.09.2016.

11. **Лічбы** перамог // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 18 верас. – С. 2.

12. **Памяць** : Віцебскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У. І. Мезенцаў ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 772 с. : іл.

13. **Сіпко, А.** Рост / А. Сіпко // Віцебскі пралетарый. – 1935. – 18 верас. – С. 2.

Махиня О.В. *(г. Витебск)*

КРАЕВЕДЕНИЕ КАК СРЕДСТВО ПАТРИОТИЧЕСКОГО ВОСПИТАНИЯ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ

В Послании Президента белорусскому народу и Национальному собранию отмечается, что «движущей силой прогресса являются не материальные блага, а патриотизм».

Патриотическое воспитание – одна из главных задач, конечная цель которой – формирование личности гражданина, патриота, труженика, семьянина.

Патриотическое воспитание – это систематическая и целенаправленная деятельность учреждений образования и общественных организаций по формированию у молодежи высокого патриотического сознания, чувства верности своему Отечеству, готовности к выполнению гражданского долга и конституционных обязанностей по защите интересов Родины.

Патриотическое воспитание должно проявляться не в словах и лозунгах, а в жизненной позиции молодого человека и реализовываться в единстве учебного и воспитательного процесса.

В системе образования воспитанию патриотизма всегда уделялось значительное внимание. Развитие общества, изменения в духовной, политической сферах приводят к трансформации понимания патриотизма, требуют поиска новых форм и средств патриотического воспитания, одним из которых является краеведение. Исследователи отмечают педагогические возможности средств краеведения в процессе формирования патриотизма [4].

Краеведение способно формировать культуру межнациональных отношений, воспитывать терпимость и уважение к истории, традициям, обрядам, культуре, языку наций и народностей [1, с. 35].

Историческое краеведение решает и актуальную во все времена задачу сохранения культурного и духовного наследия родного края, учит не только любить свои родные места, но и знать их, приучает интересоваться историей, искусством, литературой, повышать свой культурный уровень. Любовь к родному краю, знание его истории – основа, на которой может осуществляться процесс воспитания патриотизма учащихся.

В связи с этим возрастает роль краеведения, призванного воспитать в человеке чувства гражданственности, национального самосознания, собственного достоинства, положительных качеств личности. Краеведческая работа – это знания о своем народе, об особенностях быта и трудовой деятельности, национальном характере, психологии, мировоззрении, культуре, а также о семье, своей родословной, о родном крае и всем, что связано с ним. Краеведческая работа способствует развитию интереса к своему краю, малой родине, расширяет объем знаний по смежным областям, повышает мотивацию учения [3].

Краеведческая работа является составляющей учебно-воспитательного процесса в вузе. На базе исторического факультета Витебского государственного университета имени П.М. Машерова на протяжении 10 лет работают клубы, которые занимаются гражданско-патриотическим воспитанием: краеведческую и поисковую деятельность ведет клуб «Краевед»; экскурсионно-туристическую, направленную на воспитание потребности в изучении истории родного края, отечественной и мировой культуры, разработку новых туристических маршрутов – клуб «Наследие»; привитием общечеловеческих ценностей и потребности в нравственном самоусовершенствовании – волонтерский клуб «Истоки милосердия». Содержание работы клуба «Краевед» включает историко-краеведческие исследования, туристско-экскурсионные, популяризаторские. Основными видами деятельности участников клуба являются научно-исследовательская работа студентов в области краеведения; выступления с докладами на заседаниях клуба и научных конференциях и семинарах; публикации итогов иссле-

дований в научных сборниках; участие в мероприятиях в области охраны историко-культурного наследия; организация экскурсий и походов по историческим местам Витебщины и Беларуси; проведение встреч с ведущими краеведами и исследователями; популяризация историко-культурного наследия Витебщины в СМИ.

В год 70-летия Победы советского народа в Великой Отечественной войне студенты клуба «Краевед» совместно с Витебским областным музеем имени Героя Советского Союза М.Ф. Шмырёва приняли участие в реализации социального проекта «Мы не забудем ваши имена», сущность которого заключалась в поисковой работе. Работа по составлению данных о воинах, погибших на территории Витебской области, ведется клубом с сентября 2013 г. За период с 2013 по сентябрь 2014 г. студенты исторического факультета отработали более 5 тыс. фамилий погибших воинов по городу Витебску и Витебской области. Члены клубов «Краевед», «Наследие» и «Истоки милосердия» приняли участие в международном проекте «Социальное партнерство в интересах бывших узников – пострадавших от национал-фашизма», целью которого было организовать работу с бывшими узниками фашизма по решению проблем одиночества путем расширения круга общения с молодежью и налаживание диалога между поколениями; привлечь внимание к социальному положению пожилых людей; создать электронный сборник воспоминаний жертв национал-фашизма. Результатом этого проекта стал электронный сборник воспоминаний узников, который содержит 60 статей, собранных студентами исторического факультета.

Клуб «Краевед» принимает участие в подготовке и проведении совместных мероприятий с Витебским областным музеем Героя Советского Союза М.Ф. Шмырёва. Члены клуба проводят историко-познавательную игру для студентов и школьников «Страницы военной истории», а также принимают участие в музейных акциях «Ночь в музее», «Партизанская елка», «Партизанская свадьба», «Партизанский костер».

Работа клуба «Наследие» осуществляется в трех направлениях: «Культура и искусство» – дает возможность познавать культурные традиции нашей республики и мировые тенденции; «Театральная гостиная» – помогает ориентироваться в культурной жизни города, синтезирует различные формы профессиональных знаний и интеллектуального отдыха; «Витебщина туристическая» – занимается созданием мультимедийных проектов, популяризирующих памятники историко-культурного наследия нашей области.

Целями и задачами клуба являются воспитание и развитие всесторонне-развитой личности студента, его приобщение к мировой и национальной культуре; создание в рамках получения гуманитарных знаний возможности для проявления практико-творческих способностей; общение с деятелями культуры нашего региона; повышение уровня собственных профессиональных знаний.

Деятельность клуба включает посещение культурно-познавательных мероприятий города Витебска и области; участие в культурно-общественной жизни университета и города; создание туристических, культурно-просветительских проектов (видео-ролики, презентации, стенгазеты); участие в научно-исследовательской деятельности (конференции, публикации, конкурсы); организация встреч с творческими личностями города и области; популяризация культурно-искусствоведческих знаний; осуществление экскурсионно-познавательных поездок по достопримечательностям Беларуси и за ее пределами.

Студенческий клуб «Контраверза» является дискуссионным клубом, в котором обсуждаются проблемы глобализирующегося мира и самоопределения нации; исторической памяти и интерпретации исторического прошлого; роли вуза в гражданско-патриотическом и нравственном становлении студентов; проблемы смысла жизни в философии.

Исследования авторов, занимающихся разработкой критериев готовности студентов к патриотическому воспитанию средствами краеведения [4] позволяет констатировать, что участники клубов «Краевед» и «Наследие» имеют эвристический уровень готовности, характеризующийся развитым чувством патриотизма, осознанием необходимости осуществления патриотического воспитания в будущей профессиональной деятельности подрастающего поколения, предполагают личную ответственность за развитие подрастающего поколения и будущее страны. Студенты с эвристическим уровнем готовности положительно относятся к педагогической деятельности по патриотическому воспитанию своих будущих учеников и мотивированы привлекать краеведение для будущей работы в школе. Система знаний о родном крае является достаточно полной и глубокой, охватывает разные разделы краеведения, что позволит в будущей профессиональной деятельности успешно осуществлять патриотическое воспитание учащихся средствами краеведческой работы. Развитая в процессе клубной деятельности гражданская позиция позволит осуществлять защиту собственных интересов и интересов государства, придавать поведению патриотическую направленность, участвовать в общественно-значимых мероприятиях, патриотических акциях. Стремление к самообразованию и саморазвитию у данных студентов позволяет более тщательно осуществлять подбор краеведческого материала, имеющего патриотическое содержание, продумывать способы его применения в воспитании будущих граждан, самостоятельно готовить и проводить воспитательные мероприятия [4].

Результатом участия студентов в работе клубов является формирование национального самосознания; уважение к родному языку, культуре и истории Беларуси; готовность к участию в созидательной деятельности на благо своей родины; расширение социально-культурного кругозора, особенно в понимании глобальных исторических и интеграционных процессов нашего

общества; проявление активности и инициативы в учебной и общественной деятельности, что позволило повысить качество успеваемости по истории и сформировать устойчивый интерес к гражданско-патриотической деятельности; осознание смысла того, что значит быть гражданином, иметь гражданскую позицию.

Опыт работы клубов «Краевед» и «Наследие» еще раз подтвердил потенциальные возможности туристско-краеведческой деятельности для всестороннего гармоничного развития студентов и их гражданско-патриотического становления.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Деев, А. Л.** Краеведение как средство формирования гражданственности школьников / А. Л. Деев // Фундаментальные исследования. – 2005. – № 4. – С. 35.

2. **Программа** непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь на 2016–2020 гг. : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 22 февр. 2016 г., № 9 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2016.

3. **Состояние**, проблемы и перспективы детско-юношеского и социального туризма : материалы Междунар. науч.-практ. конф. «Роль и задачи массового туристско-краеведческого движения в воспитании и оздоровлении населения», 1 дек. 2013 г. / сост. И. А. Дрогов, Ю. С. Константинов, Д. В. Смирнов. – Москва : МосгорСЮТур, 2013. – 306 с.

4. **Шабалина, О. Л.** Формирование готовности выпускников педагогических специальностей к патриотическому воспитанию учащихся средствами краеведения / О. Л. Шабалина, А. В. Рыбаков // Современные проблемы науки и образования [Электронный ресурс]. – 2014. – № 1. – Режим доступа: https://www.science-education.ru/ru/article/view?id=12172. – Дата доступа: 15.10.2016.

Нікіціна Л.К. *(в. Заронава, Віцебскі раён)*

ШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў ЗАРОНАЎСКІМ КРАІ Ў XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX ст.

Заронава – вёска, якая знаходзіцца на старой полацкай дарозе ў 16 км ад Віцебска. Першая згадка ў летапісных дакументах датуецца 1533 г. Падзеі, людзі праславілі наша мястэчка. Сёння варта згадаць школьнае жыццё. Кожная школа, як і чалавек, мае сваю гісторыю, сваю біяграфію. І чым больш ёй гадоў, тым яна багацейшая. У в. Заронава ў 1865 г. працавала валасное народнае вучылішча сялян-уласнікаў, у якім навучэнцамі былі 12 хлопчыкаў і вучыў іх настаўнік-мужчына.

У 1862 г. быў выдадзены царскі ўказ аб адкрыцці пачатковых школ – народных вучылішчаў у заходніх губернях Расіі. У «Памятнай кніжцы Віцебскай губерні» за 1900 г. напісана: «Народнае вучылішча ў в. Заронава Жарабычскай воласці было адкрыта ў 1867 годзе. Настаўнік – Дзмітрый Максімавіч Вішнеўскі, святар – Мікалай Міхайлавіч Папоў». У 1889 г. у гэтым жа вучылішчы працаваў Аляксандр Мікалаевіч Івашнёў, які скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю, меў жалаванне 150 руб. Вучылася ў яго 37 хлопчыкаў. Яшчэ цікавая інфармацыя, датаваная 1887 г., – на ўтрыманне настаўніка з дзяржаўнай казны траціласся 75 руб., а 462 рублі выдаткоўвала грамадства, значыць, бацькі. Вучылася на гэты час 40 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі.

У «Полацкіх епархіяльных ведамасцях» за 15.02.1896 г. знаходзім: «У Заронаве адкрыта царкоўна-прыходская школа ў 1893 годзе». Архіўныя дакументы па Жарабычскай воласці за 1927 г. інфармуюць: «Заронаўская беларуская школа адкрыта ў 1894 годзе. Наша Заронава было цэнтрам «уездного благочиния». Царква святога Ануфрыя аб'ядноўвала 11 прыходаў Жарабычскай воласці.

З прыходам савецкай улады царкоўна-прыходская школа была зачынена, на змену прыйшлі школы I і II ступеняў. Што адметна: у Заронаве адукацыя не перапынялася. І зразумела, што школа трапіла пад уладу сельсаветаў. Мы знайшлі ў архіве, што пры Заронаўскім сельсавеце былі наступныя школы: Заронаўская, Клюеўская, Міхалеўская, Варашыльская, Іванаўская, Мядзелінская, Касцюкоўская. У 1926 г. яны праводзілі выпускны калёквіум. Архіўны дакумент за 1920 г. інфармуе, што загадчык Жарабычскага аддзела народнай адукацыі Бутроў Фёдар Іванавіч назначыў Дарагую Лідзію Аляксандраўну работніцай Заронаўскай школы I і II ступеняў. Цвяткову Анастасію Лаўраўну і Палтарацкага Івана таксама, а вось Высоцкую Аляксандру і Беліза Ганну перавёў у Язвінскую і Княжыцкую школы. У гэтым жа фондзе за 1920/21 навучальны год чытаем: «Заронаўская школа I ступені: Воранаў Раман Ф. – старшыня савета, Дарагая Лідзія – бібліятэкар савета, Воранава Надзея – сакратар савета, Высоцкая Аляксандра – школьны работнік, Беліза Ганна М. – таварыш старшыні савета, Воранава Ганна – школьная служачая, Лахноў Рыгор. Заронаўская школа II ступені: Папова Марфа – школьны работнік. У 1926 годзе, 28 лютага, быў назначаны загадчыкам Заронаўскай школы Цвяткоў Паўла, 1889 года нараджэння, у 1904 годзе закончыў педтэхнікум». Павел Іванавіч разам з жонкай Анастасіяй Лаўраўнай да 1930 г. працавалі ў нас. Як успамінае іх сын Міхаіл, маці атрымлівала зарплату ад мясцовага землеўладальніка Забэлы дзесяцірублёвымі залатоўкамі.

Пра 20-я гг. XX ст. зацікавіла наступная інфармацыя: «1920 год. Ва ўсіх школах створаны сельскагаспадарчыя аб'яднанні. Віцебская Усельгаскамісія размеркавала семена маркоўкі і капусты. На кожную школу 1 і 2 ступеняў па

аднаму залатніку сямян (1 залатнік – 4,26 г.). За Жарабычскае валаб'яднанне пад распіску семена атрымаў школьны работнік Воранаў. 23.08.1920 года. Валасны аддзел народнай адукацыі паведамляе, што для школ воласці неабходна пакінуць для паказальных і навуковых мэт уліковыя сады: Заронаўскі для Заронаўскай школы 2 ступені. Загадчык аддзела Бутроў Ф. Са справаздачы Вітупалітпрасвета з 15.09. па 01.10.1921 года. Заронаўскі нардом перададзены школьнаму савету Заронаўскай школы».

Легендай Заронаўскай школы з'яўляецца Дарагая Лідзія Аляксандраўна. Нарадзілася яна ў 1876 г. Пасля заканчэння Марыінскай гімназіі (1896) прыехала працаваць у Заронава. Па дакументах відаць, што працавала яна ў школе I і II ступеняў. Сям'і сваёй у яе не было, і ўвесь вольны час яна аддавала дзецям. З імі пасадзіла сад (які, дарэчы, вымерз зімой 1940 г.), праводзіла розныя мерапрыемствы. Іграла на многіх музычных інструментах. Высокаэрудыраваная асоба, патрыёт, яе і сёння помняць заронаўцы. Помняць пра яе метады работы, пра яе строгасць і патрабавальнасць. Помняць і пра такі цікавы факт. З Дарагой Лідзіяй Александраўнай апошні час жыў нейкі дзядок (магчыма, радня). Ён змайстраваў свой барометр. У франтоне хаты адчыняліся дзверцы, і адтуль выязджаў манах. Калі надвор'е было добрае – скідаў клаабук з галавы, а калі непагадзь – накідваў на галаву і хаваўся за дзвярыма. Нам стала вядома, што ў 1936 годзе ў раёне святкавалі 60-годдзе з дня яе нараджэння і 40-годдзе педагагічнай дзейнасці. Аб гэтым пісала абласная газета «Віцебскі пралетарый».

Працавала школа і ў акупацыю. Вось што нам расказаў Алейнікаў Савелій Пятровіч, былы вучань Лідзіі Аляксандраўны: «Заўсёды на ўроку на апошняй парце сядзеў паліцай. Але настаўніца не баялася яго. Мы ёй расказвалі розныя вершы. Адзін я помню і сёння. Называецца ён "Пагранічнік". Немцы прапанавалі Лідзіі Аляксандраўне супрацоўнічаць (яна добра валодала нямецкай мовай), але настаўніца адмовілася». Загінула ў лагеры смерці «5-ы полк». Праўда, аб яе гібелі ў нас недакладная інфармацыя. Тут нам яшчэ трэба папрацаваць, каб знайсці хоць які дакумент.

Падчас працы па тэме мы сустрэліся з Івановай Пашай Максімаўнай, якая працавала да вайны піянерважатай, настаўнікам. Яна нам распавядала пра цікавае жыццё школы. Пра мастацкую самадзейнасць, спартыўныя спаборніцтвы. Сярод школьных актывістаў Паша Максімаўна назвала Кузьміна Мікалая. Як высветлілі мы пазней: Кузьмін Мікалай Назаравіч родам з вёскі Машкіна, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў выкладчыкам фізкультуры ў Віцебскім медінстытуце. Сям'я Кузьміных увайшла ў гісторыю нашай мясцовасці тым, што выратавала яўрэйскага хлопчыка Лёву Верабейчыка ў гады акупацыі.

Цікавыя матэрыялы знойдзены і пра Заронаўскі дзіцячы дом імя 1 Мая. У 30-я гг. дырэктарам быў Руднік Рувім Маісеевіч, яго расстралялі немцы. У дзіцячым доме былі дашкольнікі, толькі перад вайной стаў 1 клас. У

1936 г. выхавальніцай была назначана Кацярына Рыгораўна Мяжэвіч. Калі пачалася вайна, яе назначылі дырэктарам, і дзіцячы дом, пераіменаваны ў Навікоўскі, паехаў у Тамбоўскую вобласць. На руках 23-гадовай дзяўчыны быў 151 выхаванец. Пісьмы былых дзетдомаўцаў, якія ёсць у музеі, кранаюць сваёй шчырасцю, дзіцячай удзячнасцю. Удалося знайсці былую дзетдомаўку Олю Манько (Вольга Уладзіміраўна), якая жыла ў Санкт-Пецярбурзе. Вольга Уладзіміраўна выхоўвалася ў Заронаве з 1934 г. Помніць многіх дзетдомаўцаў. Вось яны: Коля Маеўскі, Каця Харына, Хана Гофман, Оля Крыцкая, Валя Трабухіна, Ніна Салаўёва, Валя Мацюшкава, Надзя Давыдзенка, Паліна Крэйніна. Успомніла і тых, хто працаваў. Гэта Левіт Міхаіл, жонка яго Соня, Асташэвіч Вацлаў Антонавіч, яго жонка Раіса Васільеўна, Гарэлік Рыва Маісееўна, Быкаў Рыгор Карпавіч і яго жонка Вольга Міканораўна, Бабічава Лідзія Рыгораўна, Нюра Пясоцкая

У гады вайны былыя вучні і настаўнікі арганізавалі сваю падпольную групу. Настаўнік Шпакаў Ісідор Ільіч да вайны сядзеў у турме, і немцы прапанавалі яму супрацоўнічаць. Гэта выкарысталі і падпольшчыкі, яны ўгаварылі Ісідора Ільіча стаць бургамістрам. Доўгі час удача спадарожнічала нашым патрыётам, але... Здраднік выдаў іх. Арлоўскую Ганну Авяр'янаўну, Бараноўскага Станіслава Карпавіча расстралялі ў Наваболецку Гарадоцкага раёна, Залескую Ніну Васільеўну – на Кабыляцкай гары ля Оршы. Шпакава Ісідора Ільіча расстралялі ў Багушэўску. Таксама нашы выпускнікі змагаліся на фронце і ў партызанскіх атрадах.

Наша школа перарывала заняткі толькі з канца 1943 па чэрвень 1944 г. Калі стаў фронт у нашай мясцовасці, то насельніцтва пайшло ў эвакуацыю. Дамоў вярнуліся летам 1944 г. А ўжо першага верасня пачала працаваць у Заронаве школа. Было ўсяго 4 класы, навучанне вялося ў зямлянцы. Вось як апавядае пра свой першы клас Аліна Васільеўна Бастава: «Мама з плашч-палаткі пашыла сумку, а сшытак збрашуравала з плотнага кардону, які знайшла ў скрынях з-пад снарадаў. За прададзенае малако (бабуліна карова ўцалела) купілі некалькі алоўкаў, адзенне сшылі з ласкуткоў гімнасцёрак і шынялёў, што знайшлі ў акопах і траншэях. У штабной зямлянцы, якая знаходзілася непадалёку ад Заронаўскага возера, размясцілася школа. Сцены былі абкладзены альховымі жэрдкамі, справа пад столлю было два акны ў рамах. На супрацьлеглым баку вісела доўгая чорная дошка. Каб убачыць, што напісана на ёй, трэба было галаву павярнуць на 90 градусаў. Недзе з паўметра ад дошкі стаялі сталы ў дзве шырокія дошкі. Сталоў было чатыры, на кожны клас. Усё памяшканне было падзелена на дзве няроўныя палавіны. У закуточку жыла настаўніца Ганна Аляксандраўна Марыноўская з сынам і дачкою. Цяпло ў зямлянцы даваў шчыток, які стаяў на мяжы двух пакояў. Асвятляла пакой лямпа, зробленая з гільзы снарада. Настаўніца зачаравала сваіх вучняў тым, што шмат ведала. Заняткі ішлі адначасова ва ўсіх чатырох класах. Буквар у першым класе быў адзін на 11 чалавек. Дамоў вучням

яго давалі па чарзе. Толькі не аднаму вучню, а ўсёй вёсцы: адзін дзень – сімонаўскім вучням, другі дзень – тапорынскім, трэці – заронаўскім». Як успамінае Аліна Бастава, маці перапісвала старонкі буквара на плотную жоўтую паперу чарніламі з чырвоных буракоў.

Вясной у Заронаве пабудавалі першы дом, дзе размясціўся сельсавет. Там жа выдзелілі куток для бібліятэкі. І хоць яшчэ ішла вайна, а калгас ужо працаваў, вёска будавалася. (Яшчэ ў 1948 г. людзі жылі ў зямлянках – марудна ішло будаўніцтва). Цікава было пачуць, што вучні пасля алоўка перайшлі на пісьмо ручкамі з пяром. Да палачкі прыкручвалі пяро ніткай. А вось чарніла з чаго толькі не гатавалі! З чырвоных буракоў. Але яны хутка гусцелі. Спрабавалі з сажы, але вучні пасля пісання ператвараліся ў трубачыстаў. Нарэшце, удалося купіць парашок на базары, і такім чынам сталі пісаць фіялетавымі чарніламі. Уразіла яшчэ, як дзеці харчаваліся. Хлеба не было. Мамы сваім дзецям клалі ў сумкі моркву, кавалак бруквы, вараны боб. Трэба помніць і пра тое, што пасля школы ўсе вучні працавалі разам з дарослымі на сваіх агародах, займаліся будаўніцтвам. У Заронаве яшчэ і сёння стаіць хата, пабудаваная чатырнаццацігадовым Святазарам Сіўцовым у 1947 г. Бацька памёр, брат Марк падарваўся на міне. Вымушаны быў школьнік сам займацца будаўніцтвам. А ён не адзін такі быў. Працуючы з краязнаўчым матэрыялам раённай газеты «Калгасная трыбуна» за 17.08.1950 г., прачытала: «Актыўную дапамогу ў рабоце калгасу імя Жданава Заронаўскага сельсавета аказваюць вучні Заронаўскай сямігадовай школы. Вучань 5 класа Янкоў Мікалай, працуючы на звозцы снапоў, штодзённа выконвае па паўтары нормы. Многія вучні добрасумленна працуюць на падграбанні каласоў і на іншых работах». Значыць, нашы вучні актыўна дапамагалі на палях калгасаў. Яшчэ адзін кірунак майго даследавання – кіраўнікі нашай школы. Мы знайшлі ў дакументах інфармацыю пра наступных дырэктараў.

1. Скітовіч Нічыпар Маркавіч – 1900 года нараджэння, у 1918 г. скончыў настаўніцкую семінарыю;
2. Цвяткова Анастасія Лаўраўна;
3. Цвяткоў Павел Іванавіч – з 1926 па 1930 г.;
4. Пляшкоў Лаўрэнцій Сцяпанавіч;
5. Каралёў Аляксей Пятровіч;
6. Гарбулька Кузьма Прохаравіч;
7. Шапавалаў;
8. Прыстромаў Гаўрыіл Яфімавіч;
9. Гайдукоў Іван Раманавіч;
10. Быкаў Рыгор Карпавіч;
11. Золатаў Дзмітрый Парфенавіч;
12. Марыноўская Ганна Аляксандраўна – да 1948 г.;
13. Фішман Мікалай Захаравіч – да 1952 г.;
14. Машэра Пётр Дзмітрыевіч;

15. Алепкін Васіль Іванавіч (пару месяцаў);

16. Балашоў Васіль Іванавіч.

Да 1956 года дырэктары мяняліся вельмі часта, а з 1956 г. кіраваць школай стаў Гушчанка Аляксандр Якімавіч (1956–1993).

Як вышэй гаварылася, школьны будынак таксама часта мяняўся: то асобны будынак, то зямлянка, то наёмнае памяшканне. І толькі ў 1960 г. пабудаваны быў тыповы школьны будынак, у якім школа працавала да свайго закрыцця ў 2010 г.

ЛІТАРАТУРА

1. **Памяць** : Віцебскі раён : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У. І. Мезенцаў ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2004. – С. 187–189, 209, 359, 439–447.

2. **Адкрыты** ўрок / уклад. А. Шульман, В. Разанава // Віцебск. – 2015. – С. 16–51.

3. **Адукацыя** на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., г. Віцебск, 30–31 сак. 2010 г. / рэдкал.: В. У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2010. – 255 с.

4. **Гушчанка, А.** З гісторыі Заронаўскай школы / А. Гушчанка. – Наваполацк : Выдавец А. У. Маладзечкін, 2015.

5. **Нікіціна, Л. К.** Мой любы край, маё Заронава / Л. К. Нікіціна. – Наваполацк : Выдавец А. У. Маладзечкін, 2016. – 152 с. – (Краязнаўцы Віцебшчыны аб любімым краі ; вып. 5).

6. **Фонды** музея «Гісторыя Заронаўскага краю».

Огородников А.А. *(г. Новополоцк)*

МЕРОПРИЯТИЯ СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ В ОТНОШЕНИИ ПАМЯТНИКОВ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ В 1917–1941 гг. (НА ПРИМЕРЕ ПОЛОЦКА)

Октябрьская революция 1917 г. предопределила не только коренное изменение социально-экономических основ жизни, но также и радикальное преобразование культурных и ментальных ценностей граждан бывшей Российской империи.

Частью политики большевиков по кардинальному переустройству повседневности являлось строительство «социалистического города», формирование новой городской среды. В связи с этим встал вопрос о политике в отношении памятников истории и культуры, являющихся неотъемлемой частью городского пространства. На протяжении 1920-х гг. политическая линия партии в этом вопросе была выработана, а вытекающие из нее мероприятия были реализованы на практике позже.

Политика большевиков в период 1917–1941 гг. в отношении памятников истории и культуры, составлявших часть городской среды, строилась по следующему принципу: если культурный объект признавался идеологически чуждым и неприемлемым, он десакрализовался, а затем использовался в утилитарных целях или же вообще разрушался.

Так, одним из наиболее примечательных мемориальных свидетельств царской эпохи в Полоцке, по мнению большевиков, был памятник героям Отечественной войны 1812 г., установленный в 1850 г. перед Свято-Николаевским собором.

Монумент был определен советской властью как «буржуазный пережиток», и в 1932 г. памятник был снесен якобы «на металл для нужд первой пятилетки». Его снос стал технически трудной задачей. Первая попытка была осуществлена с использованием тракторов, однако она не увенчалась успехом – пришлось прибегнуть к помощи автогенщиков и резать памятник на части, а затем разбирать фундамент [9].

Затраты на снос и вывоз материалов, оставшихся после демонтажа монумента, превзошли полученную прибыль от переплавки цветных металлов. Акция по сносу памятника героям Отечественной войны 1812 г. не сыграла какой-либо значительной роли в выполнении планов первой пятилетки и имела сугубо идеологический, а не экономический характер.

На всем протяжении довоенных лет большевики вели борьбу с «религиозным дурманом». Важным элементом этой борьбы в Полоцке была десакрализация религиозных ценностей и культовых зданий.

Так, 13 мая 1922 г. состоялось вскрытие мощей преподобной Евфросинии Полоцкой. При этом «атеисты прилюдно на улицах города разбрасывали бинты и кости мумии, не заботясь о том, что тем самым глубоко оскорбляют чувства верующих» [6, с. 288]. После вскрытия «останки Евфросинии были сданы в Витебский губернский краеведческий музей» [9].

23 июня 1922 г. в Полоцке состоялось раскрытие мощей святого Андрея Баболи [10, с. 62]. Его останки «были отправлены в Москву в музей здравоохранения. По некоторым источникам известно, что они попали в Рим, в обмен на политзаключенных» [9].

У 1947 г. пры падвядзенні вынікаў дзейнасці Белкніжкультгандлю за 1946 г. адзначалася, што гандлёвая сетка разгорнута ва ўсіх гарадах БССР, дзе былі адчынены 32 магазіны, 7 ларкоў і 6 школьных кіёскаў. Разам з тым былі створаны абласныя аддзяленні, выканана значная праца па забеспячэнні школьнай сеткі гарадоў БССР наглядными дапаможнікамі да вучэбнага года.

Новым спосабам паляпшэння абслугоўвання ў першыя мірныя гады стала арганізацыя аддзела падпісных выданняў (прасоўванне кнігі поштай). Адной з праблем, было недастаткова хуткае перамяшчэнне тавараў з оптавых баз у гандлёвыя кропкі, таму ў мэтах задавальнення патрэб гараджан у

кнігах было ўведзена патрабаванне пакідаць тавары на складах у сярэднім не больш чым на 30 дзён. Некаторая частка кніг прызнавалася заляжалым таварам, які падлягаў тэрміновай рэалізацыі.

Адным з эфектыўных сродкаў павышэння якасці працы Белкніжкультгандлю ва ўмовах недастатковай вытворчасці кніг разглядалася адкрыццё спецыяльных магазінаў па скупцы ў насельніцтва і продажы букіністычных кніг. У пасляваенны час у рэспубліцы гэта была новая форма гандлю, якая давала магчымасць зрабіць асартымент кніг больш разнастайным пры адсутнасці рэзерваў для пашырэння аб'ёмаў іх стварэння на паліграфічных прадпрыемствах.

Таксама наладжваўся кантроль за дастаўкай вучням падручнікаў і сшыткаў, каб выключыць непрадуманае размеркаванне надзвычай неабходных для адукацыйнага працэсу рэчаў і пазбегнуць спроб спекуляцыі. Міністэрствам гандлю БССР ставілася задача па павелічэнні колькасці кніжных крам і магазінаў у гарадах і арганізацыі школьных кіёскаў ва ўсіх гарадскіх сярэдніх школах. Школьныя кіёскі імкнуліся забяспечыць у належных аб'ёмах таварамі першага запыту: пер'ямі, ручкамі, алоўкамі, чарнілам, сцёркамі і інш. [1, л. 73–75].

Асаблівае значэнне надавалася забеспячэнню падручнікамі і кнігамі для чытання дзіцячых дамоў. Паляпшэнне побыту дзяцей у дзіцячых установах адразу пасля вайны адбывалася запаволена, але для ўмоў рэспублікі, у вялікай ступені разбуранай, з яшчэ не адноўленай прамысловасцю і не ўзняўшайся сельскай гаспадаркай, гэты працэс працякаў няспынна і максімальна адпавядаў наяўнаму ўзроўню забеспячэння насельніцтва ўвогуле. Міністэрствам гандлю БССР сістэматычна маніторылася закупка для гэтых устаноў прадметаў першай неабходнасці (іголкі, ніткі, зубны парашок, шчоткі і інш.), а таксама чарніла, алоўкі, наглядныя дапаможнікі, дзіцячая літаратура і нават рэдка даступныя на той час цацкі і музычныя інструменты [1, л. 60–63]. Таму гэтыя творы размяркоўваліся ў дзіцячыя ўстановы ў першую чаргу.

У гандлёвую сетку траплялі і рэалізоўваліся тыя прадметы, якія суправаджалі навучанне школьнікаў, – канцылярскія тавары. Яны спецыяльна ўносіліся ў абавязковыя для выпуску прамысловасцю краіны планы і праграмы. Сярод тавараў для вытворчасці, прызначаных для рэалізацыі ў магазінах гарадоў БССР, у архіўных дакументах згадваюцца ручкі для вучняў, вучнёўскія пеналы, канторскі клей, акварэльныя фарбы, лінейкі і вугольнікі вучнёўскія з дзяленнямі, транспарціры і цыркулі вучнёўскія, дошкі для чарчэння, наканечнікі для алоўкаў і прыстасаванні дзеля іх папраўкі, скрэпкі, туш усіх колераў і інш. [2, л. 56, 62–64]. Ва ўмовах пасляваеннай разрухі, пры тым, што нярэдка ў школах пісалі на адваротах ужо выкарыстаных раней лістоў, паміж радкамі старых кніг, дэфіцытам былі чыстыя сшыткі, лісты для малявання і іншыя, пазней звыклыя ў штодзённасці

рэчы. Усё ж дзяржаўны заказ на вытворчасць кніжнай прадукцыі і імкненне рэгулярна пастаўляць у магазіны не толькі кнігі, але і канцылярскія вырабы адыгрывалі істотную ролю ў паляпшэнні дабрабыту гараджан, вяртанні да стандартаў мірнага жыцця і павышэнні культуры жыхароў рэспублікі.

Сёння складана аднавіць у дэталях працэс продажу кніг у асобных магазінах гарадоў БССР, захаваліся толькі некаторыя спісы кніжнай прадукцыі, рэалізаванай у першыя пасляваенныя гады канкрэтнымі магазінамі. З іх можна даведацца аб тым, што цікавая літаратура, айчынная і замежная класіка, рэдкія кнігі, кнігі для дзяцей не заставаліся доўга на паліцах гандлёвых кропак. Нягледзячы на нястачу і неабходнасць набыцця насельніцтвам перш за ўсё прадуктаў харчавання, дзяржава імкнулася забяспечыць хаця б мінімальную падтрымку адукацыйнага працэсу і кантралявала прапанову пакупнікам кніг на розны густ, а гарадскія сем'і выдзялялі на іх сродкі, аддаваўшы належную ўвагу чытанню як для павышэння адукацыі, так і для пашырэння кругагляду і магчымасці цікава бавіць вольны час.

ЛІТАРАТУРА

1. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 117. – Воп. 2. – Спр. 20. Пратаколы паседжанняў калегіі Міністэрства гандлю БССР. 1947 г.

2. **НАРБ**. – Фонд 117. – Воп. 2. – Спр. 194. Пратаколы нараду намесніка міністра Міністэрства гандлю БССР па пытаннях размеркавання тавараў шырокага карыстання. 1948–1949 гг.

ЛІТАРАТУРНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА І МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА

Аляксеева Т.У. (*г. Віцебск*)

ФАЛЬКЛОР У ДРАМАТУРГІІ ФЁДАРА ПАЛАЧАНІНА

Узаемасувязь літаратуры і фальклору з'яўляецца актуальнай праблемай сучаснага літаратуразнаўства. У розныя перыяды свайго існавання літаратура звярталася да вуснай народнай творчасці, запазычвала матывы, вобразы.

Фёдар Антонавіч Палачанін – вядомы драматург на Віцебшчыне. Аўтар шырока выкарыстоўвае фальклорныя сюжэты, тэмы, мастацкія сродкі вуснай народнай творчасці. Вядома, што фальклор – адзін з важных сродкаў самавыяўлення народа, адбітак яго памкненняў, мараў наконт будучыні. Фальклорныя сюжэты выступаюць як характарыстыка народнага жыцця, псіхалогіі, маральных, філасофскіх і эстэтычных поглядаў народа. Зварот да традыцый фальклору дапамагае раскрыць нацыянальны каларыт, наблізіцца да вытокаў. У п'есах Ф. Палачаніна ўжываюцца элементы каляндарных і сямейных абрадаў, апрацоўкі паданняў і легендаў, малыя жанры фальклору, песенная творчасць.

Рэальна-бытавыя сцэны чаргуюцца з фантастычнымі ў п'есе «Дарога ў неба». У Докшыцкім краі (паміж вёскамі Краснікі і Жамойск) знаходзіцца прыродны помнік – Сцёп-камень, або камень Сцяпан. Вядома, што праз гэту мясцовасць пралягае Галоўны Еўрапейскі водападзел, які размяжоўвае басейны рэк Балтыйскага і Чорнага мораў. На аснове адной з легенд пра гэты помнік і напісаны дадзены твор. Аўтар уводзіць у сюжэт п'есы Чорта і Анёла. Тыпова, што Чорт падаецца ў абліччы казла. Характэрны для літаратуры і матыў продажу душы Чорту. Галоўны герой шавец Сцяпан пакахаў Вяльяну, хацеў з ёй хутчэй ажаніцца, таму звярнуўся да Чорта. За тое, што адрокся ад веры, стаў выконваць загад д'ябла (разбіваць крыжык), ператварыўся ў камень. Для перадачы элегічнага настрою ў творы ўжываюцца беларускія народныя песні «Ці ўсе лугі пакошаны…», «Ой, у полі крыніца». Ф. Палачанін выкарыстоўвае ў п'есе і галашэнне для перадачы душэўных пакутаў гераіні:

«Не кідай, Сцяпан, мяне!
Пакліч хутчэй да сябе!
Любы мой, цяжанька мне,
Жыццё няміла без цябе [1, с. 41].

Вяльяна вельмі сумавала, калі даведалася пра здзейсненае Сцяпанам. З яе «слёз з-пад каменя прабілася крыніца, якая разлілася па ваколіцах і ператварыла лагчыну ў непралазнае балота, якое людзі назвалі Шыленскім, або Кравецкім, і паплыла ў свет празрыстай рэчкай. Гэту рэчку спачатку назвалі ў памяць пра Вяльяну Вельяй, а пазней назва стала гучаць як Вілія» [1, с. 43].

Любоў да роднай зямлі, прыхільнасць да яе, ушанаванне святаў, абрадаў сваіх землякоў правяраецца часам. У меладраме «Кветкі дзяцінства» Ф. Палачаніна асэнсоўваецца жыццё беларусаў за межамі сваёй краіны, у Польшчы. Драматург заяўляе, што не трэба выракацца ўласных каранёў, мовы, культуры, як бы далёка не знаходзіўся чалавек ад Беларусі. Таму ён сімпатызуе гераіні п'есы Стасі, якая 40 гадоў на тэрыторыі іншай краіны памятае пра роднае Зарэчча на Глыбоччыне, спявае беларускія песні, вучыць дзяцей размаўляць па-беларуску. Жанчына пастаянна ўспамінае прыгожую прыроду, раку, лес, сцяжынкі, па якіх хадзіла ў дзяцінстве. Яна кажа: «Дома і сонца ярчэйшае і ласкавейшае. Там і дожджык цяплейшы. І птушкі званчэй і прыгажэй спяваюць. Там песні родныя гучаць… Здаецца, каб мела крылы, птушкай паляцела б на сваю старонку» [4, с. 110]. Пра прыхільнасць Стасі да фальклору, святаў і традыцый сваёй краіны сведчыць і той факт, што яна двойчы спявае песню на словы К. Буйло «Люблю наш край, старонку гэту…», а таксама ўзгадвае асобныя народныя прыкметы.

Гераіня распавядае пра свята Купалле, пра варажбу. Адзначае, што «вечарам у агародзе, не зрываючы, складвалі роўненька дзве перыны цыбулі і адначасова іх скусвалі. Адну лічылі горам, а другую – шчасцем. Раніцай глядзелі, што больш вырасла, тое і чакала чалавека ў жыцці… Моладзь найчасцей варажыла на вянках. Дзяўчаты і хлопцы апускалі іх на рачную плынь, загадваючы на будучага мужа і жонку, і пільна сачылі, чые вянкі злучацца, тая пара і павінна была пажаніцца» [4, с. 118]. Аўтар звяртае ўвагу, што з магнітафона заўсёды гучаць беларускія песні «Купалінка», «Калі каліна не цвіла», «Ой, сівы конь бяжыць», «Ой, у полі крыніца».

Меладрама насычана ёмістымі выказваннямі наконт роднага кутка, якія ўзбагачаюць мастацкі тэкст. Напрыклад, «Жыць на чужой старонцы, як на скале адзінокай сасонцы» [4, с. 112], «Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы!» [4, с. 115], «На чужой старане і вясна не красна» [4, с. 110], «Радзіма – матка, чужына – мачыха» [4, с. 112]. Яны дапамагаюць больш поўна перадаць адчуванні і памкненні персанажаў, прыхільнасць да Бацькаўшчыны.

У п'есе «Даравальная нядзеля» распавядаецца пра даўняе свята (апошні дзень Масленіцы), у час якога варта прасіць ва ўсіх прабачэння. Фёдар Антонавіч пераконвае, што няма сэнсу чакаць свята, трэба пастаянна крочыць па жыцці сумленна і годна. Дакладна перадаць ход сюжэта, напружанасць дзеяння, эмацыйнасць дапамагае песня «Прысвоенае шчасце»:

«Шчасця моцна я жадала
І сустрэць яго пайшла,
Ды сцяжыначка чамусьці
У сад сяброўчын прывяла.
Райскі яблык адшукала
І сарвала неўпрыкмет,
А травіца на сцяжынцы
Затаіла грэшны след…» [1, с. 270].

Драматург удала выкарыстоўвае тут фальклорны матыў расплаты за дрэнныя ўчынкі.

У камедыі «Санаторная песня» для характарыстыкі месца адпачынку і лячэння, а таксама паказу бяздумнага баўлення часу пісьменнік актыўна карыстаецца прыпеўкамі. Персанажы падзелены на два полюсы. Першыя вядуць сябе прыстойна, застаюцца вернымі сям'і, другія ж падманваюць, не захоўваюць этычныя нормы. Пісьменнік асуджае такую схему паводзін, не прымае пошук героямі забаў і іх прынцып весела правесці час. Камічнымі падаюцца эпізоды, у якіх апісваюцца «захопніцкія» паходы жанчын. Пра гэта спяваецца ў прыпеўках:

«Санаторную пуцёўку
З цяжкасцю дастала.
Хоць шукала ухажора,
Яшчэ не спаткала» [4, с. 97].

«А мы любім весяліцца
І не любім мы драмаць.
Тут прыгожых хлопцаў многа,
Трэба хутчэй выбіраць» [4, с. 97].

«А я яшчэ не стары
І здароўе маю,
З маладымі дзяўчатамі
Яшчэ пагуляю» [4, с. 97].

Ф. Палачанін негатыўна ставіцца да такіх паводзінаў, сцвярджае, што трэба супрацьстаяць разбэшчанасці, у сям'і павінна панаваць шчырая і даверлівая атмасфера. Пра гэта сведчыць наступная прыпеўка, якую выконвае Аўдзееўна:

«Колькі лесам ні хадзіла,
Мацней дуба не знайшла.
Многа ёсць тут кавалераў,
А за мужа лепш няма» [4, с. 98].

Драматург карыстаецца і формай анекдота для перадачы адпаведнай атмасферы.

Апісвае Ф. Палачанін у сваіх творах і элементы вясельнага абраду. Непасрэдна сватанне адлюстравана ў п'есе «Пазычанае шчасце». Сваты прамаўляюць: «Купцы прыехалі… У вас ёсць тавар цудоўны... Мы ж не так прыехалі, а выкуп прывезлі» [1, с. 112]. Этап заручыны перададзены ў аднайменнай драме аўтара, а ў п'есе «Удава не пара хлопцу» падаецца само вяселле. На «вясковым двары вясельны рух і вясёлы гоман. Хтосьці выкрыквае: «Маладыя едуць!». Дзве жанчыны хуценька рассцілаюць на ганку дыван. З хаты на ганак выходзіць Ціміна. Яна трымае паднос, засланы прыгожым ручніком, на якім знаходзяцца хлеб-соль і дзве чаркі з віном… Па вясковай вуліцы, сігналячы, рухаецца вясельны картэж. Ён спыняецца каля двара, дзе шмат людзей… Маладыя накіроўваюцца да хаты, на ганку якой іх урачыста сустракаюць…» [1, с. 165]. Усе прысутныя на вяселлі заўважаюць, што насустрач маладым папаўзла гадзюка. Вядома, што гэта дрэнны знак. Сустракаем у творах і наступныя прыкметы: «Калі ў акно птушка стукалася, то чакалі або госця, або сватоў, калі была дзяўчына на выданні» [4, с. 126]. У цяжарнай жанчыны прыхіналіся да жывата і слухалі: «Калі спявае – то дачка будзе, а калі свішча – сын» [1, с. 159].

Дзіцячы фальклор прысутнічае ў драме «У смутку і ў радасці». Для супакаення дарослай дачкі маці спявае ёй калыханку:

«Сонейка стомлена села за лесам.
Змрок прыблукаў да двара.
Любай дачушцы і ўсім дзеткам
Спаць наступіла пара.
Спі, засынай, мая любая кветка!..
Нас акружае жыццёвае мора,
А ў ім заўжды неспакой.
Каб ты ніколі не ведала гора,
Здрады і крыўды людской!» [5, с. 197].

Тэкст калыханкі ўдала перадае клопат і трывогу маці, дапамагае дзяўчыне адчуць сябе патрэбнай грамадству, стаць больш упэўненай у заўтрашнім дні.

Мова твораў Ф. Палачаніна ўзбагачаецца выразнымі прыказкамі і прымаўкамі. У іх знайшлі сваё адлюстраванне ўяўленні пра стасункі ў сям'і, погляды на каханне, сяброўства, вернасць, здраду, маральныя якасці чалавека. У прыказках і прымаўках абагулены сацыяльна-гістарычны вопыт народа. Напрыклад, «Сілаю не заставіш быць мілаю» [5, с. 197], «Брат любіць сястру багатую, а мужык – жонку здаровую!» [5, с. 207], «Адклад не ідзе на лад» [2, с. 215], «Шыла ў мяшку не ўтоіш» [5, с. 141], «Жыццё пражыць – не поле перайсці» [5, с. 146], «І птушцы адной нудна» [3, с. 43], «Усюды добра, дзе нас няма» [3, с. 51], «Няма нічога тайнага, каб не стала яўным» [3, с. 60], «Маладосць прайшла – не развіталася, старасць прыйшла – не прывіталася!»

[4, с. 67], «Горка рэдзька, ды ядуць, дрэнна замужам, ды ідуць!» [4, с. 65], «Не ганьбуй старым ботам, пакуль новага не пашыў» [4, с. 65], «За добрым мужам і варона жона, а за кепскім і княгіня загіне» [1, с. 138], «У нашай вёсцы ў адным канцы кашлянеш, а ў другім пачуюць» [4, с. 67], «З жонкай, як з бараной у лесе!» [4, с. 56], «Калі рукі халодныя, дык сэрца гарачае!» [4, с. 58], «Жыццё – маліна, раскусіш – журавіна!» [4, с. 65], «З вачэй далоў і з сэрца вон» [1, с. 211], «Сівізна ў бараду, а чорт у ляжкі» [2, с. 207], «Грошы і камень б'юць» [1, с. 206], «Шчасце – не конь, у аглоблі не запражэш!» [1, с. 239], «Шчасце само ў рукі не ідзе» [1, с. 239], «Кожны чалавек свайго шчасця каваль» [1, с. 328] і іншыя.

Такім чынам, Ф. Палачанін у сваіх драматургічных творах карыстаецца разнастайнымі жанрамі фальклору. Гэта дапамагае ўзбагаціць мастацкі тэкст, выявіць аўтарскае асабістае стаўленне да традыцый і абрадаў беларусаў. Усе п'есы драматурга маюць шчаслівы казачны фінал: дабро перамагае, а зло застаецца пакараным.

ЛІТАРАТУРА

1. **Палачанін, Ф.** Дарога ў неба : драматургія / Ф. Палачанін. – Мінск : Кнігазбор, 2014. – 340 с.

2. **Палачанін, Ф.** Зраненае сэрца : драматургія / Ф. Палачанін. – Мінск : Кнігазбор, 2011. – 352 с.

3. **Палачанін, Ф.** Пазычанае шчасце : меладрамы / Ф. Палачанін. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2005. – 116 с.

4. **Палачанін, Ф.** Расплата за нелюбоў : п'есы / Ф. Палачанін. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 144 с.

5. **Палачанін, Ф.** Шлях да Бога : матэрыялы для выхаваўчай работы і драматычныя творы / Ф. Палачанін. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 212 с.

Бароўка В.Ю. *(г. Віцебск)*

ПАДЗВІННЕ Ў МАСТАЦКІХ ТВОРАХ В. ЛАСТОЎСКАГА: АКСІЯЛАГІЧНЫ РАКУРС

Беларуская літаратура пачатку XX ст. была літаратурай нацыі, якая «абуджалася да гістарычнага дзеяння» [1, с. 180]. У артыкуле «Нашы цэннасці» (1919) ураджэнец Віцебшчыны Вацлаў Ластоўскі адзначаў: «Калі мы хочам жыць і быць нацыяй, народам, мы павінны стварыць сваю літаратуру, навуку, сваё штукарства» [2, с. 323]. Сам ён у ліку першых узяўся за асваенне геапаэтыкі і гісторыі роднага краю, найперш Полаччыны і Дзісеншчыны.

Ластоўскага можна назваць песняром Полацка. На пачатку XX ст. Полацк быў невялічкім гарадком Расійскай імперыі, месцам, пазбаўленым бы-

лой велічы і былога ўплыву на палітычнае жыццё ўсходніх славян. Ластоўскі імкнуўся сфарміраваць у свядомасці суайчыннікаў вобраз Полацка як фундамента беларускай культуры і дзяржаўнасці. Дзеля гэтага пісьменнік выкарыстоўваў розныя жанры: лірычны верш, апавяданне, аповесць, драматычны абразок. Гістарычны лёс Полацка для Ластоўскага – лёс усёй Беларусі. Недвухсэнсоўна гэта даводзілася ў «нашаніўскім» артыкуле «Беларускі вечар у Полацку» (1910): «Але спіць край, спіць замершая сталіца і ўвесь беларускі народ…» [2, с. 246]. Полацк у В. Ластоўскага на пачатку XX ст. здалёку «выглядае казіста і горда, – вычуваецца нейкая ўкрытая веліч у гэтых руінах, што ляглі, як ранены рыцар, катораму час, быццам птахі-груганы, паскуматалі цела, – ляжыць спакойны, бязмоцны, але гордасць застыгла на абліччы яго, і, ступаючы па целу гэтага велікана з слаўнай мінуўшчынай, нехаця прыцішаеш голас, каб не збудзіць заснуўшага» [2, с. 245]. Зблізку ж там «драўляныя ліхія дамочкі з пачварнымі стрэхамі, з пакрыўленымі ваконцамі; увесь ён зліваецца ў нейкі шэры, гнойны колер, як бы дагніваючага трупа; кругом вее цішай смерці, толькі дзе-нідзе блісне купал царквы, манастыра, як абрыўка злоталітага саматкана ў разрытым кургане… Гэта замершы горад. Вымершая сталіца… Направа бачыш з гары дольнага замка бельчыцкія купалы, – гэта даўняя сяліба полацкіх князёў, там стаялі княжацкія харомы, гуляла дружына за цісовымі сталамі, распяваючы багатырскія песні пад звон гусляў, – цяпер колькі старушак-манашак дажываюць свой век у ліхім дамочку» [2, с. 246].

Апавяданне «Разбойнік» (1913) – мастацкая прыступка да стварэння вобраза Полацка. Там Полацк паказаны велічным гандлёвым і дыпламатычным цэнтрам на землях усходніх славян. Ранняе Сярэднявечча рэпрэзентавалася залатым перыядам у гісторыі крывічоў. Аўтар згадваў пра магчымае паходжанне назвы горада: «Мабыць, стаяў ён (камень. – *В. Б.*) так і ўзіраўся, калі сюдой варажскі род на маляваных ладдзях пад камандай Полтэса, вікінга-князя, ішоў у сутокі Палоты з Дзвіной, каб заснаваці там тын і зрубаці горад. Памятае ён, мабыць, старога Рагвалода і красуню Рагнеду з вольных дзён. Не раз, мабыць, услухаючыся, лавіў ён гучныя зыкі полацкага вечавога звону ад св. Сафіі і горды гоман вольнага крывічанскага веча. Не раз аб яго аціраліся ладдзі купецкага адважнага люду, што ішлі, нагружаныя воскам, мёдам ды несчыслёнымі саракамі кунічымі і бабровымі, у Рыгу, і на кгоцкі бераг, і к хамаву племю з паклонамі ад Крывічанскае зямлі, і полацкага вольнага веча, і ад залатога княжацкага пасада, і яго вернай дружыны – русі, просячы на замену гартоўных мячоў, каванага срэбра, золата і самацветаў» [2, с. 144]. Часы Сярэднявечча – трывожныя і разам з тым шчаслівыя для горада: «Дно Дзвіны золатам цякло, а берагі серабром былі мошчаны. А рубяжы адкрыты, і паміж князёў не было праўды. І чужацкія рукі выцягваліся па золата і па волю крывічанскую. Не раз Дзвіна мутна цякла, ускаламучаная капытамі літоўскіх коней. Прыходзілі яны ў багатую ста-

ронку, як мядзведзь да борці, і дзерлі скрылі залацістага мёду і душылі пчол. Не раз працавітыя пчолкі нанова выцягівалі вузу і налівалі соты, але бывала, што ўпадаў і гнілец у борць… Тады разляталіся пчолкі. А Дзвіною снавалі, як павукі, людзі з абасечанымі, двуручнымі мячамі ў чорных бурносах з нямецкім белым крыжом і апутывалі павучынай старонку, а па павучыні той паўзла «ганзіятыцкая» арава…» [2, с. 144]. Адмыслова згадваў апавядальнік пра Барысавы камяні: «На грудзях у Разбойніка (каменя – В. Б.) шчэрбы і равочкі кругам раскінуліся, а пасярод схімніцкі крыж. Гэта па смерці Барыса, Гінвілавага сына, на спамін па душы яго, з блізкай баровай пустэльні, што была на пясчыстым узгорку па той бок Дзісенкі, сівы мніх, прывёўшы каменаклёва, загадаў высеч, каб кожны, хто паедзе міма Дзвіной, уздыхнуў, да Бога кажучы: «Помозі, Божэ, рабу твоему князю Борысу…». Цяпер гэтыя пісьмёны злізаны раз'ятранай Дзвіной, і ніклы толькі след двох-трох літар віднее…» [2, с. 144]. Аўтар стварыў свой аповед пра Барысавы камяні як манументальны помнік эпіграфікі XII ст. Вядома, што чатыры вялікія валуны з высечанымі на іх шасціканцовымі крыжамі знаходзіліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны ніжэй Полацка. З гэтых камянёў захаваўся адзін, які знаходзіўся каля вёскі Падкасільцы ў пяці кіламетрах ад Полацка. Князя Барыса аўтар называе Гінвілавым сынам. У гісторыі вядомы Барыс Брачыслававіч, полацкі князь, унук Усяслава Брачыслававіча. Ён памёр у 1128 г. Надпісы на Барысавых камянях звязваюць менавіта з ім. Відаць, В. Ластоўскі быў знаёмы з тэкстам «Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага», дзе гаварылася пра князя Мінгайлу, яго сына Гінвіла, пра Гінвілавага сына Барыса, які заснаваў горад Барысаў, пабудаваў храмы святой Сафіі, святога Спаса, жаночы манастыр, царкву ў Бельчыцах. Верагодна, што менавіта гэты князь фалькларызаваўся ў творы «Князь Барыс і чорт» (1923): «Князь Барыс мураваў у Полацку царкву і, ну, ведама, – гэткая будыніна! – запазычыўся і задаўжаўся кругом. Няма ўжо больш дзе пазычаць! Дык пайшоў урэшце да чорта і папрасіў у яго грошы, кажучы, што на вайну патрэбна. На нішто добрае чорт, ведама, не дасць, але на вайну – пазычыў» [2, с. 163]. Князь-дойлід паказваўся Ластоўскім дасціпным і спрактыкаваным правіцелем, заклапочаным будучыняй роднай зямлі.

Для рэпрэзентацыі знакавых мясцін і асоб В. Ластоўскі нярэдка звяртаўся да адвольнай падачы гістарычных фактаў. Апавяданне «Разбойнік» у жанравым плане – літаратурная апрацоўка легендаў пра Полацк і полацкую зямлю. Аўтар гранічна свабодна абыходзіўся з гістарычным матэрыялам, калі згадваў пра паломніцтва Еўфрасінні Полацкай у Святую зямлю: «Раным-рана зазванілі ў святой Сафіі, у арліным гняздзе на полацкім замку. Адклікнуліся ім званы ў Спаса і з княжай Сялецкай сялібы. Паваліў народ на замак да святой Сафіі – сумны, невясёлы. Чаго ж зажурыліся палачане? Ці вораг непашчадны з цёмных пушч літоўскіх хлынуў, ці слабоды смаленскія ўзбунтаваліся, ці Ольгавічы на Рагваложых унукаў паднялі меч? Не вораг

нахлынуў, і слабоды смаленскія пад ласкавым ды набожным князем у послуху, і Ольгавы ўнукі не паднялі мяча на Рагвалодавічаў, а дачка князева Прадслава з сястрой і братам выязджаюць у далёкую старонку на паклон да гроба Хрыстовага. Ужо ладдзі выразаныя, пазлачаныя стаяць пры беразе і трыццаць малайцоў-грабцоў сядзяць пры ясянёвых тачоных вёслах, і белыя парусы, як лебедзі, выгнулі грудзі. Пасыпалі палачане дарогу княжне Прадславе і сястры яе і брату Давіду чарнобыллем-зеллем, багаткамі пушнымі і шматфарбнымі кволымі краскамі ад св. Сафіі да каванага мосту і ад мосту да берага. Благаславіў уладыка і бацька-князь з княгіняю сесці ў ладдзю, ехаць у далёкую дарогу» [2, с. 145]. Еўфрасіння Полацкая, як вядома, адправілася ў паломніцтва ў канцы свайго жыцця, менавіта Еўфрасінняй, а не Прадславай, бо Прадслава – яе свецкае імя.

Падчас Першай сусветнай вайны Вацлаў Ластоўкі напісаў шэраг твораў, заснаваных на гістарычным матэрыяле, якія склалі цыкл «Беларуская мінуўшчына». У апавяданні «Князёўна Рагнеда» (1916) акцэнтавалася значнасць Полацка ў палітычным жыцці Сярэднявечча. Князь Уладзімір, што на момант сватання да Рагнеды быў наўгародскім князем, атэстуецца, магчыма, для надання большай значнасці Полацку кіеўскім князем. В. Ластоўскі акцэнтаваў два вобразы як рэпрэзентанты крывічанак: свабодалюбівай і непакорнай Рагнеды ды мудрай і богабаязнай Еўфрасінні. У апавяданні «Усяслаў» (1916) Ластоўскі апрацаваў паданні пра гэтага князя, надзеленага надзвычайнымі ўласцівасцямі: «Людзі забабонныя расказвалі, што князь Усяслаў перакідаецца ў ваўка і ноччу абягае сваё і суседнія княствы і бачыць усё, што і як робіцца, што вочы яго праз найтаўсцейшыя сцены бачаць і вушамі ён за соткі міль кожны голас чуе. Княжыў Усяслаў 87 гадоў, памёр у 1101 гаду» [2, с. 151]. Насамрэч, як сцвярджаюць гістарычныя крыніцы, Усяслаў княжыў у Полацку 57 гадоў з перапынкамі.

Думкамі пра дынаміку гістарычнага працэсу быў прасякнуты верш Ластоўскага «Дума на Полацкім замчышчы» (1923): «Цьмы-цьмоў і процьмы лет // на гэтым капішчы канодным, // складалі Дзеве чэсць.// Дзевін зваўся грод, // і Дзевіна рака ў стоп яго ручэла, // бажніца Дзеве ў чэсць // на сонцы дахам снела, // здобячы сабой накоп. // У бажніцы ж, перад Дзевы стодам, // хадзілі дзевы карагодам // ў кудзебны тан. // Святарны хор пявежнай мовай // магутаў племені ўслаўляў. // Збіраліся старцы тут // на раду й суд» [2, с. 208]. Аднак «лад пітомны // разбурыў крыжа знак», месца язычніцкіх багоў занялі хрысціянскія: «у почце грэчаскіх святых // засела Софас, // мясцовую сабой // змяняючы Паладу» [2, с. 208]. Пасля няўдалай спробы звярнуць увагу еўрапейскіх палітыкаў на лёс Беларусі на Генуэзскай канферэнцыі В. Ластоўскі напісаў верш «Генуэзскі рынак» (1923), у якім абвінаваціў еўрапейскіх палітыкаў у пастаянным патуранні рабству. У ліку першых рабоў, з працы якіх квітнела Генуя, ён назваў гордых жыхароў Полацка, некалі заваяваных князем Уладзімірам. Першым у беларускай

літаратуры Ластоўскі характарызаваў старажытны горад праз выдатных асветнікаў Еўфрасінню Полацкую і Францыска Скарыну. Драматычны абразок «Адзінокі» (1923) меў падзагаловак «Эпізод з жыцця Францішка Скарыны». Аўтар згадваў у ім пра віленскія старонкі жыцця першадрукара, акцэнтаваў духоўнае адзіноцтва чалавека высокіх памкненняў у асяроддзі прагматыкаў і ваяўнічых невукаў.

Кульмінацыйным момантам у стварэнні Ластоўскім вобраза Полаччыны аповесць з метафарычнай назвай «Лабірынты» (1923), дзе ўслаўляўся «сівагорбы Полацак». Самы старажытны беларускі горад прадставаў таямнічым месцам, у якім для апавядальніка час спыніўся, а для іншых людзей доўжыўся натуральна. Характэрна, што апавядальнік па сюжэце твора прыязджае з Вільні як адраджэнскага цэнтра ў праслаўлены перыяду Сярэднявечча горад, які быў некалі цэнтрам аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель і актыўнага супраціву знешнім ворагам. Сімволіка сюжэтнай лініі ў аповесці надзвычай празрыстая: беларускае адраджэнне павінна грунтавацца на трывалай аснове гістарычнага досведу і асвеце. Полацкая інтэлігенцыя, прадстаўленая настаўніцтвам, чынавенствам, дваранствам і месцічамі, па-свойму захоўвае гістарычную памяць. Археолаг-аматар Іван Іванавіч узначальваў гурток прыхільнікаў даўніны – «Археалагічную вольную контрфратэрнію». Мінулае Полацка натхніла абруселага немца-чыноўніка збіраць матэрыялы па гісторыі краю. Акалічны памешчык цікавіўся дэманалогіяй, хоць яго бацька сябраваў з манахамі-васільянамі. Мешчанін Грыгор Н., маўклівы старац па мянушцы «Падземны чалавек», захапляўся легендамі пра падземныя хады і схаваныя там дзівы. Мясцовы настаўнік цікавіўся старажытнай язычніцкай культурай. Дзейнасць «Археалагічнай вольнай контрфратэрніі» спрыяла захаванню гістарычнай памяці. Падземны чалавек нагадваў пра Богінскае возера, пра паўвостраў Богіна са знакамітымі некалі бажніцамі. Возера і паўвостраў – сведчанне старадаўнасці горада: «У канцы возера ідуць валатоўкі бронзавага веку, на пяшчыстым урочышчы» [2, с. 52]. Ластоўскі першым у беларускай літаратуры напісаў пра полацкую бібліятэку і яе загадкавы лёс. Пафас «Лабірынтаў» зводзіўся да сцвярджэння паўнавартаснасці і старадаўнасці беларускай культуры, складанасці шляхоў нацыянальнай самасвядомасці.

Увагу пісьменніка прываблівалі таксама мястэчкі і вёскі. У апавяданні «Каменная труна» (1917) ішла размова пра старадаўні артэфакт, што знаходзіўся «непадалёк ад места Дзісны, з правай стараны тракту, што ідзе з Дзісны на Германавічы» [2, с. 103]», падкрэсліваліся старадаўнія карані мясцовай знаці (продкі Няміры «далёка славіліся між ворагаў», прымалі ўдзел у паходах легендарнага князя Алега) і вылучаліся жорсткасцю ў сямейным побыце. У «Старасельскім могільніку» (1924) успаміналася, што на старых могілках на берагах Дзісны шмат «памятак» даўніны, што курганы-валатоўкі ёсць напамін пра радавод крывічоў ад волатаў. У прыпавесці «Смерд і ваявода» Віцебск і Орша прадставалі значнымі гандлёвымі гарадамі.

Вацлаў Ластоўскі на пачатку XX ст. закладваў асновы эстэтычнага ўвасаблення прыдзвінскага краю ў беларускай літаратуры: акцэнтацыя ўвагі на мінулым, кантраснае супастаўленне слаўнага мінулага і бязрадаснай сучаснасці, артыкуляцыя старадаўнасці беларускай зямлі. Пры гэтым ён выказваў свае грамадскія і асобасна-патрыятычныя прыярытэты, разуменне гістарычнага працэсу, асноватворнай ролі гістарычнай памяці для жыццёвых перспектыў асобнага чалавека і для народа.

ЛІТАРАТУРА

1. **Казбярук, У. М.** Рамантычны пошук : назіранні над беларус. рамантызмам пач. XX ст. / У. М. Казбярук. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 183 с.

2. **Ластоўскі, В.** Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997. – 512 с.

Генкин В.М. *(г. Витебск)*

ОЙКОНИМИЯ ВИТЕБЩИНЫ КАК ИСТОЧНИК СВЕДЕНИЙ ПО ИСТОРИИ РЕГИОНА

Термином *ойконимия* (от греч. *oikos* – дом, жилище + *onym* – имя) в современной ономастике обозначают совокупность *ойконимов* – названий населенных пунктов. Ойконимия каждого региона формируется на протяжении длительного периода и несет в себе уникальную лингвокультурологическую, географическую и историческую информацию, причем нередко эти сведения находятся на имплицитном, скрытом уровне, а их «расшифровка» требует особого исследовательского внимания.

С точки зрения этимологии и словообразования ойконимы достаточно разнородны. Значительная их часть образована от антропонимов (имен, фамилий, прозвищ людей); во многих топонимах отражены особенности ландшафта, растительности и других природных факторов. Но особенно следует выделить несколько групп названий, которые, по нашему мнению, являются носителями информации, наиболее важной именно с исторической точки зрения. Это ойконимы, в чьих основах отражены сведения о:

1) занятиях и укладе жизни населения;

2) его этническом составе;

3) отношении к религии (конфессии).

Ойконимы первой группы (характеризующие занятия и уклад жизни) на Витебщине не только широко распространены, но и весьма разнообразны, что свидетельствует в том числе и о высокой степени развития ремесел в регионе. Согласно историческим источникам уже к середине XVI в. здесь

фиксировалось не менее 40 ремесленных профессий. Их распространению способствовало, в частности, получение городами привилегий, освобождавших вновь прибывших на жительство от налогов и повинностей на 10 лет. В 1523 г. такое право получил Полоцк, а в 1531 – Витебск. Проведенная в 1557 г. земельная реформа, известная как «Устава на волоки», также оказала влияние на данный процесс: она поощряла проживание ремесленников при замках и дворцах и запрещала их использование на других работах. Изданный в 1596 г. королем Сигизмундом III Вазой указ освобождал ювелиров, портных, резчиков, гончаров, столяров и других ремесленников от замковой повинности. В XVII в. отмечалось значительное увеличение как числа лиц, живущих за счет ремесленной деятельности, так и количества самих ремесел, становившихся все более дифференцированными.

В численном отношении среди группы «профессиональных» ойконимов преобладают названия, связанные с профессией кузнеца (белорусское название «каваль»). Сегодня названия 33 населенных пунктов Витебской области прямо или косвенно указывают на нее: *Ковалевичи, Ковалёво* (5)*, Ковалевцы, Ковалевщина* (7)*, Ковалёнки, Ковали* (8)*, Ковалишки* (2)*, Ковальки* (3), *Кузнецовка*, *Кузнецово*, *Великая Ковалевщина*, *Малая Ковалевщина*. Этот количественный показатель говорит о повсеместной востребованности кузнечного ремесла. Вторую позицию занимают ойконимы, указывающие на занятия рыбака и косаря (по 7 населенных пунктов): *Рыбаки* (5 населенных пунктов), *Рыбалтово*, *Рыбачки*; *Косарево* (2), *Косаревщина*, *Косари* (2), *Косарёво*, *Косачи*.

На сегодня сохранились 6 населенных пунктов с названиями, указывающими на профессию рудника (*Рудаки* (3), *Рудаково* (2), *Рудники*) и по 4, чьи наименования связаны с занятиями бондаря (*Бондарево, Бондаревщина*, *Бондари*, *Бондарцы*), гончара (*Гончарово* (3), *Гончаровка*) и лесника (*Лесниково* (2), *Лесники* (2)).

Другие ремесла в ойконимии региона представлены еще меньшим числом названий. Так, например, три деревни носят название *Колесники* (колесник – мастер, изготовлявший колеса), две – *Санники* (санник – мастер по изготовлению саней). Говоря о численности тех или иных типов ойконимов, следует, естественно, принимать во внимание факт значительного уменьшения количества населенных пунктов в регионе: «В 1968 г. из 29 342 населенных пунктов Беларуси на долю Витебской области приходилось 9007. На 1 января 1977 г. область имела 7785 поселений» [1, с. 5]. К началу XXI в. эта цифра сократилась еще более чем на 1200 единиц. Тем не менее, как уже отмечалось, ойконимы данной группы весьма разнообразны. В них отражены такие виды занятий, как (приводим в алфавитном порядке) берник *(Берники)*, бортник (*Бортники* – 3 населенных пункта), войт *(Войты)*, дегтярь *(Дегтярёво, Дегтяры)*, дровосек *(Дровосеки)*, дударь *(Дударево, Дудари)*, жебентяй, задачей которого было обеспечение двора топливом и ос-

вещением *(Жебентяи)*, железник, занимавшийся выплавкой железа из руды *(Железняки)*, жерносек, который высекал жернова *(Жерносеки)*, кожемяка *(Кожемяки)*, коновал *(Коновалово, Коноваловщина, Коновалы)*, конюх *(Конюхово)*, кравец – мастер портняжного дела (*Кравцы*), круподёр *(Круподёры)*, кухарь *(Кухарёнки)*, кушнер – скорняк *(Кушнеровщина)*, ловец *(Ловцы)*, лопатник *(Лопатники)*, мельник, перевозчик *(Перевозники)*, пивовар *(Пивовары)*, писарь *(Писарево, Писарщина)*, православный или католический священнослужитель *(Попово, Поповка, Поповцы, Капланы)*, пушкарь *(Пушкари, Пушкаришки)*, сальник *(Сальники)*, сокольник, ухаживавший за ловчими птицами и принимавший участие в соколиной охоте *(Сокольники)*, судник, занимавшийся изготовлением деревянной посуды *(Судники)*, токарь *(Токарево)*, шубник *(Шубники)*, щитник *(Щитники)*.

В ойконимии региона отражены не только профессии, но и названия мест производства. Наиболее типичными для Витебщины являются ойконимы: *Буда* (4) – предприятие, занимавшееся добычей дегтя, смолы, выжиганием поташа, угля; *Гута* (3) – стекольное или металлургическое предприятие; *Поташня* (6) – предприятие по производству поташа, который изготавливался из золы растений и употреблялся в стекольном производстве, мыловарении и др.; *Рудница* (3), *Рудня* (8) – небольшое предприятие, занимавшееся производством железа из руды.

Следует также выделить ойконимы, связанные с названиями лиц по сословным признакам, воинским званиям и т. п.: *Боярово*, *Боярунишки*, *Боярщина* (3), *Бояры* (10), *Казаки* (3), *Казаково* (3), *Казачки*, *Капитаново*, *Княжино*, *Княжица*, *Княжицы*, *Князёво*, *Князи*, *Маёровщина* и др.

Национальный состав населения отражен, в первую очередь, в этнотопонимах, которые составляют важную часть топонимической системы Витебщины. Они несут информацию как о существующих, так и о ранее существовавших этносах. Ойконимы *Видзишки*, *Видзы*, *Видзы-Ловчинские* (три деревни расположены в Браславском районе), *Видзиничи* (Толочинский район) мотивированы лексемой *видзы*, которой обозначали жителей исторической области северной Латвии – Видземе. Вообще близость к Прибалтике, тесные контакты между белорусами, латышами и литовцами привели к распространению балтских элементов в ойконимии региона и формированию ряда этнотопонимов: *Латыгово* (4), *Латыголичи*, *Латыголь* (2), *Латышёво* (3), *Латыши* (5), *Латышки* (2), *Латышонки*, *Литовцы*, *Литовчики, Литовщина, Литовщина*.

На выходцев из Польши указывают основы ойконимов: *Ляхи* (2), *Ляховичи*, *Ляховка* (2), *Ляхово* (2), *Ляховщина*, *Мазурино* (5), *Мазурка*, *Мазурово*, *Мазуры*, *Полячки*.

Северо-западные районы Витебской области являются местом концентрации этнотопонимов, отражающих названия русского населения: *Москалевщина*, *Москалёнки* (2), *Москаленята*, *Москалишки*, *Московская Гора*,

Русаки (3), *Русины*, *Руски* (2), *Русский Заулок, Русское Село.* С учетом расположения населенных пунктов можно говорить о том, что данные наименования выполняют дифференцирующую функцию не только по этническому, но и по конфессиональному признаку: названия *русские* и *москали* используется еще и как обозначения православного населения, находящегося в преимущественно католическом окружении. Как отмечает автор большого исследования, посвященного этнотопонимии Беларуси, А. Ф. Рогалев, «собственно русских, в том числе и старообрядцев, которые проживали в Беларуси в XVII–XVIII вв., местное население называло *маскалямі*, *маскавітамі*, *масквічамі* и – реже – *рускімі* (этноним *маскалі* фиксируется с XVI в., когда стало очевидным, рельефным и государственно-политическое, и языковое, и этническое размежевание восточнославянского, русского в своих истоках населения Московской и Литовской Руси») [2, с. 21].

Другие названия этнического характера встречаются на территории региона значительно реже: *Гудово Земянское*, *Новое Гудово*, *Немцево*, *Прусиничи*, *Прусы*, *Татарские*, *Татары*, *Шведы* (2).

Гораздо сложнее установить религиозно-конфессиональные особенности населения, отраженные в ойконимии. Главная сложность состоит в том, что на территории региона доминирующими являются две христианские конфессии – православие и католицизм, для которых характерен во многом общий именник. Попутно заметим, что именно антропонимы послужили основой для формирования многих ойконимов. При этом лишь относительно небольшая часть имен может рассматриваться как конфессионально маркированная. Это позволяет выделить названия населенных пунктов, мотивированных такими сугубо католическими именами, как Альбин *(Альбиновка, Альбиновщина)*, Альбрехт *(Альбрехтово)*, Барбара *(Бабарино, Барбаришки)*, Вацлав *(Вацлавово)*, Винцент *(Винцентово)*, Герман *(Германовичи)*, Казимир *(Казимерцы, Казимирово)*, Мартин *(Мартиновцы, Мартинилевичи)*, Марьян или Марьяна *(Марьянполье)*. С другой стороны, к православным именам восходят ойконимы *Абрамово* (от Авраамий, Абрамий, Абрам), *Гавриловцы* (от Гавриил, Гаврила) и некоторые другие.

Как было отмечено выше, для рассмотрения выбирались группы географических названий, являющихся наиболее яркими носителями исторических сведений. Естественно, что и другие типы ойконимов способны послужить источником изучения истории и культуры любого региона.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Рапановіч, Я. Н.** Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці / Я. Н. Рапановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 504 с.

2. **Рогалев, А. Ф.** Этнотопонимия Беларуси (на фоне этнической истории) / А. Ф. Рогалев. – Гомель, 1993. – 168 с.

Горохова В.Ю. *(г. Витебск)*

ЖАНР СКАЗКИ В ПОЛЬСКОМ ФОЛЬКЛОРЕ

Сказка – один из самых древних жанров народного творчества, который берет свое начало в мифах и легендах народов мира. Именно сказка всегда была средством обучения ребенка в семье правилам жизни. Она передает и колоссальный опыт народа, накопленный за века его развития и становления. Выделяют сказки о животных, волшебные и бытовые. Сказки о животных (животный эпос) отличаются тем, что в роли главных героев там выступают звери, птицы, рыбы, а также растения и явления природы. В таких произведениях человек либо играет второстепенную роль, либо занимает положение, равноценное животному. Подобных сказок в польском фольклоре большинство, чаще всего в них доминируют *волки* («Баран и волк», «Как пес волку сапоги справил», «Волк и баран», «Почему заяц мяса не ест» и т. д.), которые характеризуются как глупые, прожорливые и коварные хищники. В сказке «Не колет, не стреляет – а дух вышибает» волк противопоставляется другим животным, видится как зверь «битый», который «стал хитрить, зубы заговаривать» [3, с. 22]. Ловко поступает он и в сказке «Волк и баран», где наказывает глупого барана за его доброту и наивность. Польская сказка «Есть ли справедливость на свете» показывает, что добро наказуемо, ведь в ней лис наказан не только за свою хитрость, но и за пособничество куда более коварному мужику. *Лис* в сказках встречается не менее часто («Кот и курица», «Как улитка с лисом состязалась», «Почему заяц мяса не ест»), в них он описывается как зверь корыстливый, жадный, хитрый, но очень глупый – так, лисят выманивает из норы с помощью дудочки кот, а улитке удается провести лиса, который задумал с ней состязаться в беге. Часто в польских сказках встречаются домашние животные, которые постоянно находятся с человеком рядом, – это и овцы, и кони, и собаки, и коты, и петухи с курами.

Из диких животных в сказках фигурируют медведи, которые олицетворяют собой природную разрушительную силу, мощные кабаны, трусливые зайцы, иногда встречаются и львы, которые пользуются авторитетом у остальных обитателей звериного царства. Нередко польская сказочная традиция предпринимает попытку выяснить причины вражды тех или иных животных между собой, их необычное поведение или даже окраску. Например, в сказках «Сова и ястреб» народная смекалка объясняет нежелание совы летать днем тем, что некогда ястреб обозвал ее детушек уродливыми; в сказке «Как пес волку сапоги справил» вражда собаки и кота поясняется тем, что кот не сумел сберечь от мышей ценный документ, «вот с того-то времени и злится пес на кота. Как только кота увидит, так за ним в погоню: зачем допустил, чтобы мыши собачью правду съели? А кот на мышей сердит: где ни увидит мышь – цап! – и нет ее. Так и повелось: пес кота терпеть не может,

кот – мышей, а волк – пса» [3, с. 13]. В сказке «Сельдь и камбала» народное сознание обнаруживает взаимосвязь между поведением сельди в конфликте с камбалой и нынешним ее главенством в водах Балтийского моря, камбала в этом случае «навсегда осталась в своем фартуке с перекошенным от зависти ртом» [3, с. 18]. Животной сказке нередко присущ шутливый конец, который являет собой неожиданное разрешение конфликта. В сказке «Кот и курица» кот, который устал спасать свою подружку от коварной лисы, увидел, что лиса курочку зажарила, «заплакал <…>, совсем расстроился и сам ее съел, чтобы добро не пропадало» [3, с. 14]. Следует заметить, что часто животные появляются и в волшебных сказках. Во многих из них фигурируют волки, львы, змеи, утки, которые помогают главному герою в его свершениях или же являются обращенными в животных людьми. Нередко в сказках зачарованные девицы появляются в виде уток («Королева из яичка», «Благодарная змея»), лебедей («Про Аргелюса») и даже золотой рыбки («Золотая рыбка»). Не менее значительна в волшебной сказке *ипостась волка*: здесь он обладает такими же качествами, которые описаны в животных сказках, но в волшебной он часто помогает главному герою, а иной раз и вершит правосудие. Так, в сказке «Про птицу с золотыми крыльями» глупому сыну короля пособничает волк. О нем известно, что это дедушка королевского сына, который, помогая внуку, пытается искупить свои грехи, совершенные в мирской жизни. В сказке «Про лесного хозяина, бондаря и хромого волка» карлик наказывает волкам, чтобы те творили благие дела: «Ты, Косой, беги в ту сторону <…> и растерзай кабана, что с ночи у мужика картофельное поле разоряет. Ты, Лохматый, придуши бедняжку косулю, которая лежит под папоротниками в буковом лесу: когда она ела клевер, ее змея ужалила. Суровость моя вам, ведома, но зачем же зверю напрасные муки?..» [3, с. 34].

Часто в волшебной сказке встречается *образ горы*. Она характеризуется такими эпитетами как «высокая», «стеклянная» («О стеклянной горе», «Великаны и храбрый пастушок», «Как муж отыскал пропавшую жену»), «крутая, скользкая» («О стеклянной горе»), «большая» («Как старый кузнец смерть и чертей за нос водил»), «волшебная, высоченная» («Волшебная гора»). «Гора в мифологическом космогоническом контексте оказывается синонимична понятию ось мира, <…> именно на возвышениях (холм, гора, самое высокое место на равнине) строились древние славянские города, а также святыни языческих культов и потом святыни христианские – костелы, монастыри, часовни» [2]. В славянской мифологии горе отводится особое место, так как она, подобно мировому дереву, соединяет «верх» и «низ», мир мертвых и мир живых, небо и землю. Зачастую, поднявшись на ее вершину, главный герой обнаруживает там сокровища («Волшебная гора»), пленницу («О стеклянной горе», «Великаны и храбрый пастушок», «Про молодого мясника, который одним волом четырех зверей накормил»), иногда восхождение необходимо для перехода к следующему испытанию, иной раз именно на горе ты можешь

узнать ответы на интересующие тебя вопросы («Отчего Вильчеку не везло в хозяйстве»). В рамках образа горы значима присущая сказочной традиции любой страны мира троекратность осуществляемого действия, обретения, находки, достижения цели. Например, в сказке «Великаны и храбрый пастушок» во время первого испытания у Павлуши кафтан из серебряной парчи, а у его коня, когда тот впервые вскакивает на стеклянную гору, серебряная сбруя, узда и чепрак; во время второго подъема на гору на Павлуше надет кафтан из парчи золотой, а во время третьего нарядили его в кафтан, «…алмазами изукрашенный. Конь под ним масти каштановой, весь алмазами убран…» [3, с. 243]. В этом случае и дворец, и замок, и терем являются в языке фольклора символами, сходными по своей смысловой наполненности с архетипическим образом горы, которая, в свою очередь, становится прототипом лестницы в небо. Также в сказках горы могут быть маркером польской действительности: нередко они носят имена собственные, которые соотносятся с реальными (Карпаты, Татры). В сказке «Золотая девочка» именно с Карпатскими горами, возвращением на родину ассоциируется понятие воли.

Не менее значителен в польской волшебной сказке *образ золотой яблони*. Она в мифологии многих народов служит символом оседлости, достатка, мира. Яблоко рассматривается в данном контексте как плод древа жизни, то есть образ яблони, равно как и образ волшебной горы, соотносится у славян с мировым древом, так называемой осью мира. Такая яблоня встречается в большинстве волшебных сказок («Золотая девочка», «Про Аргелюса», «Про птицу с золотыми перьями», «О стеклянной горе»). Чаще всего этот образ характеризуется такими эпитетами как «золотая», «дивная», «развесистая». Практически во всех сказках, где такая яблоня упоминается, с утра она цветет золотыми цветами, а вечером плодоносит золотыми яблоками. Они обычно обладают волшебными целебными свойствами, называются молодильными. Например, «…такие яблоки, от которых люди сразу выздоравливают, это и есть самая чудесная вещь на свете» [3, с. 118] или «этими яблоками какую угодно хворь можно вылечить» [3, с. 48].

Как одну из особенностей, в волшебной сказке можно выделить присутствие *религиозных христианских мотивов*. Многие произведения описывают Пекло и Рай («Про батрака и волшебную скрипочку», «Как кузнец в рай попал»), отражают веру людей в бога и дьявола. В этой связи интересна сказка «Про дьявола и господа бога», в которой народ пытается анекдотически переосмыслить роль божественных и козни дьявольских сил в жизни людей. Отношение к богу и дьяволу, незримое их присутствие в языке народа можно проследить по таким речевым оборотам как «силен черт», «…поздняя женитьба – дьяволу потеха», «бог – свидетель», «упаси тебя бог», «давай бог ноги», «бог дал», «велел господь-бог», «бог послал» и т. п.

Нередко в сказках описывается таинство крещения («Ведьминский шабаш», «Кума-смерть», «Анушка – золотая коса»), исповеди («Мясо, хлеб да

вино – и все даром», «Ведьминский шабаш»), брака («Как нищий стал королем»). Однако следует отметить, что польский черт очень сильно отличается от русского беса, равно как черт, изображаемый католической церковью, совсем не похож на обитающего в сознании людей. В сказках дьявол описывается как «глупый», «побитый», «неудачник», «хромой». Отношение народа к нему иллюстрируют такие ироничные и стилистически сниженные выражения: «уволок», «забился», «черта всего скрючило», «…как он той палкой черта по заду хрястнул, черт света не взвидел», (черти) «уселись», «…с голодухи, как щепки, высохли», «взвыли» и т. п. В польском фольклоре дьявол оказывается глупее среднего крестьянина. Так, в сказке «Мазур черта хитрее» мужик обманул дьявола, когда заключил с ним договор о продаже души за деньги, но с тем условием, что отдаст ее, когда все зеленые листья с деревьев опадут. Когда же черт пришел по душу крестьянина, тот показал бесу вечнозеленую сосну и посмеялся над ним. Одно только название этой сказки говорит о том, что нечистый, который должен пленять и похищать человеческие души, со своей задачей не справляется. Попытки одурачить черта выявляются и в распространенном сюжете легенды о пане Твардовском, однако тому обмануть дьявола так и не удалось.

Есть в польском фольклоре произведения, в которых нечистая сила творит благие дела. Например, в сказке «О Добродневском» именно нечисть восстанавливает справедливость, наказывая злых и одаривая счастливой жизнью людей добрых. В сказке «Дар черного лешего» Водяной отчитывает Лешего за то, что тот украл краюху хлеба у бедняка, тем самым заступаясь за несправедливо обиженных. Желание восстановить справедливость не менее редко встречается в бытовой сказке, где часто обнаруживается мотив победы слабого над сильным и, что характерно, бедного над богатым. Зачастую в бытовой сказке именно народная предприимчивость, смекалка и хитрость помогают бедным или нищим справиться с нуждой. Так, в сказке «Как мужичок Бурачок пана в дураках оставил» народ в финальных ее строках выносит вердикт: «Куда там глупому пану с нашим мужичком Бурачком умом тягаться!» [1]. Польская бытовая сказка иронична и язвительна, она проникнута ненавистью народа к эксплуататорам, желанием восстановить справедливость. Однако стоит отметить, что в подобных произведениях тот самый мужичок может поступиться нормами морали не только по отношению к панам, но и к себе подобным.

Также в польской сказке довольно ярко отразилась народная привычка к труду, ответственное отношение поляков к работе. Например, в сказке «Великаны и храбрый пастушок» Павлуша переживает из-за убитых овец, которых ему было поручено пасти, а не о богатствах, которые ему неожиданно достались. Нередко разного рода социальные мотивы и детали, присущие бытовой сказке, попадают в сказку волшебную. К примеру, в волшебных сказках характерно смешиваются персонажи высокого социального положе-

ния – князья, короли – с героями-простолюдинами – пастухами, мельниками, кузнецами, рыбаками. Этот факт говорит об условности деления сказок только на животные, волшебные и бытовые, предполагает более широкую их классификацию.

Польскую фольклорную сказку от других отличает то, что в ней очень часто встречаются имена собственные, обозначающие названия польских городов (Варшава, Краков, Кельце, Олькуш), архитектурных объектов (Вавель, Мариацкая башня), есть и лексемы, отражающие реалии польской действительности разных эпох (вельможный пан, грамота, подати, воевода, грош, ксендз и т. п.). Также в ней обнаруживается склонность к числам и формулам, нередко встречаются числа 3, 6, 7, 12.

Исходя из всего вышесказанного, можно сделать вывод о том, что польская сказка, несмотря на то, что похожа на сказки других славянских народов, все-таки имеет свои отличительные черты, по-своему интерпретирует используемые мотивы, образы и сюжеты. В ней отразились народные представления о мире и месте человека в нем, добре и зле, социальной справедливости. Именно эти выраженные в польских сказочных сюжетах надежды, мечты и чаяния роднят польские сказки со сказками всех народов мира.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Как** мужичок Бурачок пана в дураках оставил [Электронный ресурс] // Традиция : Русская энциклопедия. – Режим доступа: http://traditio.wiki/Как_мужичок_Бурачок_пана_в_дураках_оставил. – Дата доступа: 07.11.2016.

2. **Семантика** горы в польской народной сказке и лингвокультурологический контекст европейского фольклора // Cyberleninka : научная электронная библиотека [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://cyberleninka.ru/article/n/semantika-gory-v-polskoy-narodnoy-skazke-i-lingvokulturologicheskiy-kontekst-evropeyskogo-folklora. – Дата доступа: 07.11.2016.

3. **Щербакова, А.** Польские народные сказки / А. Щербакова, Я. Мацюсович. – Ленинград : Худож. лит., 1980. – 328 с.

Лещинский М.А. *(г. Витебск)*

АЛЕКСАНДР СЕРГЕЕВИЧ ПУШКИН И АЛЕКСАНДР ИВАНОВИЧ КАЗАРСКИЙ

Парадоксально, но и спустя два столетия от начала творчества А.С. Пушкина выявляются все новые и пока малоизученные области и сферы его деятельности. У поэта было много точек соприкосновения с местами, которые относятся к современной Беларуси, с нашими этническими земляками. Писал ли он что-либо о наших предках, этнических витебских земляках? Как

белорусские темы и сюжеты отразились в творчестве поэта, что пишут об этом белорусские исследователи? Публикаций, дающих ответы на эти вопросы, немного, они разрознены, мнения их авторов расходятся. Некоторые из них увязывают творчество Пушкина с белорусами, упоминая только о местах следования поэта в южную ссылку в мае 1820 г. и обратно в 1824 г. Другие пишут только о проживавших в белорусских городах потомках этого известного рода, а также объектах, носящих имя поэта в Беларуси. Третьи, ближе подойдя к теме, даже указывают Павла Островского, обедневшего минского дворянина, сидевшего в витебском остроге, как прототип Дубровского – главного героя одноименного романа, что на наш взгляд бездоказательно.

Странно, что, изучая прототипы вымышленных героев в творческом наследии гения, многие исследователи не заметили нашего реального. Некоторые из них все же упоминали как бы, между прочим о том, что Пушкин писал что-то об известном офицере – моряке А. Казарском из местечка Дубровно. Не акцентировано внимание и на том, что в графике и письмах поэта, не вошедших в печатные издания, первым изображенным белорусом был наш земляк. Сравнительно недавно были выявлены наброски записей и черновиков поэта, его переписка, касающиеся интересующей нас темы. Они позволяют привести в докладе малоизвестные, но весьма любопытные свидетельства знакомства А.С. Пушкина и А.И. Казарского, их общения и, как следствие, отражения этого в творческом наследии гения.

А.С. Пушкин зачастую использовал графику. Отождествление изображенных поэтом персонажей и атрибутация его рисунков (пиктограмм) ведутся до сих пор. Первым из белорусов, изображенным А.С. Пушкиным на групповом портрете (Дадатак 6, мал. 2), а затем еще на двух стал наш земляк, до того малоизвестный моряк А. Казарский, будущий национальный герой России и Беларуси. Его же изображение найдено и в набросках черновиков романа «Евгений Онегин». Большинство портретных изображений – это современники поэта и, как на указанном рисунке, он сам среди них (в центре). Пушкин отмечал, что в большинстве случаев появление рисунков у него связано с неоконченным стихотворением. Когда не шла рифма, не давался эпитет, не находилось продолжение, возникали раздумья, как начать, тогда возникшая заминка разрешалась рисунком. Долгое время рисунок профиля Казарского не был отождествлен и атрибутирован. Вначале его относили к циклу графики поэта, объединенному в тему «Декабристы», без персонификации изображенных (А. Эфрос «Декабристы в рисунках Пушкина»), для чего были некоторые основания.

Когда и где Александр Пушкин и Александр Казарский, кстати, почти одногодки (1799 и 1798 г. р.), могли познакомиться? По заключению А.И. Золотухина, председателя Николаевского Пушкинского клуба, это произошло еще в 1823 г. во время его южной – одесской, а затем кишиневской – ссылки

поэта, когда Казарский не был известен. Будучи капитаном катера «Сокол», он чаще других офицеров-моряков плавал в то время в Одессу, посещал с другими офицерами негласно действовавший вокруг семейства братьев Далей и их матери литературный кружок в Николаеве, участники которого высоко ценили творчество Пушкина. Здесь и произошло знакомство Казарского с поэтом, ибо есть много свидетельств тому, что Пушкин весьма часто уклонялся от жандармской опеки, появлялся в «недозволенных» местах, «пропадал» на кораблях Черноморского флота, иногда и выпивал с моряками, и ночевал у них – вел «рассеянный образ жизни», как тогда выражались. Находясь под впечатлением от тех встреч, поэт запечатлел Казарского на своем групповом рисунке вместе с Карлом Далем (братом В.И. Даля), Фурнье, Сильво и поэтом-моряком Ефимом Зайцевским под неусыпным оком императора Александра I, изображенном вверху. Рисунок относится именно к данному периоду, он атрибутирован, его персонажи отождествлены. Над рисунком сделана латинская надпись «Q, F, D, S, Z.» – по заглавным буквам фамилий персонажей. Точная атрибутация Казарского на рисунке увязана с реальными персонами и их связями, а заключение основано на тщательно проведенном исследовании А.И. Золотухина, опубликованном в его книге «Пушкин и Николаевский край» (Николаев, 2001). Повторяет атрибуцию, а также добавляет новые аргументы и систематизирует имеющиеся сведения контр-адмирал Г.Н. Антонов в книге «Морские рисунки в графике Пушкина» (Санкт-Петербург, 2010). Нами было проведено самостоятельное исследование архивных документов в Николаеве, Санкт-Петербурге, Севастополе, Феодосии («Общий морской список», «Формулярный список о службе и достоинстве А.И. Казарского», шканечные журналы и др.), которое подтвердило имеющуюся информацию.

Помимо вышеупомянутого рисунка Пушкина были найдены еще два изображения профиля Казарского, один из них выполнен почти в одно и то же время, что и групповой (Дадатак 6, мал. 3). Данный рисунок первоначально был атрибутирован как безымянный «мужской профиль». Недавно выяснилось, что он нарисован в «Рабочих тетрадях Пушкина» и второй масонской тетради, на черновом листе, относящемуся к роману «Евгений Онегин», среди изображений других офицеров-моряков. Можно предположить, что Казарский был одним из прототипов в этом романе, однако прямых доказательств этому пока не найдено. Что касается места и времени появления рисунка, то пушкинистами он отнесен к периоду пребывания поэта в Одессе и датируется 1824 г. К сожалению, обоими авторами допущена ошибка – неверно указано звание Казарского в 1824 г.: звание «капитан-лейтенант» он получил только в 1828 г. Судя по архивным материалам, в годы ссылки Пушкина Казарский крейсировал по Черному морю не только на катере «Сокол», но и на других судах, бывал в разных городах и портах. Там, вероятно, и произошла их первая встреча.

Следующее интересующее нас изображение (Дадатак 6, мал. 4) первоначально также не было атрибутировано, но впоследствии – с подачи Т.Г. Цявловской (Москва, 1986) – оно уже фигурировало под названием «Молодой военный». Только после 2010 г. этот безымянный профиль стал связываться с именем Казарского. Нами сравнение рисунка на тождество производилось с литографическим портретом Казарского 1830 г., когда он, выйдя в отставку и получив звания капитана I ранга и флигель-адьютанта императора, переехал в Санкт-Петербург и вошел в свиту Николая I. Портрет был признан «схожим» с обликом самого героя, как утверждала в 1830 г. газета «Северная пчела», одна из ведущих и самых читаемых тогда в России. Извещая читателей о продаже портрета Казарского в книжной лавке Глазунова под № 25, газета писала: «Отцы и наставники: указывайте детям на портреты славных мужей своего Отечества и повторяйте повествования об их подвигах! Таким образом посевайте в душе семена величия, которые со временем приносят плоды. Цена портрета 2 рубля 40 копеек, с пересылкою 3 рубля. Относиться должно к управляющему лавкою Ивану Лисенкову. Портрет схож и хорошо отделан». Впоследствии об этом писал и В. Малышев, автор книги «Жизнеописания русских военных деятелей». Внешняя схожесть профилей на рисунках с портретом Казарского действительно имеется, впрочем, как и с его горельефами на памятниках в Севастополе (А.П. Брюллова) и Николаеве. Их подобие изучали и специалисты Следственного комитета Республики Беларусь, куда мы обращались за помощью в экспертизе на тождество. Несмотря на то, что официального заключения они не дали, схожесть отрицать не стали.

Какую же роль отводил Казарскому в своем литературном творчестве Пушкин, остается загадкой. Сопоставляя все то, что открылось в пушкинских связях с декабристами и масонами, можно прийти к выводу, что рукописи, наброски произведения (произведений) о Казарском, если они и существовали, постигла та же участь многих тетрадей поэта, которые были вынужденно уничтожены им после раскрывшегося заговора в декабре 1825 г. Об этом свидетельствует и запись, сделанная Пушкиным в 1830 г. в «Родословной Пушкиных и Ганнибалов»: «В конце 1825 г. при открытии несчастного заговора, я принужден был сжечь свои тетради, которые могли замешать имена многих, а может быть и умножить число жертв. Не могу не сожалеть о их потере: я в них говорил о людях, которые после сделались историческими лицами, с откровенностью дружбы или короткого знакомства».

Что касается других упоминаний Пушкина о Казарском, то следует вспомнить краткую, но емкую и точную по содержанию оценку, которую гениальный поэт дал нашему земляку: «…блистательный Казарский». Эти слова были обнаружены в неопубликованных ранее черновиках писем поэта: «Сегодня двору был представлен блистательный Казарский». Ниже находим загадочную фразу: «Держава в державе». Известно, что это была более позд-

няя оценка А.И. Казарского (не ранее 1830 г.). Что хотел сказать этой фразой великий русский поэт, так и не смогли расшифровать пушкинисты, но сама оценка нашего земляка весьма лестная.

Поэт-партизан, герой войны 1812 г. Д.В. Давыдов в стихотворении, посвященном поэту-моряку Зайцевскому, воспевает и Казарского, еще при жизни называя его «живой Леонид», сравнивая тем самым с царем древней Спарты. Восторженно приветствуя в послании за «два лавра», завоеванные бесстрашным Зайцевским, на военном и поэтическом поприщах, Давыдов призывает его мужаться (в связи с тяжелым ранением) и взять третий лавр, где его поджидает на пир славы Казарский: «Мужайся! – Казарский, живой Леонид, /Ждёт друга на новый пир славы.../ О, будьте вы оба Отечества щит. Перун вековечной Державы!». Послание Д.В. Давыдова было им передано для печатания в «Литературную газету». Но тут произошло досадное недоразумение, если его можно назвать недоразумением: цензура не дозволила печатать послание, не содержащее ничего крамольного, а наоборот, просто дышащее любовью к Отечеству, восторгом и гордостью за своих сыновей-героев. Цензору показалось подозрительным то, что состоявший в генеральском чине Д.В. Давыдов «в нарушение субординации дерзнул восторженно приветствовать» «каких-то» скромных чинов, капитан-лейтенантов, назвав их щитом Отечества, Перунами державы, и даже не упоминает «Его, Государя». Это было воспринято как посягательство на святое – на «Государя», попытка отнять у него «Единственного» право быть «Защитником», «щитом Отечества», «Перуном Державы». Так рассуждал цензор Щеглов.

Обоих героев А.С. Пушкин знал лично. Пророчески предвосхищая будущую оценку подвига Казарского, «чей высокий лик в грядущем поколенье поэта приведет в восторг и умиленье», он вмешался в издание стихотворного послания Д.В. Давыдова. В его письме от 4 февраля 1830 г., оформленном от имени издателей «Литературной газеты» на имя К.М. Бороздина, содержится просьба: «…дать другого менее своенравного цензора…» Бороздин был попечителем Санкт-Петербургского учебного округа, а по должности еще и председателем Санкт-Петербургского цензорного комитета. Пушкин писал ему: «Давыдов в одном послании Зайцевскому и Казарскому говорит: “о будьте вы оба Отечества щит, / Перун вековечной Державы” Цензор усомнился, можно ли допустить называть таковым образом двух капитан-лейтенантов и вымарал приветствие не по чину». Этот случай приводится поэтом как «один из тысячи примеров». Послание Давыдова все же было опубликовано в № 9 «Литературной газеты» от 10 февраля 1830 г.

Еще одно свидетельство, подтверждающее интерес Пушкина к фигуре Казарского, стало известно после изучения неопубликованной ранее переписки Александра Сергеевича с поэтом, прозаиком и литературным критиком П.А. Вяземским. Первоначально она была ошибочно отнесена к переписке последнего с И.С. Тургеневым, но совсем недавно ошибка была выявлена.

Выяснилось, что по настоятельному совету Пушкина Вяземский встретился с Казарским, что подтверждается ответным письмом поэта-критика и его оценкой героя: «Я ознакомился с Казарским: одна идея живая посреди мертвых вещей. По крайней мере знаешь, что значит слово: Казарский». В своей работе «Неопубликованные письма П.А. Вяземского к Пушкину» по поводу этого высказывания исследователь В.Б. Сандомирская резонно заключает: «Вяземский не был поклонником исключительно воинской доблести, и самые выражения, в которых он передает свое впечатление от знакомства с Казарским, говорят, прежде всего, об его обаянии живого человека, а не о его славе. Но слова его приобретают особенное звучание благодаря содержащемуся в них противопоставлению: "…одна идея живая посреди мертвых вещей", которым подытоживаются впечатления Вяземского от пребывания в Москве Николая I».

Приведенные письма, рисунки, наброски и отклики Пушкина – первое упоминание поэта о конкретном, невымышленном белорусе А.И. Казарском. Они не утрачивают своего значения и сегодня, так как отражают разнообразие творчества, интересов, тем общения и дискуссий поэта, влияние их на тогдашнюю литературную жизнь. Гениальность А.С. Пушкина всемирно признана, а потому мы можем и должны гордиться тем, что наш земляк оказался увиденным, запечатленным в графике, черновиках и письмах, хоть и не отраженным в его известных произведениях. Что же касается значения творчества поэта, то для нас, белорусов, это связующее, объединительное звено, это то, что многие поколения белорусов и россиян пронесли и еще пронесут с собой по жизни.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Анненков, Т. В.** Материалы для биографии А. С. Пушкина / Т. В. Анненков. – Москва : Современник, 1984. – 467 с. – (Библиотека «Любителям российской словесности». Из литературного наследия).

2. **Антонов, Г. Н.** Морские рисунки в графике Пушкина / Г. Н. Антонов. – Санкт-Петербург : Сад искусств, 2010. – 120 с.

3. **Антонов, Г. Н.** Пушкин и флот / Г. Н. Антонов. – Санкт-Петербург, 2006. – 272 с. : ил.

4. **Вяземский, П. А.** Сочинения : в 2 т. / П. А. Вяземский. – Москва : Худож. лит., 1982. – Т. 1 : Стихотворения. – 462 с.

5. **Вяземский, П. А.** Сочинения : в 2 т. / П. А. Вяземский. – Москва : Худож. лит., 1982. – Т. 2 : Литературно-критические статьи. – 383 с.

6. **Друзья** Пушкина : переписка, воспоминания, дневники : в 2 т. / сост. В. В. Кунин. – Москва : Правда, 1986. – Т. 1. – 632 с.

7. **Друзья** Пушкина : переписка, воспоминания, дневники : в 2 т. / сост. В. В. Кунин. – Москва : Правда, 1986. – Т. 2. – 637, [2] с.

8. **Золотухин, А. И.** А. С. Пушкин и Николаевский край / А. И. Золотухин. – Николаев : Возможности Киммерии, 2001. – 140 с. : ил.

9. **Кисаров, И. В.** Казарский : память его из рода в род на вечные времена / И. В. Кисаров. – Николаев : Изд-во Ирины Гудым, 2009. – 288 с. : ил.

10. **Российский** государственный архив Военно-Морского Флота (РГА ВМФ). – Фонд 5.

11. **РГА ВМФ.** – Фонд 8.

12. **РГА ВМФ.** – Фонд 19.

13. **РГА ВМФ.** – Фонд 33.

14. **РГА ВМФ.** – Фонд 158.

15. **РГА ВМФ.** – Фонд 161.

16. **РГА ВМФ.** – Фонд 203.

17. **РГА ВМФ.** – Фонд 205.

18. **РГА ВМФ.** – Фонд 243.

19. **РГА ВМФ.** – Фонд 248.

20. **РГА ВМФ.** Формулярный список о Службе и Достоинстве Гвардейского Экипажа Фл. Адъ-та Его Императ. Вел-ва Кап. 2-го ранга Ал-ра Иванова Казарского. Генваря 1 дня 1830 Года.

21. **Северная** пчела. – 1830. – Февраль.

22. **Цявловская, Т. Г.** Рисунки Пушкина / Т. Г. Цявловская. – 4-е изд. – Москва : Искусство, 1986. – 44 с.

23. **Эфрос, А. М.** Декабристы в рисунках Пушкина / А. М. Эфрос // Литературное наследство. – 1834. – № 16/18.

Лісаў А.Г. *(г. Віцебск)*

ВІЦЕБСКІ «МАЛАДНЯК» У ЗБОРНІКУ «ПАЧАТАК» (ДА 90-годдзя ПЕРШАГА БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНАГА АЛЬМАНАХА Ў ВІЦЕБСКУ)

Віцебская філія беларускага літаратурнага аб’яднання «Маладняк» была ўтворана на ўстаноўчым сходзе 18 лістапада 1924 г. Ініцыятарамі яе арганізацыі з’яўляліся Алесь Дудар, Мікалай Каспяровіч, Язэп Мазуркевіч, Алесь Сянкевіч, Язэп Варпаховіч. Усе яны былі прадстаўнікамі нацыянальнай інтэлігенцыі, накіраванымі ў Віцебск для ўмацавання справы беларусізацыі ва ўсходніх рэгіёнах рэспублікі, далучаных да БССР у выніку яе ўзбуйнення. Віцебская філія не мела дастаткова моцных кадраў прафесійных літаратараў, практычна адсутнічаў мясцовы беларускамоўны друк. Арганізацыя стваралася з аўтараў-пачаткоўцаў. Тым не менш намаганнямі спачатку А. Дудара і М. Каспяровіча, а пазней Я. Мазуркевіча да лета 1926 г. філія складалася ўжо з 25 сяброў. Толькі асобныя з іх мелі пэўны вопыт літаратурнай дзейнасці. На працягу наступнага года гэтая колькасць паменшылася да 10 найбольш падрыхтаваных і таленавітых. У 1926–1927 гг. пры філіі была арганізавана

студыя «для разгляду фармальна-мастацкага боку ўласнай творчасці» літаратараў-пачаткоўцаў [4, с. 6]. Менш падрыхтаваныя ўдзельнікі філіі пераведзены ў лік студыйцаў. Беларускі літаратурны рух у Віцебскай акрузе аб'яднаў да гэтага часу больш за 100 чалавек у асноўным вучнёўскай моладзі. Былі арганізаваны шэсць гурткоў, з якіх тры – у горадзе і тры – у акрузе. Асабліва актыўнай з'яўлялася праца гурткоў у спецыяльных навучальных установах Віцебска – мастацкім, педагагічным і электрамеханічным тэхнікумах. У мастацкім тэхнікуме справа ладзілася намаганнямі М. Каспяровіча, у педагагічным пад кіраўніцтвам Я. Мазуркевіча.

Сярод кірункаў дзейнасці віцебскай філіі «Маладняка» вялікае месца займала выдавецкая справа. Значную ролю ў арганізацыі і стымуляванні мясцовага літаратурнага руху мела выданне першага літаратурнага зборніка віцебскай арганізацыі – альманаха «Пачатак». Ён быў выдадзены даволі вялікім накладам (1600 экзэмпляраў) у выдавецтве мясцовай газеты «Зара Захаду». Укладальнікам і рэдактарам выдання быў Я. Мазуркевіч, які ўзначаліў літаратурную арганізацыю пасля ад'езду з Віцебска спачатку А. Дудара, а потым М. Каспяровіча.

Я. Мазуркевіч быў адным з 11 прадстаўленых на старонках альманаха аўтараў і аўтарам уступнага артыкула «Віцебская філія "Маладняка"». Прадмовы (дзве) напісаны ад імя партыйнага кіраўніцтва. У першай адзначана, што зборнік – першы вопыт літаратурнай працы віцебскіх творцаў на беларускай мове. У тэксце ад імя сакратара Віцебскага акруговага камітэта ЛКСМБ Пыканава, датаваным 21 снежня 1926 г., падкрэслена, што «выпуск зборніка для Віцебшчыны з'яўляецца… новым дасягненнем у справе культурнага будаўніцтва і нацыянальнай палітыкі» [4, с. 3]. Аўтар прадмовы пераконвае, што «у такім невялічкім гарадку (як Віцебск – *Аўт.*) мець літаратурнае аб'яднанне і выдаваць яго творы» магчыма толькі пры савецкай уладзе. «Задача маладняка тварыць пралетарскую культуру, якая дапамагае ўзмацненню дыктатуры пралетар'яту» [4, с. 3–4], і адразу дадае, што «гэта патрабуе ад маладняка стройнай пралетарскай ідэолёгіі» [4, с. 3–4]. Ва ўступным артыкуле Мазуркевіч адгукаецца на гэтую заяву: «Сваю творчасць, нацыянальную па форме, мы стараемся зрабіць пралетарскай па зместу, па ідэолёгіі» [4, с. 6]. Як бачна, падкрэсленне нацыянальнай формы ў гэты час яшчэ адпавядае дырэктыўнам патрабаванням партыйных устаноў. І такімі дэкларацыямі маладнякоўцы падкрэсліваюць сваю рэвалюцыйнасць. Я. Мазуркевіч невыпадкова выбірае ў якасці эпіграфа для свайго артыкула ў зборніку радкі з верша А. Дудара «Мы дзеці рэвалюцыі / – Кастрычніка сыны, – / У дні радасці кіпучае / На свет з'явіліс мы». У зборніку вызначана галоўная задача аб'яднання: "Маладняк" павінен выхаваць сваіх сяброў у разуменні пралетарскай дыктатуры» [4, с. 1]. Не пройдзе і трох гадоў, як гэта дыктатура пачне знішчаць сваіх сыноў як носьбітаў варожай нацдэмаўскай ідэалогіі – усё ў адпаведнасці з вядомым выказваннем дзеяча французскай

рэвалюцыі Жоржа Дантона: «Рэвалюцыя, як бог Сатурн паглынае сваіх дзяцей». У 1937 г. былі расстраляны ўкладальнік зборніка Я. Мазуркевіч і аўтар афармлення вокладкі, у 1926 г. яшчэ студэнт Віцебскага мастацкага тэхнікума Раман Семашкевіч. Для той самай моладзі, якая пачынала сваю літаратурную дзейнасць на старонках выдання, 1930-я гг. зрабіліся балючым урокам.

Зборнік «Пачатак» аб'ядноўвае творы 11 аўтараў, неаднолькавых па літаратурным вопыце. На вялікі жаль, сёння мы можам гаварыць толькі пра палову (пяцярых з іх), імёны якіх не згубіліся ў гістарычным часе, захаваліся ў гісторыі літаратурнай творчасці, сферы літаратуры, навукі і адукацыі. Пра астатніх яшчэ трэба шукаць звесткі. Тыя біяграфічныя даведкі, якія змешчаны ў зборніку, – зусім невялікая таму дапамога.

Самымі вядомымі маладнякоўцамі з альманаха «Пачатак» Я. Мазуркевіч і А. Моркаўка. Празаік, крытык і краязнавец Іосіф Ігнатавіч Мазуркевіч друкаваўся ў зборніку пад уласным імем, а таксама пад псеўданімам Я. Цікавы. У выданні змешчаны два яго празаічныя творы, пад псеўданімам – драматычны эцюд «Камсамолка Галя». Звесткі пра Я. Мазуркевіча змешчаны ў біябібліяграфічным даведніку «Беларускія пісьменнікі» і шэрагу энцыклапедычных выданняў і слоўнікаў. Артыкул для даведніка «Беларускія пісьменнікі» зрабіў віцебскі філолаг М.Л. Зуеў [1]. Я. Мазуркевіч нарадзіўся ў 1887 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні ў сям'і лесніка. Ранняя біяграфія яго звязана са шматлікімі пераменамі месца жыхарства ў Беларусі, эвакуацыяй у перыяд Першай сусветнай вайны ў Саратаўскую губерню. У час гэтых вандровак здолеў набыць адукацыю школьнага настаўніка, працаваў у Навагрудскім павеце на тэрыторыі, захопленай палякамі, трапіў у турму ў 1921 г., з якой збег на тэрыторыю савецкай Беларусі. У 1924 г. у адзін час з А. Дударам Я. Мазуркевіч скончыў у Мінску вышэйшыя курсы беларусазнаўства і быў накіраваны ў Віцебск. Тут прайшлі ўсе астатнія 13 год яго жыцця. Мазуркевіч выкладаў у савпартшколе, на вячэрнім рабфаку, у сярэдніх школах горада і пэўны час працаваў у мясцовым краязнаўчым музеі. Друкавацца пачаў у 1922 г., а ў 1924 г. першыя яго творы з'явіліся на старонках часопіса «Полымя». У кіраванні віцебскай філіяй Я. Мазуркевіч прыняў эстафету ад А. Дудара і М. Каспяровіча. Але і побач з імі ён быў даволі актыўным арганізатарам спраў аддзялення. У 1925 г. накіраваны дэлегатам 1-га Усебеларускага з'езда «Маладняка». Пасля выхаду ў свет альманаха «Пачатак» Мазуркевіч спрыяў выданню другога віцебскага зборніка маладнякоўцаў – «Світанне» – 1927 г. [8], а таксама зборніка, які быў надрукаваны ў Віцебску ўжо ў 1930 г. пад эгідай Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП). Арганізацыя была ўтворана пасля самаліквідацыі «Маладняка». Апошні зборнік меў назву «Рытмы будавання» [7]. Дарэчы, і ў мясцовай арганізацыі БелАПП Мазуркевіч працягваў актыўную працу, удзельнічаў у 1-м З'ездзе БелАПП і 1-м Усесаюзным з'ездзе пралетар-

скіх пісьменнікаў у Маскве. Абодва з'езды адбыліся ў 1928 г. У зборніку «Світанне» апублікаваны два яго празаічныя творы, і чатыры – у зборніку «Рытмы будавання». Мазуркевіч друкаваўся ў перыядычных выданнях як літаратурны крытык. Ён рабіў агляды дзейнасці «Маладняка» ў Віцебску на старонках газеты «Зара Захаду».

У № 4 часопіса «Маладняк» за 1929 г. змешчаны аглядавы артыкул «Літаратурны рух на Віцебшчыне» [2]. У гэтым артыкуле Мазуркевіч вызначыў тры этапы развіцця мясцовай літаратурнай творчасці. Першы этап (перадрэвалюцыйны) і другі (паслярэвалюцыйны і да 1924 г.) ахарактарызаваны адсутнасцю ў Віцебску сталай беларускай літаратурнай плыні і беларускамоўных выданняў. Пашырэнне беларускай культуры, уплыву беларускасці на літаратурную сферу ён звязвае галоўным чынам з утварэннем віцебскай філіі аб'яднання «Маладняк» і выданнем на той час двух зборнікаў – «Пачатак» і «Світанне». Галоўнымі задачамі працы аб'яднання ва ўмовах адсутнасці творчых сіл Мазуркевіч лічыць «паказ жывога чалавека», сапраўднага жыцця і вырашэнне праблемы ўдасканалення тэхнікі вершавання [2, с. 98].

Яшчэ адным з аўтараў зборніка «Пачатак», які меў некаторы літаратурны вопыт да ўдзелу ў віцебскім выданні, быў Аркадзь Андрэевіч Моркаўка, 1900 года нараджэння, з сялян Чэрвеньшчыны. Для яго паэтычная творчасць усё жыццё з'яўлялася захапленнем і не стала прафесійным заняткам. У 1916 г. скончыў курсы тэлеграфістаў, у 1924–1927 гг. быў навучэнцам Віцебскага электрамеханічнага тэхнікума, а ў 1930-я гг. студэнтам энергетычнага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута. Будучы інжынер у 1923 г. пачаў друкавацца ў часопісе «Полымя». Першыя яго публікацыі з «Полымя» – вершы «Крык вуліцы» і «Сцены» – разам з іншымі творамі надрукаваны і ў зборніку «Пачатак». 24 вершы А. Моркаўкі – найбольш прадстаўнічая частка паэзіі зборніка. Напрыканцы 1920-х і ў пачатку 1930-х гг. ён вельмі актыўна друкаваўся, быў членам рэдкалегіі часопісаў «Маладняк» і «Полымя». У 1928 г. выдаў уласны зборнік «Дым жыцця», што застаўся адзінай прыжыццёвай кнігай аўтара. У аглядзе, які зрабіў Я. Мазуркевіч у артыкуле «Пралетарская літаратура ў Віцебску» [3], творчасць паэта адзначана асабліва. З 1930-х гг. А. Моркаўка адышоў ад публічных выступленняў і друкавання твораў.

Яшчэ адным прадстаўніком гуртка Віцебскага электрамеханічнага тэхнікума, тры вершы якога былі надрукаваны ў зборніку, быў У. Кавалёў. Біяграфічныя звесткі пра яго ў даведцы вельмі сціслыя: вядома, што ён нарадзіўся ў в. Дабрамыслі. Напэўна, маецца на ўвазе вёска Аршанскага павета (зараз Лёзненскі раён), але ў даведцы гэта не ўдакладняецца. Трэба заўважыць, што населеныя пункты з такой назвай ёсць і ў іншых раёнах, напрыклад Чашніцкім. У. Кавалёў скончыў сямігодку. Як склаўся лёс маладога дэбютанта пасля «Пачатку» невядома.

Найбольш прадстаўнічым з'яўляецца аўтарства гурткоўцаў – выпускнікоў і навучэнцаў Віцебскага педагагічнага тэхнікума. Звесткі пра іх таксама вельмі кароткія. Сярод гэтых аўтараў – выпускнік тэхнікума, настаўнік Бабруйскага раёна А. Жукоўскі, які паходзіў з Гродзеншчыны; настаўнік вёскі Мяжа, таксама выпускнік тэхнікума А. Катановіч, пра якога паведамляецца, што ён паходзіць з Аршанскага павета; настаўнік і сын настаўнікаў С. Бакарэвіч; настаўнік Віцебскай акругі Янка Сівак, які скончыў педагагічны тэхнікум у 1926 г.; вучаніца тэхнікума 1904 года нараджэння Мялешкіна. Для ўсіх іх зборнік быў першым вопытам друкавання паэтычных твораў. Да прозвішча Мялешкінай мы зараз не можам нават далучыць ініцыял імя. У даведцы вызначана толькі яе паходжанне з Аршаншчыны, год нараджэння і статус вучаніцы педагагічнага тэхнікума на момант выдання зборніка.

У ліку самых маладых удзельнікаў альманаха трэба назваць вучняў сярэдніх школ Віцебска – Браніслава Люгоўскага і Ганны Базыленка (абодва 1908 года нараджэння). У кароткай даведцы ў зборніку пра Люгоўскага паведамляецца толькі тое, што ён вучань 5-й віцебскай школы-сямігодкі. Пра яго вядома няшмат: паходзіў з Віцебшчыны, з сялянскай сям'і, вучыўся ў Віцебску, працаваў токарам на віцебскім заводзе «Чырвоны металіст». Два вершы ў зборніку «Пачатак» – першая публікацыя. Друкаваўся таксама ў газетах «Зара Захаду» («Віцебскі пралетарый»), «Чырвоная змена». У другім зборніку віцебскага «Маладняка» – «Світанне» – змешчаны яшчэ чатыры яго творы паэзіі, а ў зборніку «Рытмы будавання» – найбольш значны твор – паэма «На рыштаванні». Пра гэтага аўтара пісалі ў сваіх аглядах літаратуры Віцебска Я. Мазуркевіч [3] і С. Раскін [6]. Апошні раз у друку імя Б. Люгоўскага ўзгадваецца ў 1940 г., і далейшы лёс яго невядомы.

Ганна Мартынаўна Базыленка, як і Б. Люгоўскі, была навучэнкай віцебскай школы. Нарадзілася ў сялянскай сям'і ў в. Арахі Аршанскага павета (зараз г. п. Арэхаўск). Яе раннія творы – пошук свайго слова ў розных літаратурных жанрах – паэзіі, прозе, драматургіі. Першыя публікацыі – у зборніках «Пачатак» і «Світанне». У шэрагу выпадкаў аўтар скарыстоўвае псеўданім Ганна Арахоўская. Г. Базыленка скончыла ў 1931 г. філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). Усё жыццё займалася навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. Яе даследаванні марфалогіі беларускай мовы можна лічыць працягам той работы, якую ў юнацкія гады ў Віцебску вяла разам з іншымі вучнямі пад кіраўніцтвам Мікалая Каспяровіча. На чале з ім быў складзены і выдадзены ў 1927 г. «Віцебскі краёвы слоўнік».

У 1930-я гг. пасля заканчэння БДУ Г. Базыленка працавала ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР, пасля Вялікай Айчыннай вайны абараніла дысертацыю, была выкладчыкам, дацэнтам, намеснікам дэкана філалагічнага факультэта БДУ. Прымала ўдзел у складанні слоўнікаў,

напісала шэраг манаграфій і падручнікаў. У 1962 г. з яе ўдзелам была выдадзена акадэмічная «Граматыка беларускай мовы». Вядомы беларускі мовазнаўца Г.М. Базыленка памерла ў 1980 г. Віцебскія зборнікі былі для яе пачаткам літаратурнай дзейнасці.

Вельмі складана і супярэчліва склаўся лёс яшчэ аднаго аўтара «Пачатку» – Зміцера Максімавіча Жыткевіча. Ён нарадзіўся ў 1904 г. у в. Халамер'е Гарадоцкага павета ў сям'і царкоўнага служачага. Зразумела, паходжанне сваё ў савецкі час замоўчваў. Застаўшыся без бацькоў у раннім узросце, выхоўваўся ў дзядзькі, настаўніка Халамерскай прыходскай школы, які вельмі паўплываў на пляменніка. Зміцер рана пачаў імкнуцца да навучання, скончыў усё тую ж Халамерскую школу, яшчэ падлеткам працаваў у валасной управе. Страціўшы родных у час Першай сусветнай вайны, разам з сястрой выхоўваўся ў дзіцячым доме. З 1921 г. у 17-гадовым узросце пачаў самастойна працаваць справаводам, карэспандэнтам газеты.

Першыя мастацкія творы З. Жыткевіча былі надрукаваны ў 1924 г. у «Віцебскай сялянскай газеце». У час, калі пачынала дзейнасць у Віцебскай акрузе філія «Маладняка», ён працаваў загадчыкам Езярышчанскага народнага дома, у якім спрабаваў наладзіць працу літаратурнага гуртка. У 1926–1931 гг. ён быў сакратаром газет «Віцебская сялянская газета» і «Віцебскі пралетарый» Віцебскага аддзялення БелАПП. У зборніку «Пачатак» надрукаваны два вершы Жыткевіча, у зборніках «Світанне» і «Рытмы будавання» – пяць і сем вершаваных твораў адпаведна. У «Світанні» некалькі яго вершаў падпісаны псеўданімам З. Гушчар. Пра З. Жыткевіча піша ў сваім нарысе пра віцебскіх пісьменнікаў Я. Мазуркевіч [3].

Пасля 1933 г. лёс З.М. Жыткевіча зрабіў рэзкі паварот. Член партыі, з адукацыяй і жыццёвым вопытам, ён быў прызваны на службу ў органы НКУС, у якіх праслужыў 22 гады да самай смерці ў 1955 г. У самыя горшыя часы, калі рэпрэсіравана была нацыянальная інтэлігенцыя – учарашнія аднадумцы з кола літаратараў, апынуўся ў лагеры знішчальнікаў. Біяграфіі З.М. Жыткевіча прысвечаны артыкул М.Х. Плавінскага [5].

Разгортванне школьнай адукацыі, краязнаўчай і літаратурнай працы ў Віцебску ў 1920-я гг. адыграла прынцыповую ролю ў справе ўкаранення нацыянальнай культуры ў грамадстве. Выданне першага віцебскага беларускага літаратурнага альманаха «Пачатак» спрыяла аб'яднанню намаганняў у той час даволі нешматлікай беларускай творчай інтэлігенцыі, школьнай і студэнцкай моладзі ў справе распаўсюджання нацыянальнай культурнай спадчыны. «Пачатак» быў неабходнай пляцоўкай для маладых літаратараў, якія патрабавалі свайго месца ў рэвалюцыйных культурных пераўтварэннях і павінны былі не забыцца пра традыцыю, былі вымушаны лічыцца з нарастаннем ідэалагічнага прэсінгу. Час «Пачатку» – гэта яшчэ час супадзення памкненняў нацыянальнай інтэлігенцыі і дзяржаўнай палітыкі. Ва ўмовах рэгіёна яно дало значныя творчыя з'явы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Беларускія** пісьменнікі : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. / рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.

2. **Мазуркевіч, Я.** Літаратурны рух на Віцебшчыне / Я. Мазуркевіч // Маладняк. – 1929. – № 4. – С. 93–98.

3. **Мазуркевіч, Я.** Пралетарская літаратура ў Віцебску / Я. Мазуркевіч // Віцебскі пралетарый. – 1930. – 8 лістап.

4. **Пачатак** : зб. Віцеб. філіі «Маладняка» / пад рэд. Я. І. Мазуркевіча. – Віцебск : Выд-ва «Зара Захаду», 1926. – 166 с.

5. **Плавінскі, М. Х.** Пяром і зброяй / М. Х. Плавінскі // Віцебскі рабочы. – 1984. – 7 лістап.

6. **Раскін, С.** Віцебскія пісьменнікі / С. Раскін // Віцебскі пралетарый. – 1937. – 12 крас.

7. **Рытмы** будавання : трэці літ.-маст. зб. Віцеб. філіі беларус. асац. пралетар. пісьменнікаў / пад рэд. Я. І. Мазуркевіча. – Віцебск : Выд. Віцебскай філіі «БелАПП», 1930. – 303 с.

8. **Світанне** : літ. зб. Віцеб. філіі «Маладняка» / пад рэд. Я. І. Мазуркевіча. – Віцебск : Выд. Віцебскай філіі «Маладняка», 1927.

Мясаедава С.М. *(г. Віцебск)*

«ЯЎРЭЙСКІ ДАЛЬ» ЗАЛМАН ХРАПКОЎСКІ

Уладзімір Іванавіч Даль набыў сусветную вядомасць дзякуючы складанню неверагоднага па аб'ёме «Тлумачальнага слоўніка жывой велікарускай мовы». На яго стварэнне ён выдаткаваў 53 гады свайго жыцця.

Залману Ісакавічу Храпкоўскаму адмераны быў усяго 41 год, каля паловы з якіх ён прысвяціў збіранню яўрэйскага фальклору, за што яшчэ пры жыцці некаторыя называлі яго «яўрэйскім Далем», лічылі калекцыю скарбам яўрэйскай літаратуры. Апошнія гады З. Храпкоўскі працаваў загадчыкам Аршанскага дзяржаўнага рабочага факультэта, увесь вольны час прысвячаў сістэматызацыі сабраных ім больш за 20 тыс. выразаў, прыказак і прымавак, больш 2 тыс. анекдотаў «з жывой яўрэйскай мовы». Памёр заўчасна, 14 жніўня 1924 г. [13], трапіўшы па неасцярожнасці пад вагон трамвая падчас службовай камандзіроўкі ў Маскву [1]. Храпкоўскі быў таленавітым педагогам, усебакова развітым чалавекам, цудоўным арганізатарам, аратарам, «рэдкіх душэўных якасцяў, рэдкай душэўнай чысціні чалавек» [13].

Згодна з аўтабіяграфіяй, нарадзіўся З.І. Храпкоўскі 31 снежня 1882 г. у г. Гарадок Віцебскай губерні (па некаторых дадзеных – у мястэчку Капыль на Міншчыне) [8] у патрыярхальнай яўрэйскай сям'і. Дзед з бацькоўскага боку быў дробным гандляром, бацька – бухгалтарам, маці – хатняй гаспадыняй. З дзяцінства хлопчык ацэньваў свае здольнасці як выдатныя, аднак у сям'і быў адмоўны погляд на агульную адукацыю [10]. Бацькі хацелі зрабіць з яго рабіна, таму старанна выхоўвалі ў яўрэйскім традыцыйным хедары. Плаціць за навучанне бацьку было цяжка, «але ў славу боскую ён з грахом напалову плату ўносіў». Употай ад бацькоў хлопчык самастойна вывучаў агульнаадукацыйныя прадметы, у прыватнасці, рускую мову, арыфметыку, многа чытаў свецкай літаратуры, паступова «рабіўся апікайрэсам», бязбожнікам. «Зловяць, бывала, за такім чытаннем – і даставалася мне!» – успамінаў З. Храпкоўскі [2].

На 16-м годзе жыцця З. Храпкоўскі паступіў у яўрэйскае народнае вучылішча, праз 3,5 гады скончыў і яго, і двухкласнае гарадское вучылішча. З класа ў клас пераходзіў з узнагародамі першай ступені, аднак за няплату яго перыядычна выключалі, так што Храпкоўскаму прыходзілася збіраць грошы і паступаць ізноў... «Тады ж вырашыўся і лёс маёй прафесіі: я выбраў народнае настаўніцтва». Працаваў спачатку ў мястэчку Лёзна Магілёўскай губерні, але быў адхілены ад пасады і больш за 2 гады не мог уладкавацца на работу [10].

І вось Залман Ісакавіч пераязджае ў губернскі горад Віцебск, паступае на працу ў талмуд-тору, пра работу дзе ён адгукаўся наступным чынам: «У талмуд-тору пайшоў я, можна сказаць, на подзвіг, бо ўмовы работы там былі прама пякельныя…» [2], бо тут «вучылася самая заўзятая бяднота» [10]. Заняткі працягваліся з 9 да 16 гадзін, у склад групы ўваходзіла 75 чалавек. Адначасова Храпкоўскі быў актыўным удзельнікам многіх грамадскіх аб'яднанняў Віцебска [4]. «Гэта былі адзіныя шчыліны, адзіныя форткі, праз якія можна было ў той змрочны час захоўваць сувязь з масамі і падтрымліваць у іх іскру людскасці» – успамінаў ён [10].

Па прычыне вайны ў 1916 г. З. Храпкоўскі пераехаў у Рыбінск Яраслаўскай губерні. Працаваў у маскоўскім саюзе спажывецкага таварыства, на млыне братоў Сібіравых, прымаў удзел у арганізацыі прафсаюза кручнікаў [10].

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. паўстала пытанне аб уступленні ў партыю бальшавікоў. Залман Ісакавіч доўга разважаў, супастаўляў плюсы і мінусы. Ён заўважаў няўдалыя прызначэнні на працу, выступаў катэгарычна супраць пакарання смерцю, але ўступіў у РКП(б) таму, што лічыў «патрэбным быць удзельнікам рэвалюцыйных працэсаў». У партыю яго прынялі без кандыдацкага стажу [15].

З.І. Храпкоўскі актыўна працаваў у аддзеле народнай адукацыі Віцебскага губвыканкама (губана): спачатку кіраваў дашкольным, школьным пададдзеламі [6], са снежня 1919 г. сумяшчаў пасады [6; 16], з 1920 г. узначаліў

губана. Ён уваходзіў у склад Віцебскага губернскага лектарскага бюро пры прафсаюзе працаўнікоў асветы і сацыялістычнай культуры (чытаў лекцыі па прыродазнаўстве). Па словах сучаснікаў, карыстаўся бязмежнай папулярнасцю сярод моладзі, працоўных, чырвонаармейцаў, мясцовага настаўніцтва; яго добра ведалі па шматлікіх выступах на сходах, адзначалі яго гумар. Як загадчык Віцебскага губана Храпкоўскі спрыяў выратаванню архіва Віцебскага губвыканкама, які знішчаўся «на паперу» [7, арк. 89]. Залман Ісакавіч прымаў удзел у рабоце камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, прапаноўваў арганізаваць музеі дапаможнікаў, мастацкай [прамысловасці], узнімаў пытанне выратавання мастацкіх каштоўнасцей з маёнтка Мазалава [14].

У 1922 г. Храпкоўскі здаў справы зноў прызначанай загадчыкам Віцебскага губана Сары Ізраілеўне Шэйдлінай [7, арк. 156], а сам са студзеня таго ж году атрымаў пасаду загадчыка Аршанскага дзяржаўнага рабочага факультэта [17].

Як і раней, Залман Ісакавіч карыстаўся павагай сярод большасці калег і рабфакаўцаў, аднак былі ва ўзаемаадносінах і цяжкасці: «ненармальныя адносіны» з прафсаюзным камітэтам [11, арк. 48], нічым не абгрунтаванае ганенне з боку некаторых выкладчыкаў [3].

Залман Ісакавіч паступова ўсё менш увагі надаваў партыйнай і грамадскай працы, больш займаўся разборам і сістэматызацыяй калекцыі фальклорнага матэрыялу. У 1922 г. ён выпусціў у Віцебску невялікую кніжку «Вайсковы жарт», якая ўключала легенды, анекдоты, прыказкі і прымаўкі, галаваломкі, каламбуры і падобныя творы, якія тычыліся ў большай ступені Першай сусветнай вайны 1914–1918 гг. У прадмове да кнігі Храпкоўскі паведамляў, што ўсё гэта ён асабіста сабраў падчас экспедыцый па Віцебскім краі, з-за чаго падборцы ўласцівы некаторы «правінцыйны каларыт» [8].

Таварышы заўважалі абыякавасць Храпкоўскага да партыйнай работы. На пасяджэннях Аршанскага павятовага камітэта РКП(б) гучала крытыка ў яго адрас: яго называлі няважным работнікам як бальшавіка, малаактыўным, цяжкім на ўздым, казалі, што ён амаль не цікавіцца партыйнай працай, на пасяджэнні часта не прысутнічае, а калі з'яўляецца, то часам нават спіць. Іншыя адзначалі, што Храпкоўскі – значная навуковая сіла, як член партыі паводзіць сябе як належыць, мяшчанства за ім не назіраецца, а сон выкліканы тытунёвым дымам. Але на агульным пасяджэнні ячэйкі РКП(б) Дома Саветаў ад 24 красавіка 1924 г. т. Храпкоўскі з членаў павятовага камітэта РКП(б) быў пераведзены ў кандыдаты [18].

У гэты час у мэтах вычышчэння партыі ад сацыяльна чужых і іншых элементаў у СССР пачалася праверка асабовага складу ўстаноў, арганізацый, прадпрыемстваў. Пачатак кампаніі ў БССР быў запланаваны на 1–5 чэрвеня 1924 г. з разлікам скончыць праверку праз месяц. Закрануў працэс і Аршанскі дзяржаўны рабочы факультэт [19]. Вынікам мерапрыемстваў магло стаць адлічэнне з факультэта.

Падчас падрыхтоўчага да чысткі этапу некаторыя калегі ўказалі на мяккі характар Залмана Ісакавіча, з-за якога «не прайшла» чыстка ў 1923 г. Храпкоўскі ж сцвярджаў, што нельга быць мяккім з класавымі ворагамі, якіх, па яго словах, вельмі мала. Ён лічыў, што неабходны індывідуальны падыход да кожнага таварыша, што партыйцы не павінны карыстацца прывілеямі. «Рабіць выключэнне камуністам, а працоўнаму з недастатковым стажам не рабіць, так няможна» [11, арк. 49 адв. – 50, 54, 61]. Дзякуючы такой пазіцыі Залмана Ісакавіча многія рабфакаўцы засталіся ў гэтай навучальнай установе.

Пасля ліквідацыі Віцебскай губерні і арганізацыі акругаў у 1924 г. З.І. Храпкоўскі быў прымацаваны да другой групы работнікаў акруговага маштабу і такім чынам узняўся да загадчыка акруговага аддзела народнай адукацыі. Камісія па перападліку адказных працаўнікоў губернскага, павятовага і валаснога маштабу Аршанскай павятова-гарадской арганізацыі ад 23 ліпеня 1924 г. адзначала, што таварыш Храпкоўскі мае вялікі лектарскі стаж і здольнасці да гэтай працы [17].

14 жніўня 1924 г. падчас службовай паездкі ў Маскву Залман Ісакавіч Храпкоўскі трагічна загінуў пад коламі маскоўскага трамвая. Засталася сям'я: маці Хана Залманаўна (інвалід), сёстры Рахіль і Лея, браты Зіскін, Ханон.

25 жніўня 1924 г. адбыўся агульны сход ячэйкі КП(б)Б Аршанскага рабфака, на якім была арганізавана камісія ў складзе трох чалавек па ўшанаванні памяці Залмана Ісакавіча [12]. Пахаваны ён на Ваганькаўскіх могілках, дзе ўсталяваны помнік ад аршанскіх акружкама КП(б)Б, рабфака і родных.

Загадчык Віцебскага акруговага аддзела народнай адукацыі таварыш Рубін у верасні 1924 г. звярнуўся ў Народны камісарыят асветы БССР з просьбай узбудзіць хадайніцтва перад Народным камісарыятам сацыяльнага забеспячэння БССР аб прызначэнні сям'і таварыша Храпкоўскага персанальнай пенсіі за заслугі апошняга перад краінай. У лісце ўздымалася пытанне і далейшага лёсу калекцыі. Рубін адзначаў, што дзейнасць Залмана Ісакавіча не абмяжоўвалася толькі педагагічнай работай, ён быў вядомым у літаратурным свеце збіральнікам яўрэйскага фальклору. Адна частка працы была даведзена да канца і магла быць надрукавана, іншыя ж, з прычыны заўчаснай смерці яе стваральніка, мела патрэбу ў апрацоўцы акадэмічнай камісіяй [13], а звестак аб яе стварэнні і рабоце над калекцыяй Храпкоўскага не выяўлена. У лік персанальных пенсіянераў па Віцебскай акрузе сям'я дзеяча не трапіла.

Пры рабфаку ў 1925 г. быў арганізаваны клуб імя Храпкоўскага [9]. На памяць аб ім засталася невялікая кніга «Вайсковы жарт», выдадзеная ў Віцебску ў 1922 г. накладам у 2860 асобнікаў, якая захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы [8].

ЛІТАРАТУРА

1. **Аршанскі** рабфакавец // Витебщина : документальное наследие. – 1926 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: 192.168.0.2./db_nasled/index.php. – Дата доступа: 20.10.2016.

2. **Аўтабіяграфіі** і асабістыя карткі членаў губвыканкама за 1921 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 1821. – Воп. 1. – Спр. 579. – Арк. 10–10 адв.

3. **Дырэктывы** Аршанскага павятовага камітэта і інш. за 1924 г. // ДАВВ. – Фонд 124-п. – Воп. 2. – Спр. 690. – Арк. 1.

4. **Загады** і выпіскі з загадаў Віцебскага губвыканкама, Віцебскага губернскага аддзела народнай адукацыі за 1919 г. // ДАВВ. – Фонд 2268. – Воп. 3. – Спр. 3. – Арк. 32.

5. **Загады** і пратаколы пасяджэнняў калегіі Віцебскага губернскага аддзела народнай адукацыі за кастрычнік-снежань 1919 г. // ДАВВ. – Фонд 2268. – Воп. 3. – Спр. 5.

6. **Загады** па Віцебскаму губернскаму аддзелу народнай адукацыі за 1919 г. // ДАВВ. – Фонд 2268. – Воп. 3. – Спр. 8. – Арк. 235–235 адв.

7. **Загады** па Віцебскаму губернскаму аддзелу народнай адукацыі за 1921 г. // ДАВВ. – Фонд 246. – Воп. 1. – Спр. 33.

8. **Кнорринг, В.** Фольклорист из Витебска / В. Кнорринг // Мишпоха. – № 30 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://mishpoha.org/n30/30a15.php. – Дата доступа: 14.10.2016.

9. **Копіі** пратаколаў рэвізійнай камісіі, спіскі студэнтаў рабфака і інш. за 1924–1925 гг. // ДАВВ. – Фонд 124-п. – Воп. 2. – Спр. 691. – Арк. 46.

10. **Пастановы** Віцебскага губернскага аддзела народнай адукацыі і інш. за 1918–1919 гг. // ДАВВ. – Фонд 2268. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 45–45 адв.

11. **Пратаколы** аб'яднаных сходаў ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ, агульных сходаў і пасяджэнняў бюро ячэйкі КП(б)Б Аршанскага рабфака за 1923–1924 гг. // ДАВВ. – Фонд 124-п. – Воп. 2. – Спр. 687.

12. **Пратаколы** пасяджэнняў бюро, агульных сходаў ячэйкі № 11 і інш. за 1924 г. // ДАВВ. – Фонд 124-п. – Воп. 2. – Спр. 688. – Арк. 20.

13. **Пратаколы** пасяджэнняў калегіі Наркамасветы БССР і інш. за 1924 г. // ДАВВ. – Фонд 170. – Воп. 1. – Спр. 8. – Арк. 185. – 185 адв.

14. **Пратаколы** пасяджэнняў камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва за 1920 г. // ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 2–2 адв.

15. **Пратаколы** пасяджэнняў камісіі па праверцы складу ячэйкі КП(б)Б Аршанскага рабфака за 1924 г. // ДАВВ. – Фонд 10062-п. – Воп. 1. – Спр. 68. – Арк. 23 адв. – 24.

16. **Пратаколы** пасяджэнняў РКК пры Віцебскім губана за 1920 г. // ДАВВ. – Фонд 2268. – Воп. 3. Спр. 14.

17. **Пратаколы** пленумаў, пасяджэнняў бюро Аршанскага павятовага камітэта РКП(б) за 1924 г. // ДАВВ. – Фонд 10065-п. – Воп. 1. – Спр. 627. – Арк. 135.

18. **Пратаколы** сходаў ячэек РКП(б) Аршанскага раёна за 1923–1924 гг. // ДАВВ. – Фонд 10065-п. – Воп. 1. – Спр. 448. – Арк. 98–99.

19. **Цыркуляры**, распараджэнні Аршанскага павятовага камітэта РКП(б) за 1923–1924 гг. // ДАВВ. – Фонд 124-п. – Воп. 2. – Спр. 686. – Арк. 100.

Падстаўленка В.Ф. *(г. Віцебск)*

АПОВЕСЦЬ «ГОЛЫ ЗВЕР» МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА ЯК УНІКАЛЬНЫ ЖАНРАВЫ ПРЫКЛАД

Пачынаючы з другой паловы 1920-х гг. у беларускай літаратуры (як і ва ўсёй савецкай у цэлым) адчуваецца моцны ўплыў тэорый «жывога чалавека», «зрывання масак», «псіхалагічнага рэалізму». Заканамерна, што ў сатыры гэтага часу заўважаецца інтэнцыя на псіхалагічныя прыёмы. Так, прынамсі, шырока практыкуецца творцамі псіхалагічны спосаб тыпізацыі («Сентыментальныя аповесці» М. Зошчанкі, апавяданні А. Аверчанкі і Тэфі). У беларускай сатырычнай плыні найбольш паказальным прыкладам гэтага спосабу тыпізацыі з'яўляецца сатырычная аповесць «Голы звер» М. Зарэцкага (1926). На падставе жанравых і канцэптуальна-метадалагічных агульнасцей, уласцівых названаму твору і «Сентыментальным аповесцям» М. Зошчанкі (1923–1929), мэтазгодна правесці супастаўленне асноўных мастацкіх рашэнняў, што выяўляюць непаўторныя карціны аўтарскіх стыляў.

Творчыя дыскурсы М. Зарэцкага і М. Зошчанкі вызначаюцца майстэрствам даследавання герояў у гранічна абвостраных і драматычна заглыбленых сітуацыях, у якіх мяняюцца светапоглядныя пазіцыі персанажаў. Але самі гэтыя змены маюць дыяметральна супрацьлеглы характар: калі асобных зошчанкаўскіх мастацкіх тыпаў выпадак прыводзіць да ўмацавання ў свядомасці маральных ідэалаў («Тамара і Апалон», «Страшная ноч»), то героі М. Зарэцкага ператвараюць асабістае жыццё ў амаральна-дэструктыўнае існаванне біялагічных адзінак.

Сюжэтнай дамінантай у творах становіцца непрадказальна-алагічны выпадак, з якога пачынаецца ланцуг трагікамічных (у Зошчанкі) і саркастычна-драматычных (у Зарэцкага) наступстваў. Пры гэтым падзейны рад успрымаецца толькі як фонавая «ілюстрацыя», сэнсавае тлумачэнне выбару персанажа. У цэнтры аповесцей – дынамічны працэс развіцця характараў герояў і раскрыццё ўнутранай логікі іх паводзін. Поліфанічнасць, лапідарнасць дыскурсаў сатырыкаў абумовіла сканцэнтраванасць экспрэсіўных сэнсава важкіх эпізодаў, інтанацыйнае вар'іраванне, эксперыментатарства з мастацкім часам. Дадаткова спынемся на апошняй стылёвай прыкмеце.

Храналагічны падыход у аповесцях М. Зарэцкага і М. Зошчанкі мае дыскрэтны, фрагментарны прынцып апісання, у якім, аднак, заўважаецца шэраг істотных асаблівасцей. «Сентыментальныя аповесці», у адпаведнасці з жанравай формай запісак, суб'ектыўна адлюстроўваюць мастацкі свет у выглядзе лагічна сканструяваных рэтраспекцый. У «Голым зверы» адбываецца камбінаванне спосабаў мастацкага паказу: у дамінуючае непасрэднае адлюстраванне (апісанне падзей, якія маюць месца ў цяперашнім для апавядальніка часе) уваходзяць рэтраспекцыі-ўспаміны герояў. Сінтэз лірычных і побы-

тавых абразкоў-замалёвак, прасякнутых іранічна-саркастычнымі фарбамі, спалучэнне розных спосабаў мастацкага паказу садзейнічаюць узнікненню моцнага эмацыянальнага «пасылу», паслядоўная градацыя якога суправаджае дзеянне да фіналу. Адной з асноўных стылёвых велічынь у аналізуемых творах з'яўляецца лірычнасць аповедаў. Менавіта яна заўважаецца ў падрадковых сэнсавых «падводках» да некаторых частак, дзякуючы чаму ўзрастае ступень аўтарскай актыўнасці і аўтарскай далучанасці да падзей.

Пры аналізе стыляў М. Зарэцкага і М. Зошчанкі нельга не сказаць аб майстэрстве дэталізацыі ў іх сатырычных творах.

У аповесці «Голы звер» з пункту погляду псіхалагічнай сатыры найбольш уражвае трапнасць характарыстычных апісанняў розных адценняў усмешкі «дзялка часоў нэпа» (Ю. Пшыркоў) Яроцкага: «салодка ўсміхнуўся», «заціснуў у вуснах тонкую ўсмешку», «усміхаўся ветла, адкрыта», «засмяяўся <...> жудасным смехам-сіпеннем», «застыла грымасай усмешка <...> у ёй разам пераплялося: і гэты дзікі незразумелы спалох, і слюнява-недалужная злосць <…> і зларадпасць дзікая», «засмяяўся сухім тым драўляным смехам» [1, с. 381–429].

Адзначаная партрэтная дэталь мае вялікі псіхалагічны сэнс. Яна не толькі на прыкладзе вобраза Яроцкага падагульняе аўтарскія спробы тэкстуальнага абыгрывання камічных матываў прыкідвання і гульні, але і, развіваючы сваю характаравызначальную функцыю, названая дэталь узбуйняецца да памераў гратэскава-метафарычнага вобраза-сімвала. Аргументуем тэкстуальнымі доказамі: «Смех шалёнай вужакай абвівае нутро і ціснецца-ціснецца вон, каб рассыпацца ў рогат гуллівы» [1, с. 381]. Такім чынам, у «Голым зверы» ўсмешка (як мастацкая дэталь) вызначае спецыфіку стасункавасці паміж персанажамі і канкрэтызуе стаўленне самога творцы да герояў.

У дачыненні да «Сентыментальных аповесцей» М. Зошчанкі адзначым, што ўласцівасцю стылю рускага сатырыка з'яўляецца практыкаванне рознатыповых камічных дэталей, мэта якіх – адлюстраванне «павуціння дробязей», якое ахутала жыццё герояў. Аб'ядноўвае празаікаў і ўжыванне сімвалізаваных мадэлей сатырычных дэталей, толькі ў М. Зошчанкі гэта дэталі побытава-рэчавага плана.

Наступная прыкмета дыскурсаў даследуемых аўтараў – кантраснасць – найбольш праяўляецца ў эмацыянальна-інтанацыйнай шматмернасці твораў. У «Голым зверы» пісьменнікам прымяняецца адкрытая кантэкстуальная амбівалентнасць:

а) супастаўленне лірычна-рамантычных, іранічна-саркастычных і драматычных эпізодаў у межах адной часткі;

б) на працягу ўсяго твора М. Зарэцкім апрабуюцца патэнцыяльныя мажлівасці ідэйна-мастацкай дыхатаміі «смех/гора (плач)».

Спакойны, мякка-іранічны аповед, які вызначае стыль «Сентыментальных аповесцей», кантрастуе з падтэкставай лірычна-спачувальнай рэакцыяй аўтара на апісаныя падзеі.

Стылістыка псіхалагічнай сатыры вымагае ад пісьменніка эклектычных сродкаў раскрыцця вобразаў. Таму сатырычныя персанажы аповесці «Голы звер» характарызуюцца і пры дапамозе камічных прыёмаў (гратэскава-іранічнае партрэтаванне, падкрэсліванне неадэкватнага рэальнаму стаўлення герояў да сябе, да іншых людзей, да рэчавага свету), і псіхалагічнымі прыёмамі (унутраныя маналогі, дэталізацыя), і выкрывальна-ацэначнымі заўвагамі.

Трэба таксама адзначыць, што для «Голага звера» характэрна выкарыстанне рознааспектных антаганістычных кампанентаў, таму паралельна з ужываннем драматычных матываў аўтарам уключаюцца і сатырычныя матывы гульні, прыкідвання, штучнасці. Мэта іх – змяншэнне памераў гіпербалічнага персаніфікаванага зла і дыскрэдытацыя «жывёльных» прынцыпаў існавання.

Рознааспектнасць аналізу сатырычнай аповесці «Голы звер» М. Зарэцкага пацвердзіла самабытнасць жанрава-стылёвых рашэнняў і адначасовую адпаведнасць яе традыцыям сатырычна-псіхалагічнай прозы.

ЛІТАРАТУРА

1. **Зарэцкі, М.** Кветка пажоўклая : апавяданні, аповесць / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 431 с.

Півавар К.С. *(г. Віцебск)*

РОЛЯ КРАЯЗНАЎСТВА Ў ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНЦКАГА ЛІНГВІСТЫЧНАГА ГУРТКА ВІЦЕБСКА

Мэта артыкула: раскрыць краязнаўчы напрамак дзейнасці студэнцкага мовазнаўчага аб’яднання на прыкладзе гуртка «Мова ў кантэксце культуры», які функцыянуе на філалагічным факультэце ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава». Як вынікае з назвы, ухіл даследавання мовы ў ім робіцца на перспектыўныя і запатрабаваныя сёння кірункі – сацыякультурны і лінгвакультуралагічны аспекты вывучэння беларускай мовы. Мова пры гэтым разумеецца як інструмент адлюстравання культуры народа і як феномен культуры. Зразумела, што пры такім падыходзе істотнае месца на занятках гуртка мае краязнаўчая праца. Выдзелім наступныя напрамкі дзейнасці студэнтаў па даследаванні роднага горада і вобласці ў межах названага гуртка:

1) вызначэнне дыялектных асаблівасцей беларускай мовы (у нашым выпадку – асаблівасцей паўночна-ўсходняга дыялекту);

2) даследаванне біяграфій і творчасці лінгвістаў – ураджэнцаў Віцебска, або тых, хто быў звязаны з нашым горадам у пэўныя перыяды жыцця;

3) выяўленне падзей, фактаў, важных у гісторыі беларускай мовы і звязаных з Віцебшчынай;

4) даследаванне мовы літаратурных твораў, у якіх узгадваецца Віцебск;

5) правядзенне экскурсій па мясцінах Віцебшчыны, звязаных з гісторыяй беларускай мовы, кнігі.

Разгледзім падрабязней кожны з азначаных аспектаў краязнаўчай працы студэнцкага лінгвістычнага гуртка.

1. Нягледзячы на выданне грунтоўнай працы «Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны» [5], у якім зафіксаваны дыялектызмы, адзначаныя ў розных раёнах Віцебскай вобласці падчас дыялекталагічных экспедыцый студэнтаў і выкладчыкаў Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, спыняць працу па зборы дыялектных асаблівасцяў беларускай мовы не варта. Запатрабаванымі для айчыннай навукі будуць даследаванні пэўных лексіка-семантычных груп дыялектызмаў, параўнальнае вывучэнне мясцовай лексікі сучаснага слоўніка і выдадзенага амаль стагоддзе таму – «Віцебскага краёвага слоўніка» М.І. Каспяровіча [4].

2. З Віцебскам звязаны імёны многіх беларускіх лінгвістаў, фалькларыстаў, пісьменнікаў. Прыгадаем імя выдатнага славяназнаўцы, пачынальніка беларускай, польскай, украінскай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі Зарыяна Якаўлевіча Даленгі-Хадакоўскага (сапр. Адам Чарноцкі; 1784–1825). Складзены ім чатырохтомны «Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў» – першы вопыт такога роду ва ўсходнеславянскіх археолагаў. Выкарыстанне дадзеных тапанімікі ў гісторыі і археалогіі зараз звычайны метад. На тыя часы гэта не знаходзіла падтрымкі сярод даследчыкаў і З.Я. Даленгу-Хадакоўскаму прыходзілася шмат спрачацца і даказваць правату сваёй «гістарычнай сістэмы». У Віцебску на пачатку XIX ст. З.Я. Даленга-Хадакоўскі даследаваў Дзвінскае ўзвышша – старадаўняе балцкае гарадзішча.

Ураджэнец Гарадоччыны, Канстанцін Васільевіч Вераніцын, аўтар славутай паэмы «Тарас на Парнасе» вучыўся ў Віцебскай гімназіі (1845–1852). Зараз гэта будынак Віцебскай духоўнай семінарыі на былой Прачысценскай, цяпер вул. Камісара Крылова (дом № 7).

Сцены гэтага будынка бачылі не аднаго таленавітага сына Віцебшчыны. Так, гімназію ў 1832 г. закончыў ураджэнец Полацка, славуты вучоны-ўсходазнавец Каятан Андрэевіч Касовіч (1814–1883). Наш зямляк з'яўляўся найвыдатнейшым знаўцам сучасных і мёртвых усходніх моў, стаў заснавальнікам санскрыталогіі ў Расійскай імперыі.

З гэтым жа будынкам звязана імя этнографа, фалькларыста Паўла Васільевіча Шэйна (1826–1900). З 1865 па 1873 г. ён працаваў выкладчыкам у Віцебскай гімназіі. Пражываючы ў горадзе, ён займаўся зборам народнага

фальклору самастойна, а таксама стварыў шырокую сетку карэспандэнтаў, якія збіралі матэрыялы для яго. Сярод іншых былі як навучэнцы гімназіі, так і вядомыя даследчыкі, напрыклад, А. Багдановіч, Ф. Глінка, Л. Кандратовіч (Сыракомля), Я.Ф. Карскі, Ю.Ф. Крачкоўскі, Я. Лучына, М.Я. Нікіфароўскі, З.Ф. Радчанка, М. Рымскі-Корсакаў і інш. На жаль, не ўсе матэрыялы, сабраныя П. Шэйнам, пабачылі свет.

У 1876 г. будынак гімназіі быў перададзены духоўнай семінарыі, якую ў 1909 г. скончыў Анатоль Васільевіч Багдановіч (1888–1969), беларускі і рускі мовазнавец, кандыдат філалагічных навук. Выкладаў у школах і тэхнікумах Віцебска (1921–1926).

На гэтай жа вул. Камісара Крылова, у доме № 4, у 1924–1926 гг. жыў знакаміты краязнаўца, філолаг, гісторык, культуролаг Мікалай Іванавіч Каспяровіч, аўтар некалькіх мовазнаўчых артыкулаў і двух слоўнікаў: «Беларуска-расійскага слоўнічка» (1925), «Віцебскага краёвага слоўніка» і «Слоўнічка ўласных найменняў» (1927). Уласны досвед над «Віцебскім краёвым слоўнікам» потым абагульніў у інструкцыі «Як сабраць і ўкласці слоўнік мовы свайго раёна» (1928), ухваленай слоўнікавай і дыялекталагічнай камісіямі Аддзела гуманітарных навук Інбелкульта і рэкамендаванай усім мясцовым краязнаўцам у якасці практычнага дапаможніка.

Недалёка ад вул. Камісара Крылова, па адрасе вул. Талстога, 4, знаходзіцца будынак былой прыватнай гімназіі І.Р. Неруша, дзе выкладаў выдатны беларускі этнограф, фалькларыст Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі (1845–1910). Пасля заканчэння Віцебскага духоўнага вучылішча ён працаваў настаўнікам у гімназіях у Віцебску і Віцебскай губерні. Знаёмства з дзейнасцю Паўла Шэйна абудзіла ў М.Я. Нікіфароўскага цікавасць да вывучэння побыту, культуры і творчасці народа. Больш як 20 гадоў ён быў карэспандэнтам П. Шэйна, а потым стаў выступаць з самастойнымі даследаваннямі. Сярод больш як 20 прац М.Я. Нікіфароўскага адзначым «Напаўпрыказкі-напаўпрыслаўкі, якія ўжываюцца ў Віцебскай Беларусі» (1910–1913), «Напаўпрыказкі-напаўпрыслаўкі» (1928), якія можна лічыць аднымі з першых фразеаграфічных прац па беларускай мове. Жыццё яшчэ аднаго знакамітага вучонага, які займаўся даследаваннямі беларускай мовы, – Еўдакіма Раманавіча Раманава, звязана з Віцебскам, дзе ў 1886–1894 гг. ён працаваў у якасці інспектара народных вучылішч. Віцебшчыне прысвечаны шэраг яго грунтоўных даследаванняў. Сярод іншых вылучаецца праца «Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский» (Магілёў, 1898). У працы падаецца падрабязнае, дэталёвае апісанне водных аб'ектаў, урочышчаў, назваў населеных пунктаў, помнікаў археалогіі ў іх наваколлях. Гэтае даследаванне ўяўляе сабой грунтоўны параўнальна-гістарычны аналіз тапанімічнага матэрыялу.

З 1921 г. пачаў дзейнічаць Віцебскі педагагічны інстытут. У 1920–1923 гг. тут працаваў Міхаіл Міхайлавіч Бахцін (1895–1975) – рускі філосаф, культу-

ролаг, тэарэтык еўрапейскай культуры і мастацтва. Даследчык мовы, эпічных форм аповеду і жанру еўрапейскага рамана. Аўтар некалькіх лінгвістычных прац, прысвечаных агульнатэарэтычным пытанням стылістыкі і тэорыі маўленчых жанраў.

У 1938–1941 гг. выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры, загадчыкам навучальнай часткі Віцебскага педвучылішча працаваў Суднік Міхаіл Раманавіч (1910–1995), мовазнавец, кандыдат філалагічных навук, член-карэспандэнт АН Беларусі. Займаў пасады дырэктара Інстытута мовазнаўства АН БССР (1957–1983), старшыні Беларускага камітэта славістаў (1959–1985). Суаўтар вядомых перакладных, тлумачальных, арфаграфічнага слоўнікаў.

Віцебск звязаны са шматлікімі імёнамі таленавітых мовазнаўцаў. Аднак адсутнасць да пачатку XX ст. вышэйшых навучальных устаноў падштурхоўвала навукоўцаў з'язджаць з роднага горада. Напрыклад, пакуль не ўдалося ўстанавіць месца ў горадзе, пэўным чынам звязанае з імем Аляксандра Львовіча Пагодзіна (1872–1947), расійскага філолага-славіста, гісторыка, прафесара Варшаўскага, Пецярбургскага, Харкаўскага, Бялградскага ўніверсітэтаў. Менавіта яму прысвяціў свой славуты «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…») Максім Багдановіч. Вядома дакладна, што радзімай лінгвіста з'яўляецца горад Віцебск.

3. На пл. Свабоды, якая знаходзіцца ў цэнтры горада, у сярэдзіне мінулага стагоддзя адбылася сенсацыйная знаходка не толькі для археолагаў, але і для лінгвістаў. У 1959 г. падчас правядзення земляных работ і разбору руін узарванага ў 1957 г. Мікалаеўскага кафедральнага сабора была знойдзена першая берасцяная грамата на тэрыторыі Беларусі. Датаваць дакладна грамату праблематычна (прыблізна XIII–XIV стст.), бо культурныя слаі былі перамяшаныя, зрэшты, і саму знаходку можна лічыць шчаслівай выпадковасцю. Грамата мае назву «Ад Сцяпану да Няжылы» («От Степана к Нежилови») і яе змест на сучаснай беларускай мове гучыць так: «Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта за 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў наяўнасці. Калі ж прадаў, то, дабрадзей мой, купі мне жыта» [3, с. 53]. Пасля аналізу манеры выкладання і цокаючага дыялекту вучоныя мяркуюць, што аўтар – наўгародскі купец, жыхар Паўночна-Заходняга рэгіёна. Цікавы той факт, што найбольш ранняя грамата (XI ст.), выяўленая ў Ноўгарадзе, – за аўтарствам Жыравіта, жыхара Полацка або Віцебска.

4. Каля ўзгаданай вышэй пл. Свабоды працякае невялікі ручай Дунай, а галоўная вуліца – Задунаўская (цяпер праспект Фрунзе) пачыналася ад маста, пад якім адбылася сустрэча двух д'яблаў, пакладзеная ў сюжэт для аднайменнай паэмы «Два д'яблы (д'яўлы)» К. Вераніцына: «Тут два д'яблы схамянуліс, / Верць туды-сюды хвастом / І з разгону апынуліс / Пад Задунайскім мастом» [2, с. 72]. Паэма – гэта водгук аўтара на так званы рух цвярозасці на нашых землях, які ўзнік супраць палітыкі спойвання народа. Па сюжэце, сатана адпраўляе д'яблаў у Віцебск і Гродна, каб тыя спакушалі

людзей піць алкаголь і тым самым губіць чалавечыя душы. Аднак у Гродна д'ябал не выканаў сваёй задачы – гарадзенцы былі непахісныя, да таго ж збілі яго. У той час як яго калега ў Віцебску меў поспех, бо ў гэтым горадзе працвітала п'янства. Паэма «Два д'яблы» была напісана ў 1860 г. і ўпершыню апублікавана толькі ў 1986 г. Для лінгвістыкі яна мае каштоўнасць як сведчанне станаўлення новай беларускай мовы. Яе стваральнік больш вядомы як аўтар славутай паэмы «Тарас на Парнасе», асноўныя падзеі якой, таксама, дарэчы, адбываюцца ў наваколлях Віцебска, каля в. Пуцявішча.

5. Карыснымі для студэнта-філолага будуць наведванне экспазіцый «Друкаваныя і рукапісныя дакументы з XIV ст. па 1917 г.» і «Друкаваныя і рукапісныя дакументы з 1917 г. па сённяшні час» у Віцебскім краязнаўчым музеі, экскурсіі ў Музей кнігадрукавання ў Полацку, музей гісторыі кнігі і друку ў СШ № 3 г. Мёры, музей імя Б. Эпімаха-Шыпілы ў Ветрынскай СШ Полацкага раёна.

Такім чынам, краязнаўчая гуртковая праца студэнтаў-філолагаў спалучае ў сабе разнастайныя сродкі і метады вывучэння роднай мовы і роднага краю ў іх цеснай узаемасувязі. Студэнт – будучы настаўнік, дзякуючы працы ў лінгвістычным гуртку, можа засвоіць метады сацыякультурнага навучання ў школе, пашырыць свае веды пра беларускую мову і Віцебскі край.

ЛІТАРАТУРА

1. **Германовіч, І. К.** Беларускія мовазнаўцы : нарысы жыцця і навуковай дзейнасці : у 2 т. / І. К. Германовіч. – Мінск : Універсітэцкае, 2006. – Т. 1. – 237 с. : фат.

2. **Германовіч, І. К.** Беларускія мовазнаўцы : нарысы жыцця і навуковай дзейнасці : у 2 т. / І. К. Германовіч. – Мінск : Універсітэцкае, 2008. – Т. 2. – 277 с.

3. **Заняпад** і адраджэнне : бел. літ. XIX ст. / уклад., прадм. і заўв. У. Казберука. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 606 с.

4. **Кавалёў, С. А.** Віцебская берасцяная грамата / С. А. Кавалёў // Памяць. Віцебск : гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2002. – Кн. 1-я. – С. 53.

5. **Касьпяровіч, М. І.** Віцебскі краёвы слоўнік : (матэрыялы) / М. І. Касьпяровіч ; пад. рэд. М. Я. Байкова, Б. І. Эпімаха-Шыпілы ; [прадмова С. Запрудскага]. – 3-е выд., стэрэатып. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 371 с.

6. **Рэгіянальны** слоўнік Віцебшчыны : [у 2 ч.] / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ўн-т імя П. М. Машэрава, Каф. беларускага мовазнаўства ; [склад.: Л. І. Злобін і інш.]. – Віцебск : ВДУ, 2012. – Ч. 1. – 303 с.

7. **Рэгіянальны** слоўнік Віцебшчыны : [у 2 ч.] / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ўн-т імя П. М. Машэрава, Каф. беларускага мовазнаўства ; пад рэд. А. С. Дзядовай ; [склад.: Г. К. Семянькова і інш.]. – Віцебск : ВДУ, 2014. – Ч. 2. – 357 с.

Пушкина О.И. *(г. Витебск)*

КОНТАМИНАЦИЯ ОБРАЗА РУСАЛКИ В МИФОЛОГИИ ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН

Современный человек, воспитанный на ценностях и приоритетах культуры своих предков, выступает одновременно и реципиентом духовной культуры, и ретранслятором, способствуя формированию межпоколенной преемственности социокультурного наследия, сохраняя ментальное ядро культуры. Именно поэтому всестороннее исследование современных культурных процессов невозможно без осмысления фундаментальных основ духовной культуры, начиная с самых ранних ее форм. Мифологическая картина мира являлась системой ориентации для человека не только в пространстве и времени, но и в системе ценностных установок, в ней фиксировался социокультурный опыт предков. Образ русалки – один из восточнославянских мифологических образов, сохранившихся до наших дней, однако его истолкование сегодня является неполным и неоднозначным.

Контаминация (от лат. contaminatio – смешение) является смешением, слиянием разнородных факторов в новую совокупность, объединением в образе частей, принадлежащих к разным предметам. На наш взгляд, образ русалки достаточно сложен и обладает именно такими свойствами, что вызывает поливариативность его интерпретации.

В современной культуре русалки представляются как демонические существа, обладающие своеобразной красотой. Преимущественно это девушки, с распущенными длинными русыми или зеленоватыми волосами, обладающие стройной фигурой, большой грудью и рыбьим хвостом, которые заманивают людей в воду и топят. Даже в этом описании контаминация явно выражена, однако она не ограничивается только внешностью. В начале XX в. на контаминационный образ русалки обратил внимание русский ученый Е.Г. Кагаров, отмечая, что ее хтонический (связанный со смертью) характер сохранил многочисленные черты русалок как духов природы, в частности – рек [5, с. 7]. Однако, на наш взгляд, контаминация данного образа не исчерпывается только этим.

Согласно представлениям восточных славян русалками чаще всего представлялись души женщин и детей, погибших преждевременной или неестественной смертью [5, с. 9; 9, с. 55–56], а также те, кто умирал на так называемой «Граной» (Русальной неделе) – неделе, когда празднуется Купалье [16]. Ими могли стать девушки, проклятые кем-либо из родителей, уведенные нечистой силой в подводные селения и смешавшиеся со стихийными существами [9, с. 55; 10, с. 44]. В южной и южно-великорусской России их представляли юными девами с длинными, русыми распущенными волосами [4, с. 12; 5, с. 9; 6, с. 38; 15, с. 146], обнаженными или одетыми в белые одеж-

ды, заманивавшими к себе мужчин и юношей, для того, чтобы защекотать до смерти и утопить [18, с. 577]. В некоторых районах, преимущественно на севере России, русалок представляли в виде мстительных, уродливых, бледнолицых баб с отвисшей или с большой грудью, с растрепанными зелеными волосами [5, с. 9; 18, с. 253–254]. Во второй половине XIX в. в Саратовской губернии они описывались существами косматыми, горбатыми, с большим животом, острыми когтями и железным крючком, которым они ловили людей [10, с. 64; 18, с. 577].

В мифологии белорусов сохранился классический образ роковой для человека красавицы, водяной или лесной нежити, с распущенными волосами [4, с. 12–16; 9, с. 54–56; 11, с. 64–67; 13, с. 78; 19, с. 253–254]. Наши предки называли их водяницы либо купалки. В конце XIX в. исследователь А.П. Безсонов трактовал их как служительниц Купалы [3, с. 60]. На то, что русалки ранее могли занимать более высокий уровень в мифологии наших предков, указывают следующие данные. В ряде регионов существовали представления о том, что купаться на Русальной неделе до дня Купалы – грех, а тот, кто нарушал этот запрет или плавал после солнечного заката или в праздник, не давая воде отдыхать, также мог стать русалкой. [6, с. 37; 18, с. 578]. После праздника купание становилось не только полезным, но и животворным, поскольку воды, освященные солнцем, получали целебную силу также через воду, и земля достигала своей наивысшей производительности [2, с. 138]. Запреты на купание во время или после дождя в связи с тем, что там могли находиться русалки, фиксировались исследователями и в конце XX в. [9, с. 54–56]. Согласно записям А.В. Терещенко на некоторых территориях в течение недели, предшествующей празднику Купалы, не занимались никакой работой, боясь прогневать русалок, а также того, что скот мог родиться с кривыми ногами и головами [18, с. 593].

Приводимые примеры указывают на то, что русалки воспринимались как существа, оберегающие водную стихию и нормирующие поведение человека относительно ее использования. Систематизация разрозненных данных позволяет считать, что их образ также имел продуцирующий характер и был связан с плодородием и судьбой.

Выявленное внешнее сходство в изображении русалок с берегинями на резьбе [13, с. 83–85] и в вышивке [8, с. 93–94] указывает на их отождествление в народном мировосприятии. Следует отметить, что в вышивке русалка связывалась преимущественно с водной стихией, а в резьбе она выступала как покровительница жилища и женских домашних работ, поскольку ее изображения встречались на вальке, ткацком станке, дверях и фронтонах жилища, иногда с веретеном в руке. Данные образы также должны были оберегать путников от несчастных случаев [8, с. 171].

Русалки покровительствовали ряду домашних работ, особенно прядению и ткачеству, и могли влиять на судьбы людей. Согласно народным пове-

рьям русалки вместе с девушками принимали участие в гаданиях на Духов и Троицын дни. Предсказания касались не только вопросов брака, но и жизни и смерти как самой девушки, так и ее родственников [4, с. 14; 5, с. 50–51; 15, с. 144–145; 18, с. 584–593]. Несколько ниток, выпряденных левой рукой, в Великий четверг привязывали в лесу к березе так, чтобы на каждого члена семьи приходилось по нитке. Связывали их в Троицын день. Если завязанная на кого-нибудь из близких нитка потеряется, то тот человек в этом году умрет [1, с. 132]. С.В. Максимовым также были зафиксированы гадания о возможном замужестве, о своей доле, о родных, но также и о будущем урожае. Именно «русалочки» в народных играх магическим путем могли повлиять на рост льна. Молодые крестьяне-мужчины прятались во ржи, поджидая ряженых девушек и женщин, хлопали их кнутом, после чего спрашивали: «Русалоцки, как лен?». Ряженые указывали на длину кнута, на что мужчины отвечали: «Ох, умильные русалоцки, какой хороший!» [7, с. 612–615].

На то, что в мифологической картине восточных славян русалки изначально были связаны с культом плодородия и с аграрными циклами земледелия, свидетельствует их появление во время весеннего расцвета, а также в пору созревания злаковых культур. Согласно М.Д. Никифоровскому они появлялись с четверга Страстной недели и до четверга перед Троицыным (Духовым) днем находились в воде. По народным преданиям они могли плавать на яичной скорлупе [10, с. 64]. Яйцо всегда имело связь с идеей плодородия и зарождения/пробуждения жизни. В ряде обрядов в дар русалкам приносили яичницу [18, с. 583–584, 596]. В некоторых уездах существовал обычай бросать в реку скорлупу писанок для русалок и утопленников, а также люди ходили к реке христосоваться с русалками [17, с. 26], что свидетельствует о контаминации идеи возрождения и культа предков.

Поскольку русалки были духами воды, жизненной влаги, значит, и покровительницами растений и урожая. Будучи связанными с водой, они считались и божествами орошения, способствующими повышению урожая, увлажняющими землю туманами, росами и дождями [14, с. 630–657]. Длинноволосые русалки являлись берегинями, подательницами живой воды спеющему зерну. Они оберегали жито от «ведьминых» заломов, поили ростки росой. В Беларуси с ними не враждовали, а задабривали и тешили песнями [20], поскольку в аграрном обществе от наличия воды зачастую зависел весь урожай. Магические действия, производимые русалками, например, покачивание на ветвях деревьев, способствовали увеличению урожая, расчесывание ими волос могло означать высвобождение влаги. На ритуальных игрищах во время Русальной недели женщины исполняли танец плодородия, изображая из себя русалок. Эти ритуальные танцы имеют весьма давнюю историю. Изображения игрищ на миниатюре Радзивиловской летописи XI–XII вв., где главенство танцующей девушки подчеркнуто большими размерами по сравнению с иными персонажами, и народный ритуальный ко-

стюм для танца начала XX в. обладают целым рядом сходных черт, главная из которых – длинные, почти до щиколоток рукава. Языческий ритуальный характер подобной пляски отражает также сказка о Царевне-лягушке [14, с. 654–656].

В мифологии восточных славян фиксируется обряд «проводов русалки», связанный с семицкими и купальскими обычаями и игрищами. Именно в нем максимально сохранилась связь между образом русалки, девушками и женщинами. Во время данного обряда девушки и женщины делали чучело русалки, украшали его, а затем, разделившись на две группы, боролись за него. Борьба заканчивалась обычно разрыванием чучела и разбрасыванием его частей по полям. В ходе игры преимущественно девушки защищали чучело русалки, а замужние женщины нападали, стремясь разорвать его либо утопить в реке [2]. Существовали и другие формы данного обряда. В Беларуси выбирали самую красивую девушку, наряжали ее зелеными ветками и украшениями, остальные участницы обряда становились вокруг нее в кружок и так ходили по полю. В этот день девушки были без парней, которые не смели к ним подходить, чтобы не прогневать русалку.

В конце XX в. исследователи также фиксировали сохранение в Беларуси обряда проводов русалки. Как и 100 лет назад, ее образ персонифицировался в облике молодой девушки, которую наряжали в новую одежду, распускали косы, одевали венок и ветки березы до земли. Отмечается осознание значимости данного праздника для всего сообщества, поскольку того, кто не принимал участие в этих гуляниях, ожидало суровое наказание:

«А хто ня ўўшаў [вышел]
На купала, Штоб яго матка
Прыкапала!» [16].
«Ой, хто не выйдзе на Купальню,
Ой, той будзе пень-калода,
А хто пойдзець на Купальню,
А той будзе бел-бяроза!» [12, с. 70].

Отличительными особенностями данного обряда можно назвать следующие: строгая социальная дифференциация девушек и женщин; табуирование участия в обряде парней и мужчин; явно выраженная связь с миром мертвых через «утопление» «русалки» либо через разрывание ее чучела; осознание значимости происходящего для всех.

Таким образом, контаминация образа русалки проявляется не только во внешних особенностях, но и в неоднозначности трактовок и функций данного образа. В нем обнаруживается смешение хтонических качеств и продуцирующих свойств, явно выраженная защитная и нормативная функции, а также связь с долей, судьбой, жизнью девушек и женщин.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Антипов, В. А.** Народные приметы, касающиеся погоды и сельского хозяйства / В. А. Антипов // Живая старина. – 1901. – Вып. 3/4. – С. 131–132.

2. **Балов, А.** К вопросу о характере и значении древних «купальских» обрядов и игрищ / А. Балов // Живая старина. – 1896. – Вып. 1. – С. 133–142.

3. **Безсонов, П. А.** Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П. А. Безсонов. – Москва : Тип. Бахметова, 1871. – Вып. 1 : [Песни обрядные]. – LXXXI, II, 176 с.

4. **Добровольский, В.** Нечистая сила в народных верованиях (по данным Смоленской губернии) / В. Добровольский // Живая старина. – 1908. – Вып. 1. – С. 3–16.

5. **Кагаров, Е. Г.** Религія древнихъ славянъ / Е. Г. Кагаров. – Москва : Практическія знанія, 1918. – 72, [1] с.

6. **Ляцкий, Е. А.** Представления белоруса о нечистой силе / Е. А. Ляцкий // Этнографическое обозрение. – 1890. – № 4. – С. 25–41.

7. **Максимов, С. В.** Куль хлеба. Нечистая, неведомая и крестная сила / С. В. Максимов. – Смоленск : Русич, 1995. – 672 с.

8. **Маслова, Г. С.** Орнамент русской народной вышивки как историко-этнографический источник / Г. С. Маслова. – Москва : Наука, 1978. – 207 с., [3] л. ил.

9. **Мифологические** рассказы и легенды Русского Севера / Санкт-Петерб. гос. ун-т ; сост. и авт. коммент. О. А. Черепанова. – Санкт-Петербург, 1996. – 209, [2] с.

10. **Никифоровский, М. Д.** Русское язычество / М. Д. Никифоровский. – Санкт-Петербург : [Тип. духовного журн. «Странник»], 1875. – [2], 125, III с.

11. **Никифоровский, Н. Я.** Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Издатель Н.А. Паньков, 1995. – 85 с.

12. **Нячаева, Г.** Ручнік-шлях / Г. Нячаева // Мастацтва. – 1998. – № 2. – С. 67–70.

13. **Померанцева, Э. В.** Мифологические персонажи в русском фольклоре / Э. В. Померанцева. – Москва : Наука, 1975. – 191 с.

14. **Рыбаков, Б. А.** Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – Москва ; София : Гелиос, 2001. – 739, [2] с.

15. **Сахаров, И. П.** Сказания русского народа : народный календарь / И. П. Сахаров. – Москва : Сов. Россия, 1990. – 175 с.

16. **Судник, Т. М.** Из полесской тетради 1975 года / Т. М. Судник // Живая старина. – 1997. – № 2. – С. 58–59.

17. **Сумцов, Н. Ф.** Писанки / Н. Ф. Сумцов. – [Киев] : Тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, 1891. – 49 с.

18. **Терещенко, А. В.** История культуры русского народа / А. В. Терещенко. – Москва : Эксмо, 2007. – 736 с. : ил.

19. **Толстой, Н. И.** Каков облик дьявольский? / Н. И. Толстой // Язык и народная культура : очерки по славянской мифологии и этнолингвистике / Н. И. Толстой. – Москва : Индрик, 1995. – С. 250–269.

20. **Хатэнка, А.** Русалкі, уладарніцы расы... / А. Хатэнка // Роднае слова. – 1995. – № 5. – С. 131–140.

Саматой І.В. *(г. Віцебск)*

ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫ АСПЕКТ ПРОЗЫ СЯРГЕЯ РУБЛЕЎСКАГА

Проза віцебскага літаратара Сяргея Рублеўскага – з'ява адметная, шматстайная, разнажанравая, якая даўно ўжо выйшла за рэгіянальныя граніцы, вызначаецца сваёй скразной філасофіяй, актыўнымі наватарскімі пошукамі, арганічна ўліваецца ў сучасны літаратурны працэс і дапаўняе яго.

Адзін з самых устойлівых архетыпаў беларускай літаратуры – ідэалагема дому, жытла – найперш звязаны з месцам нараджэння творцы. Малая радзіма С. Рублеўскага – в. Бабча Лепельскага раёна, дзе ён з'явіўся на свет 24 снежня 1954 г. у сялянскай сям'і. Вучыўся ў Бароўскай сярэдняй школе. У гэтыя гады пачаў пісаць свае першыя творы – вершы. У 1972 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Пасля вучобы працаваў настаўнікам у Капыльскім раёне Мінскай вобласці. З 1978 г. С. Рублеўскі – журналістыцы: спачатку ў бешанковіцкай раённай газеце «Зара» быў карэспандэнтам, потым (з 1980 па 1984 г.) з'яўляўся намеснікам рэдактара талачынскай газеты «Сцяг Ільіча», далей загадчыкам аднаго з аддзелаў у абласным выданні «Віцебскі рабочы», а з 1990 г. (з дня заснавання) галоўным рэдактарам абласной газеты «Народнае слова». У 2008–2013 гг. працаваў намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі – начальнікам аддзела па архівах і справаводстве Віцебскага аблвыканкама.

Ён аўтар наступных зборнікаў прозы: «Апостраф» (2000), «Азярод» (2003), «Абмытыя валуны» (2005), «Ў, тое, што мы скараціли» (2008), «Маўчанне на ўвесь белы свет» (2011), «Святло лускі» (2012), «Паспець надыхацца» (2012), «Мамін шэпт пад абразамі» (2016). Лаўрэат прэміі «Гліняны Вялес» (2012) за кнігу «Паспець надыхацца». З'яўляецца аўтарам шматлікіх публікацый у рэспубліканскай і абласной перыёдыцы.

Першая кніга пісьменніка мела назву «Апостраф» (тэксты аб праявах быцця). Апостраф – надрадковы знак у выглядзе коскі, які ў беларускай мове адпавядае цвёрдаму і мяккаму знакам у рускай мове. Сам аўтар патлумачыў назву кнігі ў творы, што змешчаны напрыканцы выдання пад аналагічнай назвай. «Апостраф – беларуская паўза ў сусветным Логасе», «Апостраф – імгненне паміж уздыхам і выдыхам, час, які, як мушка ў бурштыне, застыў паміж ваганнямі ківача» [2, с. 118]. Сапраўды, апостраф – гэта паўза, невялікі перапынак, што дае магчымасць спыніць рух, азірнуцца назад, больш пільна ўгледзецца ў звыклае і, на першы погляд, добра знаёмае, над чымсьці задумацца і паразважаць. Гэта своеасаблівы позірк на жыццё, аб'ектыўны пункт гледжання. Змест кнігі поўнасцю адпавядае арыгінальнаму найменню. Зборнік складаецца ў асноўным з невялікіх твораў, якія можна вызначыць як лірычныя мініяцюры ці абразкі на патрыятычную тэму («Мамін шэпт пад

абразамі»). Некаторыя больш упадабляюцца навеле («Сляпыя словы пра незваротна страчаны і нанова абяцаны рай», «Час засмактаў…»). У кожным творы, кожным радку праступае новы погляд на стары свет, адчуваецца аўтарскае светабачанне і ўласная філасофія. У анатацыі да гэтага зборніка адзначаецца, што «…з тэкстаў аб праявах быцця Сяргея Рублеўскага, з'яднаных «Апострафам», паўстае вобраз Беларусі ў канцы ХХ ст. Як праўдзівы беларус, што жыве побач і разам з намі, аўтар заўсёды «скарачае "у", але не ставіць кропак над "і": ён дакладны ў падрабязнасцях, але не навязвае чытачу-суразмоўніку свае думкі, а заклікае яго разважаць, пакідае яму прастору дзеля ўласных высноваў» [2, с. 2].

Арыгінальнай назвай вызначаецца і наступная кніга празаіка – «Азярод». Тлумачальны слоўнік беларускай мовы дае наступнае аначэнне гэтаму слову: «…прыстасаванне са слупоў і жэрдак для дасушвання збажыны, травы і пад.; пярэплат» [4, с. 205]. Як слушна зазначае літаратуразнавец С. Вераціла, «менавіта такую назву абраў для сваёй кнігі віцебскі празаік і павесіў на свой літаратурны азярод шэсцьдзесят невялікіх апавяданняў і эсэ, не хаваючы думак і перажыванняў» [3, с. 8]. Атрымаўся багаты рознакаляровы плыт з цікавымі апавяданнямі («Амар», «Хірургі»), дакладнымі назіраннямі («Хукі, як хоку», «Жвысь»), біяграфічнымі нататкамі («Чысціня ў чырвоным куце і ў кожным куточку душы») і трапнымі афарызмамі («Жменя самасейнай цыбулі»). Пісьменнік закранае ў зборніку тэмы Вялікай Айчыннай вайны, развіцця культуры і адукацыі, светлага пачуцця кахання, стасункаў чалавека і прыроды.

Назву трэцяй кнігі – «Абмытыя валуны» – аўтар патлумачыў на яе прэзентацыі ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна і ў зборніку на апошняй старонцы. «Абмытыя валуны – гэта тыя, што ляжаць у рацэ, – восенню ападае ў небыццё, як аджылы ліст… <…> Усё адно ж верыцца, што на самай быстрыні, на самай сярэдзіне наравістай плыні часу ты, не раўнуючы як той тапелец ухопішся за саломінку вечнасці» [1, с. 223]. Кніга з'яўляецца грунтоўным працягам дзвюх папярэдніх, складаецца з адной аповесці «Спавядальныя дні ў чужым горадзе», апавяданняў з цыкла «Замовы з вучнёўскага сшытка», эсэ «Піва», «Крэсла» і іншых, дзённікаў «З мамай», «Уроссып».

«У літаратуразнаўстве ёсць паняцце – эстэтычная дыстанцыя, якое вызначае ступень нечаканасці літаратурнага роду крытэрыем вызначэння эстэтычнай каштоўнасці твора» [5, с. 7]. Гэтыя словы з артыкула Н. Якавенка цудоўна падыходзяць да творчай спадчыны С. Рублеўскага. Адны творы ўражваюць сваёй складанасцю, нават незразумеласцю пры абмалёўцы зусім звычайных рэчаў і з'яў, іншыя, наадварот, шчырасцю і ўвагай да дэталяў. У сваіх літаратурных працах пісьменнік імкнецца раскрыць сапраўдную існасць душы беларуса, вылучыць філасофскі складальнік разнастайных праяў чалавечага быцця.

Важнае месца ў творчай спадчыне С. Рублеўскага займаюць апавяданні, прысвечаныя розным падзеям з жыцця знаёмых і незнаёмых людзей. У іх адчуваецца і замілаванасць маленькай радзімай, і шчырыя сыноўнія пачуцці да маці і ўсіх вясковых жанчын, і цікавасць да актуальных пытанняў сучаснасці. Як правіла, арыгінальныя па змесце творы маюць нескладаны займальны сюжэт («Амар», «Два качагары», «Чорны дым у белы свет», «Ма бі-бі», «Дванаццатая ноч у Рэйнсбруку», «Смачныя цмочкі», «Смерць Ёселя»).

Неаднойчы літаратуразнаўцы А. Русецкі, Н. Якавенка падкрэслівалі такую рысу мастака слова, як пошук незвычайнага ў звычайным. У пацверджанне прыведзенай думкі разгледзім аўтарскія апісанні. Звычайнае піва аўтар «малюе» наступным чынам: «…як вечаровы вятрыска раздзімае асцё ячменных каласоў, так і піток струменем паветра з лёгкіх разганяе ў куфлі пену піва, маючы намер спажыць каламуць раскатурханай хмелем ячменнай бездані» [3, с. 38]; паэты паўстаюць пчалярамі: «наладжваюць хаджэнне пчолаў, прадаюць на базары мёд, а на выручку выдаюць свае зборнікі вершаў» [3, с. 68]; акуляры аўтар называе пратэзам, што як «мыліца надточвае нагу, так акуляры – вочы» [3, с. 75].

Нягледзячы на тое, што аўтар прыйшоў у літаратуру як паэт, замалёўкі, апавяданні, мініяцюры, эсэ з асаблівасцямі дзённікавых запісаў сталі сапраўднай вяршыняй яго творчасці. Асаблівай увагі заслугоўваюць дзённікавыя запісы аўтара («З мамай», «Уроссып» і інш.). Для іх характэрны адсутнасць храналагічнай паслядоўнасці выкладу матэрыялу і прывязка кожнай падзеі да канкрэтнай даты.

Калі чытаеш апавяданні, лірычныя замалёўкі, запісы С. Рублеўскага, звяртаеш увагу на аўтарскі стыль – дакладнасць, дасканаласць, паэтычнасць, майстэрства мастацкай дэталі, багацце вобразнай мовы. Усё гэта дазваляе сцвярджаць, што творчасць віцебскага празаіка мае шмат агульнага са спадчынай класіка беларускай літаратуры Я. Брыля. Абодва – лірыкі па спосабе адлюстравання рэчаіснасці, манеры пісьма; у іх творах выразна выяўляюцца адметнасці асобы, рэчы, з’явы, раскрываюцца індывідуальныя характары. Падобныя нават па назве зборнік мініяцюр Я. Брыля «Жменя сонечных промняў» і літаратурныя запісы С. Рублеўскага «Жменя самасейнай цыбулі».

Такім чынам, С. Рублеўскі творча самарэалізаваўся ў жанры малой прозы. Для яго самабытнага таленту характэрныя асаблівая назіральнасць, вытанчанасць успрыняцця, эмацыянальная чуйнасць, увага да тонкіх зрухаў чалавечага быцця, інтэлектуальна-стылёвая далікатнасць, асацыятыўнасць мастацкага мыслення. Заслугоўвае ўвагі і мова твораў празаіка, каларытная, жывая, якая ўяўляе сінтэз уласна беларускай, іншамоўнай, нейтральнай і стылістычна абмежаванай лексікі. А самае галоўнае, віцебскі празаік з’яўляецца выдатным знаўцам чалавечай душы, таленавітым мастаком нашага звычайнага і незвычайнага жыцця.

ЛІТАРАТУРА

1. **Рублеўскі, С.** Абмытыя валуны / С. Рублеўскі. – Мінск : Логвінаў, 2005. – 223 с.
2. **Рублеўскі, С.** Апостраф : тэксты аб праявах быцця / С. Рублеўскі. – Мінск : Асобны дах, 2000. – 216 с.
3. **Рублеўскі, С.** Азярод : апавяданні, эсэ / С. Рублеўскі. – Мінск : БДУ, 2003. – 193 с.
4. **Тлумачальны** слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад агул. рэд. К. Крапівы. – Мінск : БелСЭ. – 1977. – Т. 1 : А – В / рэд. М. П. Лобан. – 605 с.
5. **Якавенка, Н.** Услед за Калумбам / Н. Якавенка // ЛіМ. – 2006. – 9 чэрв. – С. 7.

Свецік В.Л. *(г. Віцебск)*

СІСТЭМА МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У ЖЫЦЦІ І ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Калі задумваешся над гісторыяй развіцця беларускай нацыянальнай паэзіі XX ст., яе зместам і формай, міжволі прыходзіш да ўсведамлення асноватворнай місіі ў ёй народнага паэта Беларусі Максіма Танка (1912–1995). Шмат чаго ўмяшчае ў сабе паняцце «танкаўская паэзія»: узоры вершаў, выкананых на вышэйшым узроўні сучаснай паэтычнай культуры, праблемны матэрыял для разгадкі перадавых шляхоў, сапраўднага мастацтва і наватарскай сутнасці самога паэта. Тут яго ажыццяўленне важнейшых высноў эстэтычнай канцэпцыі, філасофія паэтычнай творчасці. Падчас складанага працэсу асэнсавання асаблівасцей жыццёвага шляху і творчага ўзыходжання М. Танка ўзнікла думка: паэт жыў у складаны час. Што ж давала яму духоўную падтрымку, моц, упэўненасць у сабе, нягледзячы на шматлікія выпрабаванні лёсу? Захацелася паглядзець на асобу паэта не толькі і не столькі як мастака, творцу, але як чалавека, сына, мужа, сваяка, увогуле, асобу.

Навізна даследавання. Лірыка М. Танка вывучалася многімі даследчыкамі, але тое, што фарміравала асобу творцы, натхняла і дапамагала жыць, служыла невычэрпнай крыніцай для асэнсавання ўласнага жыцця і грамадскага вопыту, чаму прысвечана мноства вершаў паэта, яшчэ не даследавана належным чынам.

Мэтай даследавання выступае сістэма маральна-этычных каштоўнасцей, яе ўплыў на фарміраванне асобы паэта і яго творчасць.

Матэрыялам даследавання з'яўляюцца вершы, дзённікавыя запісы М. Танка, эксклюзіўныя матэрыялы з сямейнага архіва сям'і Скурко: выданні ранніх кніг (арыгіналы), а таксама арыгіналы лістоў брату Фёдару, лісты М. Танка ягоным бацькам, віншавальныя паштоўкі да розных свят, напісаная

лацінкаю на беларускай мове паштоўка, якая адрасавана бацькам і падпісана імем Аўген, якое мы, хоць і прагледзелі шмат літаратурных крыніц, нідзе не сустрэлі.

Прадмет даследавання – сістэма маральна-этычных каштоўнасцей у асабістым жыцці і творчасці М. Танка. Для навуковага аналізу абраны прыёмы апісальнага і праблемна-пошукавага метадаў, а таксама аналізу і сінтэзу, абстрагавання, мадэлявання. Практычныя (эмпірычныя) метады даследавання: інтэрв'ю і гутарка, фатаграфаванне і відэаздымка.

Вынікі і іх абмеркаванне. У аснове даследчай працы ляжаць успаміны пляменніка паэта, Івана Фёдаравіча Скурко, які жыве ў Віцебску і з'яўляецца фактычна адзіным захавальнікам сямейнага котлішча М. Танка, хаты ў в. Пількаўшчыне, дзе нарадзіўся наш вялікі нацыянальны паэт. Успаміны пра сваю сям'ю, пра тое, што павінна быць цікавым і дарагім цэлай беларускай нацыі, а для яго з'яўляецца сямейнай гісторыяй; пра тое, што наталяла і акрыляла душу вялікага беларуса, што служыла яму апорай у цяжкія моманты жыцця і крыніцай натхнення на працягу амаль 60-гадовага паэтычнага шляху. Што ж такога асаблівага расказаў нам Іван Фёдаравіч? Усе прадстаўнікі сям'і Скурко падтрымліваюць цесныя сувязі паміж сабой. На вачах сямейнікаў разгортвалася ўся біяграфія народнага паэта. Стасункі творцы са сваімі дзядулем і бабуляй, маці і сёстрамі, шматлікімі родзічамі, сямейнае жыццё, адносіны з таварышамі па пяры, землякамі, якія часта бывалі ў гасцінным доме паэта, давалі матэрыялы для творчасці, філасофскіх абагульненняў. Аказваецца, самыя важныя маральна-этычныя каштоўнасці сям'і Скурко банальна простыя і зразумелыя ўсім: гэта вялікая павага да працы, бязмерная любоў да Беларусі і яе народа, Нарачы, роднай в. Пількаўшчыны, бацькоўскай хаты, якой больш за стагоддзе, што ўскалыхала не адно пакаленне немаўлят гэтага роду, да несамавітага сялянскага быту і, канешне, да самых блізкіх, прабабкі і бабулі, прадзеда і дзеда, дзядзькі Фадзея, маці, сясцёр і брата. Падчас сустрэчы з пляменнікам паэта, І.Ф. Скурко, нам была перададзена першая кніга маладога М. Танка – «На этапах» (Вільня, 1936). Кнігу канфіскавалі, засталося толькі некалькі экзэмпляраў, адзін з якіх трымалі ў руках. Бацькі ведалі пра паэтычную дзейнасць сына, непакоіліся аб ім. Пра гэта сведчыць паштоўка, якую даслаў паэт сваім бацькам. Мы запыталіся ў пляменніка паэта, якія, на яго думку, чалавечыя каштоўнасці выхавалі М. Танка як чалавека, паэта, грамадскага дзеяча. Ён адказаў, што гэта, у першую чаргу, яго сям'я, праца, дружба, Радзіма, родная вёска Пількаўшчына.

Мы вырашылі знайсці ў творчасці паэта адлюстраванне вобразаў гэтых каштоўнасцей шляхам аналізу выдання «Збор твораў», выдадзенага ў серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» ў 2010 г. Кніга ўключае ўсе вядомыя вершы і паэмы паэта. У аснову выдання пакладзены храналагічны прынцып. Гэта дае магчымасць прасачыць станаўленне творчай індывідуальнасці

М. Танка, убачыць, у чым людское шчасце вялікага песняра. Паэтава разуменне шчасця традыцыйнае для беларуса, для нашага народа. Родная зямля для М. Танка заўсёды з'яўлялася падмуркам станаўлення яго як чалавека і песняра. На працягу ўсяго свайго творчага шляху паэт пастаянна вяртаўся думкамі да роднай Мядзельшчыны. У «Зборы твораў» мы налічылі 32 вершы, прысвечаныя ёй.

Вобраз Радзімы ў паэзіі Максіма Танка

Перад тым як вымавіць тваё імя, Радзіма,
Я апранаю чыстую кашулю.
Максім Танк

Бацькаўшчына для М. Танка заўсёды з'яўлялася вытокам станаўлення яго як чалавека і песняра. Тут ён чэрпаў, як з цудоўнай крыніцы, прыгожае і мудрае, адлюстроўваў радзіму ў сваіх вершах і паэмах. Узгадаваны ў найпрыгажэйшых мясцінах Мядзельскага і Нарачанскага краёў, М. Танк быў улюбёны ў тутэйшую беларускую прыроду і імкнуўся засведчыць свае пачуцці ў паэтычных радках, каб убачанае і перажытае ім засталося наступным пакаленням: «Ёсць такая зямля: дзень адзін пражывеш, // І адступяць ліхія нягоды, // Будзеш марыць аб ёй, будзе сніцца табе, // Будзеш помніць яе ты заўсёды…» [4, с. 447].

У кожнага адметнага талента свой лёс, свой шлях. І можна лічыць удалай заканамернасцю, што жыццё і творчасць М. Танка надзвычай моцна знітаваны з Мядзельскім і Нарачанскім краямі: «Люблю твае, Нарач, затокі і тоні, // Як вецер густыя туманы развесіць! // Ці снежная пена на хвалях зазвоніць, // Цалуючы зоры, калышучы месяц» [4, с. 194].

Нам гэтыя чыстыя, адухоўленыя радкі кладуцца на вусны так, як і радкі Я. Коласа «Мой родны кут, як ты мне мілы!» або К. Буйло «Люблю мой край, старонку гэту». Максім Танк глыбока ўпэўнены, што «на зямлі бацькоў няма бяздумных дрэў, маўклівых валуноў, негаваркіх дарог, нязвонячых крыніц» [4, с. 132]. Паэт здабываў свае «вясняныя» песні з жыватворных крыніц роднай зямлі, скаваў іх з кужалю міготкіх вясёлак і зарніц, лавіў невадам «з рэк нашага краю» [4, с. 132]. «Выцягнуў сетку цяжкую і чую, – казаў ён у вершы «Зноў загарэліся сосны» – песня жывая трапечацца ў ціне» [4, с. 348]. Якраз Бацькаўшчына-Беларусь, Нарачанскі край, мілая і дарагая душы і сэрцу Пількаўшчына, краса і веліч родных абшараў і краявідаў, жыццё працоўнага люду з'яўляліся крыніцамі паэтычнай уражлівасці паэта. Ужо напрыканцы жыцця, у 1991 г., была выдадзена кніга яго перакладаў «На зорных шляхах». На працягу ўсяго свайго творчага шляху паэт пастаянна вяртаўся думкамі да роднай Мядзельшчыны. У першым пасляваенным зборніку «Каб ведалі» ён пісаў, што «песня адлюстравалася ў тонях, у сініх азёрах маёй Мядзельшчыны». Гэты зборнік, датаваны 1946 г., таксама прадаставіў нам І.Ф. Скур-

ко. Мы з затоеным дыханнем перагортвалі зрудзелыя ад часу старонкі гэтай сямейнай рэліквіі, да якой дакраналіся рукі самога паэта і які так беражліва захоўваецца ў сям'і. Будучы ўжо прызнаным паэтам, М. Танк зноў вярнуўся да тэмы Радзімы.

Аб гэтым гаворыць і І. Скурко: «Калі не з'езджу ў Пількаўшчыну, яна пачынае мне сніцца кожную ноч».

Паэт часта прыязджаў у Мядзельскі раён. Яго вабілі бары і лясы роднага краю, любімая Нарач, якая была калыскай ягоных мар і памкненняў. Там жылі бацькі паэта, якіх неаднойчы наведваў адзін і разам з жонкай, дзецьмі. Там было яго лецішча. Там былі аднадумцы і суразмоўцы. На малую радзіму заўсёды запрашаў сваіх сяброў-пісьменнікаў. Паэт так сфармуляваў сваё жыццёвае крэда: «Трэба, хоць раз у год, // Прайсці басанож баразною за плугам, // Каб аднавіць // Сваю даўнюю сувязь з раднёй, // Зямлёй, каменнямі, травой» [4, с. 574].

Някідкі, сціплы пейзаж родных мясцін трывала ўвайшоў у паэзію М. Танка. У «Зборы твораў» паэта мы налічылі 32 вершы, прысвечаныя Мядзельшчыне. У кожнага творцы ёсць свой куток, як кажуць, «зямля запаветная», праз прызму якой мастак глядзіць на свет. Такім месцам для будучага М. Танка стала в. Пількаўшчына, дзе пабудавалі хату яго бацькі. Малая радзіма была той крыніцай натхнення, якая жывіла яго ўсё жыццё. Глыбіннае адчуванне М. Танкам прыроды і пантэістычна-вобразная прысутнасць яе ў паэтавай лірыцы ідуць у нейкай ступені і ад тых рэчак дзяцінства, гоману навакольнага бору, пяшчотнай раскошы тоняў Нарачы, прачула апетай лірыкам. Па сутнасці, адчуванне паяднання зямлі і космасу было ў паэта на генным узроўні, перанятае ад роду спрадвечных земляробаў і рыбакоў: «Аслепшы, // Яшчэ можна з кульбакай // Дарогу дадому знайсці, // Аглухшы, // Яшчэ будзеш чуць // Скрып дзвярэй сваёй хаты… // Толькі страціўшы радзіму, // Будзеш, як камень, // Сляпы, і глухі, і нямы» [4, с. 392].

Даследуючы творчасць М. Танка, мы ўсвядомілі, што паэт глыбока перакананы: уся яго творчасць, усе яго песні – ад роднай зямлі: «І калі пачаў я – // Жменьку за жменькай // Прасяваць нашу зямлю, // Убачыў на дне рэшата // песні» [4, с. 196].

У сям'і Скурко больш за ўсе цанілася працавітасць: «Усе вартасці, ісціны меру // Я мужыцкім аршынам – працай». Значную прастору ў паэзіі М. Танка займаюць аўтабіяграфічныя творы. Шмат вершаў прысвяціў ён сваім блізкім: бабулі Ульяне, дзеду, бацьку, маме, каханай жонцы, сваім дзецям і ўнукам. Паэт даражыў кожнай дробяззю, кожным імгненнем, звязаным са сваімі блізкімі. Гэта мы вызначылі шляхам аналізу твораў М. Танка. Вобраз маці будзе сілкаваць сацыяльна-маральную энергетыку паэта ўсё яго жыццё. «Матчына малітва… не раз вяртала» мастака «нават з-за свету» [4, с. 241].

Прааналізавана больш за 100 вершаў М. Танка з розных этапаў яго творчасці. У выніку праведзенага даследавання маральна-этычных каштоўна-

сцей у паэзіі песняра былі зроблены наступныя высновы. З малалецтва чалавек як асоба фарміруецца ў сям'і. Станаўленне асобы паэта адбывалася на аснове прынцыпаў сямейнай педагогікі сям'і Скурко: павагі да свайго роду, бацькоў, вернасці сямейным традыцыям, радзіме, хлебу як плёну чалавечых рук. Гэта спрыяла духоўнаму і інтэлектуальнаму развіццю ў першую чаргу чалавека, а таксама мастака слова. Сістэму маральна-этычных каштоўнасцей Танка-чалавека і Танка-творцы складаюць простыя ісціны: вялікая любоў і падзяка роднаму краю, роднаму кутку, роднай мове, хлебу, хаце, што ўзгадавала, і самым блізкім людзям – сваёй сям'і.

ЛІТАРАТУРА

1. **Арочка, М.** Максім Танк: жыццё ў паэзіі / М. Арочка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 351 с.

2. **Калеснік, У.** Максім Танк : нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 273 с.

3. **Мікуліч, М.** На скразняках стагоддзя / М. Мікуліч. – Мінск : Маст. літ., 1937. – 359 с.

4. **Танк, М.** Збор твораў / М. Танк ; прадм. М. Мікуліча. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 1008 с. – (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

Синкевич Т.И. *(г. Витебск)*

НАЗВАНИЯ ОЗЕР – КУЛЬТУРНО-ИСТОРИЧЕСКОЕ НАСЛЕДИЕ НАШИХ ПРЕДКОВ

Названия озер – это своеобразные знаки, понять содержание и значение которых можно, опираясь на разнообразные исторические, типологические и лингвистические данные. При этом важно изучать как сами объекты, так и окружающий их ландшафт, а также источники нематериального наследия традиционной культуры, которые позволяют понять развитие и изменение этнических стереотипов отношения с окружающей средой.

Озеро Балдучица расположено в Поставском районе Витебской области, в 32 км на юго-запад от Постав, примерно в 0,9 км на северо-запад от д. Вайшкуны, относится к Балдукской группе озер, на территории ландшафтного заказника «Голубые озера», созданного в 1972 г. для сохранения природного комплекса, называемого «белорусской Швейцарией» в Белорусском Поозерье. Относится озеро к бассейну р. Страча. Местность там грядисто-холмистая, большей частью густо заросшая лесом и кустарником, местами болотистая. Озеро окружено широкой (до 100 м) заболоченной поймой, поросшей водно-болотной растительностью. Берега преимущественно низ-

кие, песчаные, поросшие кустарником, местами лесом. Мелководье узкое, песчаное, глубже дно илистое и сапропелистое. Зарастает озеро умеренно. У этого озера, как и у многих озер на территории Белорусского Поозерья, есть своя легенда. Она существует с древних времен. А звучит она так: «Жил в этих красивых местах могучий кузнец Балдук со своей миниатюрной женой Балдучицей. Здесь же в дремучих лесах обитал злой колдун, желавший выжить людей из этих мест. Наслал он злые чары на селян, а те, перессорившись, схватились за топоры и ножи. И лишь Балдук с Балдучицей не поддались колдовству. Спасая односельчан от массовой резни, они взялись за руки, чтобы усилить свою духовную связь, и превратили всех людей в журавлей. Те разлетелись и, приземляясь, вновь обретали человеческий облик, основывали новые поселения. А Балдук с Балдучицей, потеряв всю свою силу, энергию, превратились в два озера. Ну, а их руки, за которые они держались, стали протокой между озерами. Дух злого колдуна не оставляет их в покое и поныне: насылает водную растительность на узкую протоку, чтобы заросла она полностью и разъединила его обидчиков». Действительно, к поздней осени протока совершенно зарастает, но весной сбрасывает она колдовские покровы, вновь веселым журчанием воды говорит людям о том, что колдун не смог победить великую силу добра. Это лишь одна из красивых легенд.

Совсем недавно ученые обследовали территорию близ озера Балдучиц и само озеро. В результате исследования к каким-либо однозначным выводам ученые не пришли. Но они уверены, что в районе уникального озера находится аномальная зона. Специалисты утверждают, что озеро является так называемым сакральным местом. Да и местные жители заметили, что с водоемом что-то не так. Сюда не залетают птицы и не заходит домашний скот. Есть еще одна легенда, которая повествует об этом озере. «Когда-то жили в тех местах несколько семей. Среди них – богатырь Ячменек. Золотые он руки имел: дом себе построил, любая работа у него спорилась. Делал он напиток хмельной да соседей угощал – от того и прозвище свое получил. И вот однажды на ярмарке, выпив напитка Ячменька, люди танцевали – да один поселянин своей соседке на ногу наступил. Прощения попросил, но не стала она слушать: «Балда ты, Балдук!» – кричит. И он в долгу не остался: «Ах, так! Значит ты – Балдучица, злая волчица!». Поссорившись, разошлись, но не помирились. И чтобы отгородиться друг от друга, принялись пруды копать, а из земли той насыпали холмы. И ни один от другого отстать не хочет. Балдук выкопал водоем большой, а Балдучица – поменьше. Но сама природа словно хотела их помирить: образовалась между озерами Балдук и Балдучица протока, которая словно просила: «Протяните же друг другу руку примирения!». Но Балдук рассердился и к колдовству прибег: с тех пор к осени зарастает та протока, но с каждой весной вновь освобождается. Мало ему показалось – позвал на помощь нечистую силу и дальше принялся ко-

пать, командуя: «Глубже, глубже!». Вода быстро заполнила яму – и родилось озеро Глубля. Балдучица вслед за ним выкопала озеро Глубельку – маленькое, зато красивое. Балдук рассердился – и принялся стрелы из лука на холм соседки пускать. Но падали те стрелы на землю и тут же прорастали, становясь деревьями. От злости потекли из глаз Балдука слезы и затопили небольшую впадинку. Получилось озерцо, но мертвое, так как слишком много гнева было в тех слезах. До сих пор в озерце Мертвом нет рыбы, а вода его иссиня-черная. Увидев, как воюют соседи, испугался Ячменек и тоже водоем себе выкопал. Но спешил, и получился он совсем маленьким, как раз в форме зернышка Ячменя. Тогда богатырь придумал защититься от соседей мечами. Нес их домой, да положил мечи на берегу своего озерца, чтобы передохнуть, а тут ветер налетел – мечи в волнах и утонули. Произошло чудо: все оружие превратилось в меч-траву. Кстати, это растение занесено в Красную книгу Республики Беларусь и встречается только в заказнике «Голубые озера». Балдучица тем временем стала бросать в воду известковые камни, чтобы на зависть соседям сделать свои озера самыми красивыми. И стали они голубыми. Увидел это Балдук и понял, что нужно примириться, а Балдучица и сама рада была повиниться. Обнялись они и прослезились, а из тех слез появилась река Страча. В честь примирения выкопали соседи еще одно озеро – и назвали его Болтиком…, а по форме оно напоминает сердце».

Какова же этимология названия озера Балдук, какая примета, особенность выделяет его из ряда других, ему подобных? Славянское это название или нет? Надо отметить, что озера с таким названием встречаются на территории не только современной Беларуси, но и на территории России, Польши, Словакии, Литвы. Как мы полагаем, названия озер Балдук и Балдучица содержат в своем составе одинаковый корень – балд (болт-) – ср. также польск. bolt «болт» заимств. из нж.-нем. bolt(e) или голландск. bout; см. Маценауэр 115 и сл., Преобр. 1,35; Корбут 402; 457; русск. «болт» – «шест для ботанья рыбы» (на Чудском озере), к-е Бенекер 1,118. возводит к слав. *bьlt см. болтать – «приводить в движение». То есть в названиях озер мы, возможно, найдем отражение связи названия озера с рыболовным промыслом, процветавшим некогда здесь, а может быть в основу наименования была положена просто физико-географическая примета – движение воды, «болтанка» [5].

Названия озер, будучи гидрографическими объектами, характеризуются, прежде всего, по своим качествам, признакам, форме и т. д. Мотивирующими ориентирами в процессе номинации является воздействие естественной реалии на органы чувств человека, степень ее утилитарности для человека, роль водного объекта в жизни коллектива. Часто в семантике лимнонимов находят отражение и первообразные смыслы, представленные древними исходными лексемами, отражающими первичные этапы познания окружающего естественного мира.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Вашкевич, Н.** Утраченная мудрость : истоки древних цивилизаций, тайны слова, именное кодирование / Н. Вашкевич. – Москва, 1966.

2. **Даль, В. И.** Толковый словарь живого великорусского языка : в 4 т. / В. И. Даль. – Москва, 1976.

3. **Иванов, В. В.** Исследования в области славянских древностей / В. В. Иванов, В. И. Топоров. – Москва, 1984.

4. **Словарь** русского языка XI–XVII вв. / гл. ред.: С. Г. Бархударов (вып. 1–6), Ф. П. Филин (вып. 7–10), Д. И. Шмелев (вып. 11–14), Г. А. Богатова (вып. 15–26), В. Б. Крысько (вып. 27–). – Москва : Наука, 1975.

5. **Фасмер, М.** Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер. – Москва, 1987. – Т. 3. – С. 585.

6. **Этимологический** словарь славянских языков : праславянский лексический фонд / под ред. О. Н. Трубачева. – Москва : Наука, 1974.

7. **Hydronimia** Odry : Wykaz nazw w ukladzie hydrograficznym / pod red. H. Borka. – Opole, 1983.

Слесарева Т.П. *(г. Витебск)*

ЭПИТЕТ-КОЛОРАТИВ КРАСНЫЙ В ПЕСЕННЫХ ТЕКСТАХ ВИТЕБСКОГО ПООЗЕРЬЯ: СЕМАНТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

Цвет всегда имел и имеет большое значение в жизни человека, поэтому в литературе слова-цветообозначения становятся своеобразными символами, а каждый отдельно взятый колоратив занимает свое определенное место в цветовой картине художественного произведения, так как известно, что «каждый языковой факт, подчиненный художественному заданию, становится поэтическим приемом. Предварительная работа с цветописью не вызывает особых затруднений, а выстраивание логических цветовых параллелей, соотнесение их с событиями и образами героев, позволяет повысить уровень языковой зоркости и аналитического мышления. Лингвистический анализ художественного текста дает возможность увидеть то взаимодействие изобразительно-выразительных средств, которое представляет собой динамическое единство и ощущается в живом движении контекста» [1, с. 25].

В настоящее время существуют многочисленные исследования, посвященные описанию функционирования цветообозначений в художественных текстах, цветовой символике отдельных цветообозначений в языке писателей и поэтов, особенностям цветообозначения в аспекте перевода.

В фольклоре эпитет характеризует, оценивает, индивидуализирует предмет или явление, переносит на него свое значение, участвуя в создании

художественного образа. Поэтому эпитет является важным элементом стилистики народнопоэтического текста.

Цветообозначения играют важную роль, поскольку они составляют языковую основу зрительно-цветовой образности. В изобразительно-выразительной функции колоративы призваны привлечь внимание адресата. Они нужны, чтобы картины, нарисованные пером художника слова, были как можно более верно и точно восприняты органами чувств читателя, а психологический настрой, эмоции, испытываемые героями, стали более близки ему.

Колоративы в изобразительной функции способствуют созданию наглядной, живописной художественной реальности, отличающейся богатством красок.

Вводя колоративы в текст произведений и используя их в той или иной функции, авторы опираются на фоновое знание о символических значениях тех или иных цветов в культуре. Их неоднократное упоминание вызывает определенные ассоциации у читателя.

Северную часть территории республики занимает Белорусское Поозерье, которое в административном отношении включает Витебскую, северо-восток Гродненской и север Минской областей. Своеобразие культуры Поозерья во многом обусловлено ее более тесными связями с соседними русскими регионами. Свое влияние оказала и общая древняя этноплеменная основа – культура кривичей.

Очень важное место в фольклоре занимает народная поэзия. Именно в ней глубоко и полно выражается отношение народа к жизни, переданы чувства и настроения.

Нами проанализирована 491 песня, собранная на Витебщине за 1985–2005 гг. Все материалы, как указывает редактор-составитель антологии «Народная лирика Витебского Поозерья» Валентина Поклонская, оригинальны, их нет в печатных источниках [2].

Из военно-патриотических, семейно-бытовых, любовных, удалых и философских песен путем сплошной выборки нами выписаны 22 эпитета-колоратива: *красный* (22 словоупотребления), *белый* (20), *зеленый* (16), *голубой (11), черный (10), синий* (7), *серый (6), лазоревый (2), золотой (2)* и по одному словоупотреблению таких прилагательных, обозначающих цвет, как *зелененький, алый, аленький, багряно-красный, вишневый, карий, темный, желтый, прозрачно-желтый, золотистый, пестрый, пунцовый и розовый.* Всего, таким образом, нами зафиксировано 109 словоупотреблений эпитетов-колоративов, которые в текстах сочетаются с разными существительными, реализуя при этом различные значения.

Языковой материал позволяет отметить, что самым распространенным эпитетом в песенных текстах является эпитет *красный* (22 словоупотребления, или 20%), который сочетается с такими именами существительными,

как *девица* (11 сочетаний), *сапожки* (2), *солнце* (2), *весна, лето, рябина, калина, розы, смородина* (по 1 сочетанию).

Никакой другой цвет не отражает в своей символике такие сильные противоречия, как *красный*. Красный цвет был особенно популярен с древности. Считается, что он легко узнается и выделяется людьми из-за своей яркости, насыщенности. Это очень эмоциональный и символичный цвет, возможно, поэтому во многих языках для обозначения красного цвета и его оттенков имеется большое количество лексем, как, например, в русском.

Иерархия значений эпитета *красный* в песенных текстах примерно такова: 1) значение цвета (*красные сапожки (2), красные розы*):

А сапожки-то сафьяновые,
сафьяновые, красные [2, с. 97];
Зацвели твои красные розы [2, с. 139]*;*

2) «красивый» (*красные девицы* (11)):

А ему навстречу
Красна девица:
«Красна девица,
Дай воды напиться» [2, с. 126];
Может, встречу во широком поле
Судьбу свою, судьбу свою –
Красну девицу [2, с. 63];
Не дали мне на волюшке пожить,
красных девушек любить [2, с. 90];

3) ясный, светлый (нар.-поэт.) (*красное солнце* (2)):

Поднялося солнце красное [2, с. 101];

4) в сочетании с фитонимами реализует значение «спелый» (*красная калина, красная рябина, красная смородина*)*:*

Уж в лесу калина красная налилася соком [2, с. 144];
А коли рябина красна,
Знай: скоро наступит ненастье [2, с. 176];
Красная смародзіна,
Ці баішся ты марозу? [2, с. 100].

Зафиксированы нами также такие характерные для фольклорных жанров сочетания колоратива *красный* с существительными, называющими пору года, как *лето красное* и *весна красная:*

Пусть лето красное
Опять воротится [2, с. 184].

Одно словоупотребление, отмеченное нами, обнаруживает прилагательное *красный* в составе имени собственного (*Красная горка):*

Отчего на Красной горке
Все ребята – женихи? [2, с. 147].

Как видно из примеров, значение эпитета *красный* в песнях немного расходится со значением этого прилагательного в современном русском языке.

Среди оттенков красного цвета в песенных текстах нами выделены следующие: *розовый:*

Как будто в розовом бутоне
Мое сердечко заперто [2, с. 136];

вишневый:

Я наброшу на плечи
Ту вишневую шаль,
Что дарил ты когда-то,
Может, скрою печаль [2, с. 125];

пунцовый:

Вновь пунцовою стала рябина [2, с. 141];

багряно-красный:

Дарил ты розы мне
Багряно-красные [2 с. 183];

алый / аленький:

Как пойду я во садочек,
Сорву аленький цветочек [2, с. 119].

Приведенные материалы и наблюдения показывают, насколько богато и разнообразно в песенном фольклоре применение эпитета-колоратива *красный*, который способствует точному и четкому обозначению, создает яркие зрительные образы путем выделения отличительных качеств.

Народная память сохранила историческую семантику в данном колоративе, хотя в современном русском литературном языке семантика прилагательного *красный* значительно шире.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Маслова, В. А.** Филологический анализ поэтического текста / В. А. Маслова. – Мінск : Выш. шк., 1997. – 220 с.

2. **Народная** лирика Витебского Поозерья : антология / ред.-сост. В. Н. Поклонская. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2007. – 256 с.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ Ў СІСТЭМЕ СУЧАСНАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Дедюлина Л.Б. *(г. Полоцк)*

БИОБИБЛИОГРАФИЧЕСКИЙ УКАЗАТЕЛЬ «ИССЛЕДОВАТЕЛИ ПОЛОТЧИНЫ XVI – НАЧАЛА XXI в.» КАК ОДИН ИЗ ИСТОЧНИКОВ СОХРАНЕНИЯ ИСТОРИЧЕСКОЙ ИНФОРМАЦИИ О ПОЛОЦКЕ

Любая страна, любой город имеют свою насыщенную событиями и людьми историю. Памятники архитектуры и увековеченные в камне выдающиеся личности, рукописные летописи, памятные даты – все это является теми корнями, которые питают человека, без которых он не может двигаться вперед. Наш Полоцкий край особенно богат своей историей, изучением которой занимались многие исследователи, и каждый полочанин должен знать историю нашего древнего города и гордиться ею.

В 2010 г. совместно с заведующей Краеведческим музеем Национального Полоцкого историко-культурного музея-заповедника И.П. Водневой было проведено мероприятие, посвященное 110-летию со дня рождения полоцкого краеведа И.П. Дейниса, и, готовясь к этому вечеру, мы решили собрать материал об исследователях Полоцка.

К 1150-летию Полоцка в Центральной городской библиотеке им. Ф. Скорины и был создан биобиблиографический указатель «Исследователи Полотчины XVI – начала XXI в.».

При подготовке указателя использовались данные, включенные в краеведческую картотеку Центральной городской библиотеки им. Ф. Скорины, где собрано более 30 тыс. записей о Полотчине, а также «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», «Кніжны летапіс», «Летапіс газетных артыкулаў», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Новая літаратура па гісторыі і гістарычных навуках» (1990, 1991, 1992, 1993) и другие источники.

Вторым человеком, имеющим отношение к созданию ресурса, был полоцкий краевед В.Р. Карасев. Он подарил нашей библиотеке книгу кандидата исторических наук Н.В. Пивовара «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.». Это и стало отправной точкой в создании биобиблиографического указателя. Когда велась работа по поиску персоналий, вышла вторая книга Н.В. Пивовара «Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й паловы XX – па-

чатку XXI ст.». Побывав на презентации книги в Полоцком районном центре ремесел и национальных культур, мы поняли, что находимся на правильном пути, и продолжили работу над созданием пособия.

При подборе литературы использовались электронные каталоги Национальной библиотеки Беларуси, Витебской областной библиотеки им. В.И. Ленина, библиотеки Полоцкого государственного университета и др.

В поиске материалов помогли многие российские сайты, на которых размещена информация об исторических личностях.

Основа персоналий была взята из книг Н.В. Пивовара, но в процессе работы, когда появлялись рецензии на пособие, мы постоянно дорабатывали этот список, включая все новые имена.

За пять лет указатель четырежды дополнялся. Первоначально он представлял собой одну книгу, включающую информацию о 150 персоналиях. Издание содержало материалы как на русском, так и на белорусском языках и состояло из четырех частей: первая рассказывала об изучении Полоцка в XVI – первой половине XIX в.; во второй части освещались вопросы исследования Полоцка во второй половине XIX – первой половине XX в.; в третьей представлена информация об изучении Полоцка во второй половине XX – XXI в.; четвертая часть посвящена полоцким краеведам.

Каждая фамилия сопровождается краткими биографическими данными, а также списками материалов, изданных данным автором, и источников, в которых отражаются сведения о жизни и деятельности исследователя.

В 2012 г. указатель разделили на 4 части (279 персоналий), в 2014 г. мы его доработали и исправили – в нем стало 5 частей (376 персоналий). Материалы в издании расположены в алфавите персоналий.

В 2016 г. мы возобновили работу и дополнили список новыми персоналиями, теперь указатель будет состоять из 7 частей (500 персоналий). В преддверии празднования 500-летия белорусского книгопечатания были добавлены в указатель персоналии, которые занимались изучением скоринианы.

В биобиблиографическом пособии собрана информация о жизни и деятельности людей, которые изучали историю Полоцка, Полоцкого района, исторических личностей: Евфросинии Полоцкой, Симеона Полоцкого, Франциска Скорины, полоцких князей.

По различным вопросам политической истории, культурной жизни, археологических исследований Полотчины написано огромное количество работ. Свои исторические труды и литературные произведения Полоцку посвящали ученые, историки, археологи, краеведы, архивисты, музейные работники, путешественники и коллекционеры, писатели, журналисты, а также учителя и библиотекари.

Наибольший вклад в исследование жизни и деятельности Франциска Скорины, великого белорусского просветителя, его изданий внесли русские и белорусские скориноведы, такие, как Е. Карский, В. Пичета, П. Владими-

ров, А. Флоровский, а в наше время – В. Агиевич, Н. Алексютович, П. Алексеев, В. Аниченко, М. Ботвинник, А. Белый, В. Болбас, С. Брага, А. Булыко, Г. Голенченко, В. Дорошкевич, И. Дворчанин, Я. Дроздович, В. Колесник, В. Короткевич, А. Кавко, Г. Киселев, А. Клышко, В. Конон, Ю. Лабынцев, В. Лиходедов, О. Лойко, С. Майхрович, А. Мальдис, А. Надсан, Е. Немировский, С. Подокшин, А. Петрашкевич, Н. Прашкович, И. Саверченко, Н. Садкович, Б. Сапунов, М. Судник, А. Суша, К. Усович, В. Чапко, В. Шалькевич, В. Шматов и др.

Среди персоналий, включенных в биобиблиографический указатель, такие историки, как Л. Алексеев, Г. Голенченко, К. Говорский, Н. Пивовар, С. Тарасов, В. Чаропка, Г. Штыхов, Н. Ермолович, Э. Загорульский.

Свои литературные произведения посвятили Полоцку его уроженцы В. Орлов, П. Васюченко, П. Бровка, В. Лукша, Т. Хадкевич, а также почетные граждане древнейшего города Беларуси А. Савицкий и Н. Гальперович.

Полочанин В.А. Лиходедов много сделал для сохранения истории, коллекционируя старые почтовые открытки. Его собирательское радение в России отмечено медалью «За большой вклад в развитие коллекционного дела в России». По словам К. Ладутько, «…ведь неизмеримо больше частный коллекционер, патриот своей страны, сделал не для России, а для родной Беларуси, для Полоцка, где он родился и вырос. И, наверное, по сути своей общественной работы, по сути своих неравнодушных исторических поисков Владимир Алексеевич много сделал для Полоцка, увековечения памяти о полоцкой истории. По праву ему носить бы и звание почетного гражданина древнего города. Впрочем, это решать самим полочанам…».

Изучением наследия Симеона Полоцкого занимались Г. Гайдук, С. Гаранин, Л. Звонарева, Л. Сазонова, Л. Сидорович, О. Шульченко и др.

Достояние Евфросинии Полоцкой исследовали Л. Горошко, М. Дубровский, В. Ковтун, Н. Кузьмич, Л. Левшун, А. Мельников, К. Сербинович, иеромонах Сергий, Н. Серегина, Э. Ярмоленко и др.

Важный вклад в изучение Полоцкого края внесли местные краеведы В.И. Лихачев, Н.А. Манис, С.А. Клоков, И.С. Вильчинский, В.Р. Карасев, Л.Ф. Данько, И.И. Калиновский, С.И. Поляков, И.П. Дейнис, С. и В. Глушковы и др.

Наше издание мы рекомендуем историкам, краеведам, преподавателям, аспирантам, студентам, библиотекарям, школьникам, всем тем, кто интересуется историей Полоцка.

В биобиблиографическом пособии свои автографы и пожелания оставили Н. Гальперович, А. Савицкий, В. Карасев, А. Соловьев, А. Суша, Л. Малашеня, И. Шупенько, Н. Сергеенко, В. Крюк, Алексей и Андрей Буховецкие.

Археологические исследования в Полоцке продолжаются, интереснейшие открытия еще ожидаются впереди, и появятся новые люди, которые будут изучать историю древнего города, и, возможно, дополнят наш био-

библиографический указатель в будущем. Каждый человек должен знать и помнить историю того места, где он родился, любить свой край, знать тех, кто занимался изучением истории малой родины.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Ладутько, К.** Старая почтовая открытка : уроки любви к истории и Отечеству / К. Ладутько // Нёман. – 2013. – № 7. – С. 215–217.

2. **Півавар, М. В.** Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г. : даведнік / М. В. Півавар. – Віцебск : Віцеб. абл. друк, 2006. – 176 с.

3. **Півавар, М. В.** Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст. : біябібліягр. даведнік / М. В. Півавар. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 372 с.

Ермалёнак В.А. *(г. Мёры, Віцебская вобласць)*

СТАРЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ВЫДАННІ Ў МУЗЕІ КНІГІ І ДРУКУ ДУА «МІЁРСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 3 ІМЯ ГЕРОЯ САВЕЦКАГА САЮЗА ЯГОРА АНДРЭЕВІЧА ТОМКІ»

Беларускія друкаваныя выданні змешчаны ў чатырох раздзелах экспазіцыі музея: «Старая беларуская кніга», «Часопісы», «Газеты», «Календары».

Якім чынам траплялі беларускія выданні на Мёршчыну і Дзісеншчыну? Перш за ўсё дзякуючы намаганням прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху, што паходзяць з нашай мясцовасці: Пятра Простага (І. Бобіча), Янкі Пачопкі, Флора Манцэвіча, Браніслава Туронка, Язэпа Малецкага, Чэслава Сіповіча, Міколы Шкялёнка, Кузьмы Крука, Яўгена Аніські і шмат іншых. Вялікую ролю ў распаўсюджванні такіх выданняў адыгралі гурткі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, якія актыўна дзейнічалі ў міжваенныя гады ў Шальцінах, Павяцці, Мілашове, Дрыгучах і іншых мясцінах.

У гады Рэчы Паспалітай шмат карэспандэнтаў з Дзісеншчыны пісалі вершы, артыкулы, замалёўкі ў беларускія выданні: Генадзь Дзямешка, Павел Сушко, Пятро Ларычонак, Мікола Дварэцкі і інш. У якасці ганарару ім дасылаліся беларускія газеты і часопісы.

Пасля вайны большая частка выданняў на беларускай мове была знішчана як непатрэбная, бо не адлюстроўвала сацыялістычную рэчаіснасць, ды і ўсе несавецкія выданні лічыліся варожымі, пры Сталіне толькі за іх захоўванне можна было атрымаць да 10 гадоў лагераў.

Тым не менш, нягледзячы на небяспеку, людзі збераглі шматлікае. Дзякуючы іх падарункам і нашай пошукавай дзейнасці ў фондах музея захавалася дастаткова вялікая колькасць асобнікаў беларускага друку першай паловы XX ст.

Цалкам прысвечаны такім выданням раздзел «Старая беларуская кніга», дзе змешчаны дакументы канца XIX – 50-х гг. XX ст. на беларускай мове, набраныя кірыліцай і лацінкай. Частка кніг знаходзіцца ў навукова-дапаможных фондах музея. У адрозненне ад іншых раздзелаў музея тут няма шыкоўных выданняў у скураных вокладках з залатым цісненнем літар.

Сярод беларусаў не было мецэнатаў, таму работу над выпускам першых выданняў беларускія адраджэнцы здзейснілі ў незвычайна цяжкіх умовах. Беларусь знаходзілася пад жорсткім прыгнётам Расійскай Імперыі, дзе наогул да 1905 г. забаранялася друкаваць беларускія кнігі, адсутнічалі беларускія школы. Але, не зважаючы ні на што, вялікай была прага народа да роднага слова, – і такія выданні з'явіліся. Большасць з іх – тонкія, сціплыя кніжачкі, надрукаваныя на самай таннай жоўтай паперы, якія і разлічаны былі на сялянства або вясковую інтэлігенцыю. Самая старая беларуская кніга, якая змешчана ў гэтым раздзеле – «Дудка беларуская». Напісана яна славутым Францішкам Багушэвічам і выдадзена ў Кракаве на лацінцы ў 1891 г. Пра тое, што беларускі народ любіў паэзію Багушэвіча, сведчыць і перавыданне яго твораў у Заходняй Беларусі. Побач змешчана віленскае выданне «Дудкі беларускай» 1924 г. Пасля царскага маніфеста 1905 г. беларускія кнігі было дазволена выдаваць і ў Расійскай Імперыі. Галоўнымі выдавецкімі цэнтрамі сталі «Загляне сонца і ў наша ваконца» ў Пецярбургу і друкарня Марціна Кухты ў Вільні.

Менавіта з апошняй друкарні і паходзяць асноўныя экспанаты нашай музейнай калекцыі. Там жа была выпушчана ў 1914 г. і кніга нашага земляка Пётры Беларуса (Пётры Яленскага) з в. Міранкі ля Узмёнаў пад назвай «Якім Бяздольны». У ёй аўтар расказвае аб трагедыі беларускага селяніна ў тыя часы. З 1913 г. аўтар быў актыўным карэспандэнтам «Нашай нівы», дзе змяшчаліся яго творы «У кузні», «Чуткі з-пад Дзісны», «Забойства» і інш. Першая кніга Максіма Гарэцкага «Рунь» гэтага ж года выдання таксама знаходзіцца ў экспазіцыі музея. Рарытэтам з'яўляецца надрукаваная ў выдавецтве Марціна Кухты ў 1915 г. кніжка Сцёпкі Бірылы «Стражнік». Аднак шасцітомная энцыклапедыя «Беларускія пісьменнікі» не згадвае біяграфіі гэтага аўтара. Памяць аб ім захавалася толькі з-за існавання гэтага выдання. Брашура Пётры з Арлянят «Што было і што павінна быць» пабачыла свет таксама ў друкарні М. Кухты ў 1918 г. Хоць выдадзена яна ва ўмовах нямецкай акупацыі, у ёй гучыць гарачы заклік любіць родную беларускую мову, каб быць годным у свеце народам. Для нас асабліва важным з'яўляецца тое, што на яе вокладцы змешчаны запіс знакамітай віленскай пісьменніцы і паэткі Зоські Верас «У падарунак С. С. Панізніку. 1982 год». «Пётра з Арлянят» – псеўданім выдатнага грамадскага дзеяча БССР Пятра Вікенцьевіча Ільючонка (1891–1945). На жаль, жыццё гэтага палымянага патрыёта абарвалася ў сталінскім ГУЛАГу.

У 1912 г. у Вільні было заснавана выдавецтва «Belarus», дзе выходзілі кнігі пераважна на лацінцы. Тут у 1914 г. была надрукавана і брашура нашага

земляка з в. Дзедзінцы Пятра Простага «Нашто беларусам газеты?», якая таксама знаходзіцца на паліцы раздзела. Аўтар у сваёй працы пераканаўча даказвае значэнне беларускіх газет у развіцці самасвядомасці беларускага народа. У Расіі не існавала беларускіх школ, навучанне адбывалася толькі на рускай мове, але, незважаючы на гэта, выдатныя дзеячы беларускай культуры разумелі неабходнасць выданняў для дзяцей. Вось чаму Якуб Колас і Алаіза Пашкевіч у 1908 г. надрукавалі кніжкі для маленькіх беларусаў: «Першае чытанне для дзетак беларусаў» і «Другое чытанне для дзетак-беларусаў». Абодва выданні занялі дастойнае месца ў нашай экспазіцыі. Самы знакаміты дзеяч беларускага Адраджэння пачатку XX ст. – Вацлаў Ластоўскі (1883–1938), дзіцячыя гады якога прайшлі ў в. Стары Пагост, дзе ён пачуў шмат легенд і паданняў, якія пазней былі ім апублікаваныя. Сапраўдным подзвігам можна назваць яго выданне «Кароткая гісторыя Беларусі», якое было надрукавана асобнай кніжкай у 1910 г. Аўтар упэўнены, што беларусы, як і іншыя народы, маюць сваю ўласную гісторыю. Акрамя гэтай кнігі ў нашай экспазіцыі прадстаўлены і «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік», выдадзены ў Коўне ў 1924 г. Выданне змяшчае не толькі агульную лексіку, але і асабовыя імёны. Змест брашуры В. Ластоўскага «Што трэба ведаць кожнаму беларусу?», надрукаванай у Менску ў 1918 г., не састарэў да сённяшняга дня. Па-ранейшаму актуальным з'яўляецца адказ на пытанне, што заключана ў назве кнігі: «Каб быць беларусам, трэба ведаць і любіць беларускую мову, размаўляць на ёй, ведаць сваю сапраўдную гісторыю і ганарыцца ёю». У музейнай экспазіцыі знаходзіцца зборнік вершаў таленавітага паэта і ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага руху Алеся Гаруна «Матчын дар» – таксама менскае выданне 1918 г.

Як бачым, нягледзячы на нямецкую акупацыю ў Мінску, у гэты час друкавалася шмат беларускамоўных выданняў. У музейных фондах знаходзіцца і першы падручнік па геаграфіі Беларусі, што быў выдадзены ў Вільні ў 1919 г. выдатным навукоўцам і грамадскім дзеячам Аркадзем Смолічам. На кнізе пячатка Мікалая Талеркі, які быў актывістам беларускага руху ў Латвіі. У экспазіцыі музея змешчаны цікавы зборнік Я. Фарботкі «Беларусь у песнях: літаратурна-гістарычны нарыс», які пабачыў свет у Мінску ў 1920 г. Аўтар упершыню грунтоўна прааналізаваў развіццё беларускай паэзіі на фоне нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага народа. Унікальнае выданне 1920 г. – пераклад на беларускую мову твора У. Караленкі «Лес шуміць». Аўтар гэтага перакладу – дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху, паэт, публіцыст Макар Краўцоў (Касцэвіч) – вядомы і тым, што сачыніў гімн Беларускай Народнай Рэспублікі «Мы выйдзем шчыльнымі радамі».

Як вядома, па Рыжскім мірным дагаворы сучасны Мёрскі раён увайшоў у склад Рэчы Паспалітай, улады якой праводзілі палітыку паланізацыі: зачынялі беларускія школы і гімназіі. Але нягледзячы на жорсткі нацы-

янальны ўціск, актывісты нацыянальнага адраджэння, якія засталіся ў Беларусі, працягвалі самаахвярную працу, каб беларускі народ атрымаў сваё роднае друкаванае слова.

Выключную ролю ў выдавецкай дзейнасці адыграў створаны ў Вільні Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Гурткі гэтага таварыства актыўна дзейнічалі і на Мёршчыне. У экспазіцыі музея знаходзіцца кніга з пячаткай гуртка БІГІК з в. Цяцеркі (цяпер Браслаўскі раён) – п'еса пісьменніка-святара Казіміра Сваяка «Янка Канцавы», надрукаваная ў 1924 г. у Вільні. За ўласны кошт выдаваў там жа кнігі кампазітар, педагог, фалькларыст Антон Грыневіч. У зборах нашага музея знаходзіцца яго зборнік «Дзіцячы спеўнік», які пабачыў свет у 1925 г. Для нас асаблівае значэнне маюць запісы песень з Дзісенскага павета, што былі занатаваныя вядомымі беларусамі Сымонам Рак-Міхайлоўскім і нашым земляком Янкам Пачопкам. У раздзеле музея прадстаўлена яго грунтоўнае выданне «Пчолы», надрукаванае ў Вільні ў 1922 г. Рарытэтным з'яўляецца віленскае выданне 1929 г. А. Навіны (псеўданім Антона Луцкевіча) «Галоўныя накірункі ў беларускай паэзіі», дзе аўтар падрабязна характарызуе творчасць беларускіх паэтаў першай чвэрці XX ст. У выдавецтве «Сялянская Ніва», што дзейнічала ў Вільні, у 1926 г. было надрукавана і вершаванае апавяданне Казіміра Сваяка «Чарку дай, браце».

Каб пашырыць ужыванне беларускай мовы ў святынях, былі надрукаваны малітоўнікі на беларускай мове. Гэта выданне ксяндза Я. Станкевіча «Голас душы» 1927 г. Для азнаямлення дзетак-беларусаў з Бібліяй на роднай мове ў 1936 г. у Вільні пабачыла свет «Свяшчэнная гісторыя Новага Запавету. Падручнік для беларускіх школ і самаадукацыі». Яе аўтар – вядомы багаслоў і педагог Сяргей Паўловіч. У Заходняй Беларусі адным з напрамкаў папулярызацыі беларускай мовы былі пераклады папулярных расійскіх паэтаў. Так, у навукова-дапаможных фондах музея знаходзіцца паэма А.С. Пушкіна «Казка аб рыбаку і рыбцы», надрукаваная ў 1935 г. у Вільні лацінкай у выдавецтве С. Глякоўскага і Я. Найдзюка. Пераклад выкананы Вінцуком Адважным, аб чым сведчаць лацінскія літары V. A.

Асобны раздзел музея прысвечаны старым беларускім часопісам, найбольшая частка якіх адносіцца да сельскагаспадарчай тэматыкі. Перш за ўсё ў нашай мясцовасці распаўсюджваўся часопіс «Саха», рэдактарам якога быў А. Уласаў. У фондах музея захоўваюцца асобныя нумары выдання за 1927–1929, 1931 гг. Ёсць у экспазіцыі і часопіс для пчаляроў «Беларуская борць», які выдаваў Беларускі кааператыў пчалярства «Пчала». Рэдактарам выдання з'яўлялася Зоська Верас. Рарытэтам музея з'яўляецца часопіс «Беларускі дзень», які выходзіў толькі ў 1927 г. Не менш каштоўным выданнем з'яўляецца часопіс «Крывіч», што быў падораны краязнаўцам з Латвіі Міколам Паўловічам. Друкаваўся ён у сталіцы даваеннай Літвы нашым знакамітым земляком, вучоным і грамадскім дзеячам Вацлавам

Ластоўскім у 1923–1927 гг. Наш музей кнігі і друку атрымаў у дар чацвёрты нумар гэтага выдання за верасень – кастрычнік 1923 г. Яшчэ адным часопісам, прэзентаваным нам краязнаўцам з Латвіі, з'яўляецца «Калоссе», які друкаваўся ў Вільні ў 1935–1939 гг. Калекцыя музея ўзбагацілася № 3 за 1939 г. Рэдактарам яго ў гэты час быў Янка Шутовіч. У склад рэдакцыі ўваходзіў і наш зямляк, гісторык і грамадскі дзеяч Мікола Шкялёнак. Адным з самых цікавых па змесце з'яўляецца падшыўка маладзёжнага часопіса за 1929 г. «Шлях моладзі», які быў перададзены ў музей актыўным удзельнікам гуртка Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры Пятром Кашкурам з в. Рачнёва. Цікавая замалёўка з Мёраў надрукавана ў сёмым нумары часопіса: аўтар Янка Пачопка пісаў пад псеўданімам «Стары дзядзька» аб пераследзе польскімі ўладамі беларускай прэсы. У перыяд фашысцкай акупацыі таксама выдаваліся часопісы на беларускай мове. У нашых фондах знаходзяцца некалькі нумароў часопіса «Беларуская школа» за 1942–1943 гг. Нягледзячы на акупацыйны рэжым, выданні захавалі свой патрыятычны накірунак па выхаванні менавіта не нямецкага, а беларускага патрыятызму, любові да роднай гісторыі, прыроды і культуры.

У раздзеле музея «Газеты» захоўваюцца асобнікі беларускіх газет. Найбольш каштоўным з'яўляецца для нас выданне «Беларуская крыніца», якую выпускала Беларуская хрысціянска-дэмакратычная партыя. Захавалася ў фондах музея поўная падшыўка гэтай газеты за 1926 г. У гэты час яе рэдактарам быў наш зямляк Браніслаў Туронак. У выданні, якое належала беларускай хрысціянскай дэмакратыі, змешчаны артыкулы разнастайнай тэматыкі. З заходнебеларускіх газет у нашай экспазіцыі маюцца асобнікі газет «Наша справа» і «Наша праўда» за 1927 г. У гэты час якраз праходзіў суд над дзеячамі Беларускай сялянска-рабочай грамады, таму газеты прысвячалі асноўныя старонкі менавіта гэтай тэме. Папулярнымі ў насельніцтва Заходняй Беларусі ў міжваенны час былі беларускія календары. У экспазіцыі і фондах музея знаходзяцца самыя разнастайныя іх тыпы. Так, «Беларускі каляндар на 1929 год» утрымлівае звесткі па гісторыі, палітыцы, школьнай справе, змяшчае юрыдычныя кансультацыі, сельскагаспадарчыя парады і г. д. Але найбольш значным для нас з'яўляецца «Беларускі каляндар на 1933 год», надрукаваны на сродкі нашага земляка, выдатнага дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху Язэпа Малецкага. У міжваенны перыяд друкавалася і шмат календароў для сялян. У фондах музея знаходзіцца «Беларускі сялянскі каляндар на 1937 год».

У сваім артыкуле мы прааналізавалі толькі асобныя беларускія выданні, якія знаходзяцца ў фондах нашага музея. Грунтоўнае іх вывучэнне патрабуе новых даследчых прац.

Карновіч М.А. *(в. Курына, Віцебскі раён)*

БІБЛІЯТЭЧНАЕ КРАЯЗНАЎСТВА ЯК ФАКТАР ЗАХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І ГІСТОРЫІ

Сучасная бібліятэка – гэта не толькі збор кніг, часопісаў, газет, але і сацыякультурны цэнтр па задавальненні інфармацыйных патрэб грамадзян. У невялікіх населеных пунктах бібліятэка на сённяшні дзень з'яўляецца найбольш даступным сацыяльным інстытутам, які можа задаволіць патрэбы грамадства ў інфармацыі. У сувязі з патрабаваннямі часу такая інфармацыйная прастора прадстаўлена, у першую чаргу, у гісторыка-краязнаўчым фармаце. А бібліятэкі выступаюць цэнтрамі па зборы, захаванні і папулярызацыі краязнаўчых матэрыялаў.

Дзейнасць сучаснай бібліятэкі цесна звязана з усімі формамі і кірункамі краязнаўства, а ўвесь комплекс работ установы ў гэтай галіне параўнальна нядаўна атрымаў у прафесійнай лексіцы такі тэрмін як бібліятэчнае краязнаўства – галіна бібліятэчнай дзейнасці, накіраваная на задавальненне краязнаўчых патрэб сродкамі бібліятэкі. Аб'ектам яго вывучэння з'яўляецца прырода, насельніцтва, гаспадарка, гістарычнае мінулае, мастацтва, культура вызначанага краю.

Курынская сельская бібліятэка вядома ў Віцебскім раёне як цэнтр адраджэння і захавання нацыянальнай спадчыны і развіцця агратурызму. Спалучэнне традыцыйных форм бібліятэчнай работы з культурна-дасугавай і музейнай дзейнасцю дало магчымасць накіраваць яе работу на развіццё сельскага турызму і прыцягненне шырокага кола наведвальнікаў.

Работа ў гэтым кірунку звязана з дзейнасцю на тэрыторыі Курынскага сельскага Савета ў в. Задзвінне агратурыстычнага комплексу – сядзібы «Задзвінне», якая належыць сям'і Тулякіных. Гаспадары і госці сядзібы наведваюць бібліятэку, знаёмяцца з экспанатамі этнаграфічнага кутка. У свой час установу наведвалі ўдзельнікі Міжнароднай экспедыцыі на байдарках «Заходняя Дзвіна», удзельнікі сумеснай экспедыцыі газеты «Рэспубліка» і тэлеканала АНТ.

Распрацаваная комплексная праграма «Тут карані, адсюль вытокі», па якой Курынская сельская бібліятэка працуе з 2009 г., дазволіла сабраць і зберагчы для будучых пакаленняў багаты духоўны матэрыял па гісторыі і культуры роднай старонкі, стварыць калекцыю краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў.

Пошукава-збіральніцкая дзейнасць па назапашванні дакументаў пра гістарычнае мінулае в. Курына прывяла ў свой час да высновы аб неабходнасці стварэння пры бібліятэцы этнаграфічнага кутка. Этнаграфічныя экспедыцыі па вёсцы і яе ваколіцах далі магчымасць сабраць даволі багатую этнаграфічную калекцыю, вельмі разнастайную па змесце: рэчы гаспадарчага і хатняга ўжытку, адзенне, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога

мастацтва – даматканыя посцілкі, вырабы, вязаныя кручком, спіцамі, вышытыя сурвэткі, ручнікі і г. д. Прадметы этнаграфічнай спадчыны ўнесены ў «Спіс экспанатаў этнаграфічнага кутка», усе яны падпісаны з указаннем назвы прадмета і яго ўладальніка (калі гаспадар вядомы). На сённяшні дзень этнаграфічны куток налічвае 134 экспанаты.

Для вядзення краязнаўчай работы, стварэння бібліятэчна-бібліяграфічных рэсурсаў па тэме бібліятэкарамі нашай установы выкарыстоўваюцца два напрамкі дзейнасці.

Першы напрамак прадугледжвае шматпланавую работу **з існуючымі краязнаўчымі крыніцамі**, да якіх адносяцца:

– літаратура (мастацкая, навуковая, публіцыстычная, даведачна-бібліяграфічная) з фонду бібліятэкі, якая змяшчае краязнаўчую інфармацыю пра дадзены рэгіён;

– артыкулы перыядычных выданняў з краязнаўчымі матэрыяламі пра вёскі Курынскага сельскага Савета і іх жыхароў.

Другі напрамак бібліятэчнай дзейнасці скіраваны **на самастойнае вывучэнне** роднага краю, пошук раней невядомых звестак аб ім і стварэнне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў. Так, за апошнія пяць гадоў у Курынскай бібліятэцы назапашаны краязнаўчы матэрыял па асноўных напрамках жыцця аднавяскоўцаў, які прадстаўлены ў друкаванай і электроннай формах. Сярод **друкаваных краязнаўчых рэсурсаў** можна вылучыць наступныя:

1. «Летапіс вёскі Курына Віцебскага раёна», які змяшчае запісы сустрэч са старажыламі, успаміны, фотадакументы, копіі матэрыялаў з дзяржаўных і сямейных архіваў, краязнаўчага музея г. Віцебска, фондаў Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Матэрыял, назапашаны ў летапісе, кожны год дапаўняецца і выкарыстоўваецца падчас правядзення мерапрыемстваў.

2. Старонкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны знайшлі сваё адлюстраванне ў міні-даследаванні «Страчаныя вёскі на тэрыторыі Курынскага сельскага Савета», турыстычным маршруце «Па партызанскіх мясцінах Курынскай зямлі», зборніку інфармацыйных матэрыялаў па грамадзянска-патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі «За гэтай сцяною стогне зямля…». Ён быў выдадзены сумесна з ДУА «Курынская дзіцячы сад – базавая школа Віцебскага раёна» і сістэматызуе ўсю біяграфічную інфармацыю пра малалетніх вязняў в. Курына.

3. Краязнаўча-бібліяграфічны паказальнік «Родны край, ты мне мілы спрадвеку: што чытаць пра Курынскі край», які складаецца з чатырох раздзелаў: а) «Зямля, нам дадзеная лёсам» – раскрывае гісторыю в. Курына з часоў першага ўпамінання ў летапісных дакументах да нашых дзён; б) «Курынскі край у гады Вялікай Айчыннай вайны»; в) «Героі – нашы землякі», г) «Матэрыяльная і духоўная спадчына Курынскага краю». Бібліяграфічны паказальнік ілюстраваны, змяшчае шэраг фотаздымкаў.

4. Творча-краязнаўчая работа «З гісторыі аднаго фотаздымка», якая распавядае пра гісторыю царквы Мікалая Цудатворца, што калісьці ўпрыгожвала цэнтральную вуліцу в. Курына.

5. Даследчыя працы «Семантыка арнамету рушнікоў вёскі Курына» і «Гісторыя праса: з сівой даўніны да нашых дзён». Аб'ектамі даследавання ў гэтых работах сталі экспанаты этнаграфічнага кутка пры бібліятэцы.

6. Краязнаўча-творчы праект «Мая сям'я – мой гонар», які быў рэалізаваны ў 2016 г., меў на мэце вывучэнне гісторыі і сучаснасці сямей в. Курына ў кантэксце перадачы сямейных традыцый, творчасці, працоўнага вопыту ад старэйшага пакалення да малодшага.

Адным з перспектыўных напрамкаў дзейнасці бібліятэкі з'яўляецца стварэнне электроннай калекцыі краязнаўчых матэрыялаў. Сярод іх можна вылучыць:

– відэаэкскурсію «Мая малая Радзіма»;
– відэатэку «Жывыя галасы мінуўшчыны»;
– краязнаўчы праект «Ад вытокаў – да вечнага»;
– візітную картку населенага пункта «Фотапартрэт вескі Курына»;
– відэапрэзентацыю «Гарэў мой край у полымі вайны»;
– відэаролік аб рабоце аматарскага аб'яднання «Уцеха».

Усе гэтыя матэрыялы ўвайшлі ў электронную поўнатэкставую базу дадзеных «Курына», якая змяшчае інфармацыю пра гісторыю, сучасны стан вёскі, сацыяльна-культурныя аб'екты краю, знакамітых асоб. У бібліятэцы краязнаўчыя матэрыялы дэманструюцца на разгорнутай выставе «Тут карані, адсюль вытокі».

Асобнае месца ў краязнаўчай рабоце Курынскай сельскай бібліятэкі займае дзейнасць аматарскага аб'яднання «Уцеха», якое было створана ў 1995 г. Удзельнікі гуртка асвойваюць народныя рамёствы: саломапляценне, бяростапляценне, лозапляценне. Усе гэтыя віды народных промыслаў мелі месца ў дзейнасці нашых аднавяскоўцаў, таму асноўная задача аматарскага аб'яднання – адрадзіць старадаўнія віды рамяства, якія сведчаць пра духоўны і матэрыяльны светапогляд нашых продкаў. На занятках удзельнікі таксама знаёмяцца з народным фальклорам, звязаным з рамёствамі, з літаратурай па тэме пасяджэння, здзяйсняюць інтэрнэт-візіты да вядомых майстроў Беларусі і Расіі, удзельнічаюць у этнаграфічных падарожжах, экскурсіях, творчых вечарах. Для ўсіх жадаючых наведвальнікаў бібліятэкі праводзяцца майстар-класы па саломапляценні і берастапляценні. Штогод члены аматарскага аб'яднання «Уцеха» прадстаўляюць свае вырабы падчас правядзення раённых святаў.

Краязнаўства – гэта не толькі тое, што пакінулі нам нашы продкі, але і тое, што застанецца пасля нас. Таму значнае месца ў Курынскай сельскай бібліятэцы адводзіцца камунікацыі з падрастаючым пакаленнем. Перадача досведу продкаў, фарміраванне цікавасці да гістарычнай і культурнай спадчыны народа ажыццяўляецца праз разнастайныя формы масавай работы.

Паводле звестак, сабраных мясцовымі органамі ўлады, да 1955 г. аршанская іўдзейская абшчына налічвала каля 60 асоб, якія рэгулярна збіраліся на набажэнствы ў доме, размешчаным на рагу вул. Калгаснай і Кірава. У гутарцы з намеснікам упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР, які ў 1955 г. наведваў Оршу, А.П. Нодаў – адзін з актывістаў абшчыны – заявіў, што вернікі не маюць намеру рэгістраваць сваю абшчыну, бо ў іх няма ні сінагогі, ні рабіна, ні дастатковай колькасці сяброў. У сваю чаргу намеснік упаўнаважанага трактаваў дадзеную заяву, як імкненне замаскіраваць дзейнасць рэлігійнай абшчыны [20, арк. 144–145].

У 1957 г. вернікі Оршы збіраліся ў памяшканні па вул. Калгаснай, 10. У сярэднім 2 разы на тыдзень на малітоўныя сходы прыходзіла ад 10 да 50 вернікаў, кіраўніком групы з'яўляўся І.Б. Пячэрскі [10, арк. 32].

Падобнае становішча захоўвалася і ў пачатку 1960-х гг. У прыватнасці, у кастрычніку 1961 г. незарэгістраваная іўдзейская абшчына Оршы налічвала 40–50 вернікаў, уласнага малітоўнага дома яна не мела [8, арк. 283].

У 1962 г. аршанская абшчына ажыццяўляла свае сходы ў прыватным доме па адрасе вул. Калгасная, 23, яе дзейнасцю кіраваў І.Б. Пячэрскі (на той час ён з'яўляўся пенсіянерам). Паводле слоў І.Б. Пячэрскага ён набыў згаданы будынак у Рыўкіна ў 1945 ці 1946 г., і з той пары жыў там разам з жонкай. Нагадаем, што паводле іншых звестак дом па ўказаным адрасе быў пабудаваны спецыяльна для малітоўных сходаў. Набажэнствы праходзілі раніцай і вечарам па суботах (на іх збіралася каля 10–15 чалавек), а таксама па рэлігійных святах (наведвала каля 30 вернікаў). За карыстанне памяшканнем сябры абшчыны ўзялі на сябе абавязак ацяпляць дом [6, арк. 12; 11, арк. 47].

Нягледзячы на тое, што пра дзейнасць іўдзейскай абшчыны Оршы было вядома, упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР па Віцебскай вобласці лічыў немэтазгодным рэгістраваць яе, бо сходы адбываліся пераважна з нагоды найбольш важных рэлігійных

святаў і наведваліся асобамі сталага ўзросту. Адначасова службоўцы апасаліся, што выдача дазволу на афіцыйную рэгістрацыю пацягне за сабой актывізацыю іўдзеяў не толькі ў Оршы, але і ў іншых раёнах вобласці [12, арк. 247].

У сваю чаргу ўпаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР крытыкаваў сваіх падначаленых за тое, што яны імкнуцца замоўчваць факты функцыянавання ў гарадах іўдзейскіх абшчын, што нібыта гэта дрэнна адбіваецца на рэпутацыі той ці іншай вобласці. Упаўнаважаны лічыў недапушчальнымі выпадкі, калі рэлігійныя абшчыны пазбаўляліся рэгістрацыі і з таго часу за імі не вялося назіранне з боку мясцовых улад. Неабходна адзначыць, што такой крытыцы падвергся і ўпаўнаважаны Савета па Віцебскай вобласці адносна аршанскай іўдзейскай абшчыны [19, арк. 120–121].

У сярэдзіне 1960-х гг. вернікі-іўдзеі Оршы падтрымлівалі кантакты з абшчынамі замежных краін, якія аказвалі ім некаторую дапамогу. Так, напярэдадні свята Песах у 1965 г. у Оршу прыбыла адна пасылка з Ізраіля і адна – з ЗША (усе гэтыя пасылкі актыўна адсочваліся савецкімі органамі) [9, арк. 74].

У 1966 г. паводле афіцыйных даных аршанская іўдзейская абшчына налічвала 20–25 вернікаў [3, арк. 26]. У 1967 г. з мэтай абмежавання яе дзейнасці міліцыя зрабіла папярэджванне незарэгістраванай групе вернікаў, якія сабраліся на малітоўны сход 21 мая 1967 г. у доме І.Б. Пячэрскага па вул. Калгаснай, 23 [2, арк. 155].

З пачатку 1970-х гг. дзейнасць аршанскай абшчыны стала менш актыўнай: сходы вернікаў-іўдзеяў праводзіліся радзей, яны па-ранейшаму не мелі ўласнага малітоўнага дома. Да таго ж у 1972 г. памерлі А.П. Нодаў і І.Б. Пячэрскі, якія з'яўляліся асноўнымі каардынатарамі абшчыны [4, арк. 314]. Яе новым кіраўніком стаў Лазар Шэхтар, які пражываў па вул. Маякоўскага, 9. У 1976 г. іўдзейскае аб'яднанне налічвала 20–25 чалавек, свае сходы яны праводзілі ў памяшканні па вул. Калгаснай, 23 [5, арк. 40].

Такім чынам, нягледзячы на адсутнасць афіцыйнай рэгістрацыі, аршанская іўдзейская абшчына функцыянавала на працягу ўсяго даследуемага перыяду. Паводле розных даных яе колькасць вагалася ад некалькіх дзясяткаў асоб (якіх можна лічыць найбольш актыўнымі сябрамі) да некалькіх соцень. Асноўную частку вернікаў складалі мужчыны ва ўзросце пасля 50 гадоў. Калі ў першыя пасляваенныя гады абшчына імкнулася да легалізацыі сваёй дзейнасці, то пазней яна абрала тактыку ўтойвання яе ад органаў мясцовай улады. У сваю чаргу супрацьдзейнічанне апошніх іўдзейскай абшчыне было дастаткова пасіўным і праяўлялася галоўным чынам у недапушчэнні яе рэгістрацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. **Витебщина** освобожденная : октябрь 1943 – декабрь 1945 : документы и материалы / сост. Н. В. Воронова [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. – 584 с.
2. **Дзяржаўны** архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 1439. – Воп. 1. – Спр. 3.
3. **ДАВВ.** – Фонд 1439. – Воп. 1. – Спр. 11.
4. **ДАВВ.** – Фонд 1439. – Воп. 2. – Спр. 27.
5. **ДАВВ.** – Фонд 1439. – Воп. 2. – Спр. 38.
6. **ДАВВ.** – Фонд 1439. – Воп. 3. – Спр. 177а.
7. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 1. – Спр. 2.
8. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 1. – Спр. 13.
9. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 1. – Спр. 19.
10. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 2. – Спр. 7.
11. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 2. – Спр. 13.
12. **ДАВВ.** – Фонд 4029. – Воп. 2. – Спр. 14.
13. **Краткая** еврейская энциклопедия : в 11 т. / ред. совет: Х. Бейнарт [и др.]. – Иерусалим : Еврейский ун-т, 1992. – Т. 6 : Обеты – Пять свитков. – 940 с.
14. **Нацыянальны** архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 952. – Воп. 1. – Спр. 7.
15. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 1. – Спр. 8.
16. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 1. – Спр. 17.
17. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 2. – Спр. 11.
18. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 2. – Спр. 21.
19. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 2. – Спр. 27.
20. **НАРБ.** – Фонд 952. – Воп. 2. – Спр. 51.

Лаўрык Ю.М. *(г. Мінск)*

ДА ПЫТАННЯ ПРА КРЫНІЦЫ СКАРЫНАВАГА ПЕРАКЛАДУ БІБЛІІ

Савецкі гісторык Яраслаў Шчапаў, калі вывучаў у 1970-х гг. славянскія рукапісы ў фондах польскіх бібліятэк, выявіў у зборах былой Ардынацыі Замойскіх рукапісныя кнігі з правененцыямі полацкага Сафійскага сабора. Ім жа было вылучана і некалькі манускрыптаў, якія, хоць такіх правененцый не мелі, аднак, верагодна, таксама паходзілі з Полацка. Паводле грунтоўна аргументаванага меркавання Я. Шчапава гэтыя кнігі трапілі ў бібліятэку Яна Замойскага пасля заваявання горада войскам Стэфана Баторыя ў 1579 г. [6]. Кнігазнаўчае апісанне рукапісаў навуковец даў у каталогу «Восточнославянские и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской Народной Республики» [5].

З беларускіх даследчыкаў непасрэдным вывучэннем гэтых выданняў займаўся мінскі гісторык Васіль Варонін, які ўслед за Шчапавым аб'яднаў

згаданыя рукапісы па іх знешнім выглядзе і прысутных інскрыпцыях у адзіны кніжны комплекс полацкага паходжання [3].

На дадзены момант нас цікавіць толькі адзін помнік з названага комплексу – а менавіта канвалют, які ўключае кнігі Старога Запавету: Ісуса Навіна, Суддзяў, Руф, чатыры кнігі Царстваў і Эсфір. Той факт, што сабраныя ў ім рукапісы датуюцца апошняй чвэрцю XV ст., а ў збор Замойскіх яны трапілі ў 1579 г., дае нам права дапусціць, што яны маглі знаходзіцца ў Полацку ўжо напачатку XVI ст.

Гэтая акалічнасць бачыцца вельмі важнай з той прычыны, што склад канвалюта супадае з кнігамі, надрукаванымі Скарынам напрыканцы 1518 г. (жнівень–снежань) і ў 1519 г. Акрамя таго, на старонках Кнігі Эсфір прысутнічаюць глосы да паасобных слоў у тэксце, што можа з'яўляцца слядамі падрыхтоўкі тэксту да публікацыі – а гэта значыць, наўпрост указвала б на манускрыпт як на адну з крыніц Скарынавага перакладу.

Паколькі раней ніхто з даследчыкаў згаданы канвалют з дзейнасцю першадрукара не звязваў, аўтар гэтых радкоў палічыў неабходным напярэдадні юбілейнага года айчыннага кнігавыдання прыцягнуць увагу навуковай грамадскасці да магчымага выкарыстання нашым першадрукаром прысутных у канвалюце манускрыптаў пры падрыхтоўцы перакладу Бібліі. У гэтым кантэксце перад намі стаялі наступныя задачы:

1) праверыць, ці ўлічаны згаданыя глосы ў выданнях Скарыны – а таму, ці могуць належаць апошняму;

2) выявіць ступень уплыву царкоўна-славянскага тэксту на пераклад;

3) праверыць тэкст названых рукапісаў на прадмет супадзення з тэкстам пражскіх выданняў – такім чынам высветліць, ці маглі яны выкарыстоўвацца Скарынам пры перакладзе Бібліі.

Доступ даследчыкаў да тэкстаў канвалюта на сёння спрошчаны дзякуючы размяшчэнню поўнафарматнай лічбавай копіі помніка на сайце «Cyfrowa Biblioteka Narodowa "Polona"» [1]. Пры аналізе тэкстаў пражскіх друкаў я карыстаўся факсімільным выданнем Скарынавай Бібліі [2].

Параўнанне глосаў з тэкстам выдання Кнігі Эсфір паказала, што Скарына іх не выкарыстоўваў. Напрыклад, у манускрыпце прысутнічае выраз «от одуда же и до хусъ», які на палях патлумачаны «отъ Індѣи до Куш» – друкар жа перадае фрагмент, як: «Ѿинъдии Доеѳиопии». Падобнае назіраецца і з імёнамі асобаў: імя «Вафесъ» патлумачана, як «Терешь», у той час як Скарына ўжывае форму «Таресъ». Між іншым, рэдактар манускрыпта ў некаторых выпадках рабіў спробы прывесці тэкст да аднастайнасці: у адным месцы да слова «староста» ён дапісаў на палях слова «тивунъ», а ў іншым, наадварот, да слова «тивуна царева» – «старосты». Для нас, аднак, важна тое, што ані першага, ані другога слова ў Кнізе Эсфір Скарына не ўжывае зусім. Такім чынам, прысутныя на старонках Кнігі Эсфір маргінальныя глосы ў выданні Скарыны не выкарыстаны, а значыць не з'яўляюцца яго праўкамі.

Аднак гэты факт не азначае, што рукапісы канвалюта не маглі быць выкарыстаны Скарынам пры падрыхтоўцы пражскіх выданняў. Каб зразумець ступень уплыву царкоўна-славянскага тэксту, найперш прыгледземся да паслядоўнасці Скарынавага перакладу. Яшчэ Пётр Уладзіміраў паказаў, што ў аснову выданняў Скарыны пакладзены тэкст Чэшскай Бібліі 1506 г., заснаваны на Вульгаце [4, с. 129]. Якую ролю ў такім выпадку адыграў тэкст царкоўнаславянскі?

Разгледзім сказ з пачатку канвалюта: «[…] же братæ вашеæ весь крѣпокъ и поборите по них дондеж҃ покои б҃гъ братю вашю æкож҃ и вас» [1, слайд 1]. У выданні Скарыны гэты фрагмент з Кнігі Ісуса Навіна (I, 14–15) гучыць наступным чынам: «[Вы пакъ сами идите] предъ братиею вашею сынъми израилевыми вси мужи сильныи возброи, и воюйте пред ними дондеже дасть господь богъ ѿпочинение братии вашей, æкоже и вамъ прежде далъ есть» [2, т. 1, с. 743].

На жаль, Чэшская Біблія 1506 г. у мінскіх музейных ды бібліятэчных зборах адсутнічае; не ўдалося таксама выявіць яе поўнафарматнай копіі ні ў *Manuscriptorium*'е, ні на сайтах буйных бібліятэк – таму мы не можам у поўнай меры выкарыстаць яе для параўнання. Аднак для нашай цяперашняй мэты дастаткова і Вульгаты, тэкст якой паслужыў падставай для чэшскага перакладу. Паводле яе цытаваны фрагмент выглядае наступным чынам: «[vos autem transite] armati ante fratres vestros omnes fortes manu et pugnate pro eis donec det requiem Dominus fratribus vestris sicut et vobis dedit».

Зрабіўшы параўнанне пададзеных версій фрагмента, мы бачым, што сапраўды у аснове перакладу Скарыны ляжыць тэкст, заснаваны на Вульгаце, а ўплыў царкоўнаславянскага тэксту – мізэрны і праяўляецца хіба толькі ў даданні паводле рукапісу злучнікаў «дондеже» і «æкоже».

У большай ці меншай меры падобны вынік мы атрымалі і пры выбарачным параўнанні іншых месцаў у тэкстах канвалюта са Скарынавымі выданнямі і Вульгатай. У асобных выпадках ступень прысутнасці царкоўнаславянскага тэксту была большай, але найчасцей яна абмяжоўвалася некалькімі словамі ці зваротамі, што былі ўстаўлены ў тканку заснаванага на Вульгаце перакладу; прычым і вельмі вялікія фрагменты выкарыстоўваліся толькі ў выпадку іх сэнсавага супадзення са згаданым выданнем.

Такім чынам, да кірылічных рукапісаў Скарына звяртаўся ўжо post factum: зрабіўшы найперш пераклад на старабеларускую мову паводле Чэшскай Бібліі, ён ужо пасля выбіраў характэрныя царкоўнаславянскія выразы-«маркеры», якія ўстаўляў у адпаведныя месцы падрыхтаванага тэксту. Інакш кажучы, царкоўнаславянскі пераклад кніг Бібліі ўжываўся ім выключна ў «дэкаратыўных» мэтах – каб зрабіць мову сваіх выданняў больш звыклай для вока айчыннага чытача.

Тым не менш, каб не падпасці пад абвінавачванне ў карыстанні неадпаведнымі крыніцамі, для далейшага аналізу возьмем цытаты з Чэшскай Бібліі

1506 г., пададзеныя ў манаграфіі П. Уладзімірава [4]. У гэтым кантэксце наша праца аблягчаецца яшчэ і тым, што даследчык суправадзіў цытаваныя фрагменты паралельнымі месцамі з Генадзеўскай і Астрожскай Біблій, што дае магчымасць адразу параўнаць іх з тэкстам нашых рукапісаў. Ніжэй мы падаём толькі цытаты з Астрожскай Бібліі, якую выбралі з-за рэдакцыйнай блізкасці да рукапісаў нашага канвалюта.

Кніга Ісуса Навіна (V, 9)

Чэшская Біблія 1506 г.: «Y rzekl ge pán buoh k Yozue. Dnesť gsem odyal poganienje Egipské od wás» [4, с. 150].

Астрожская Біблія: «И рече ґь Къисүсү въд҃нешній д҃нь, ѿринүхъ оукоризнү Египетскү ѿвасъ» [4, с. 150].

Полацкі рукапіс: «Иреч҃ ґь Къисүс҃ въд҃нешнїй д҃нь ѿринүхъ оукоризнѫ Египетскү ѿвасъ» [1, сл. 11].

Выданне Скарыны: «Иреч҃е гс҃дь КоИсүсу днесь есмъ ѿнѧлъ үкоризну Египетъскую ѿвасъ» [2, т. 1, с. 743].

Кніга Суддзяў (XIX, 22)

Чэшская Біблія 1506 г.: «Akdyž gsú gedli a po czestie odpočžijwali» [4, с. 131].

Астрожская Біблія: «Иегда възвеселисѧ срд҃це ихъ» [4, с. 131].

Полацкі рукапіс: «иѣдоша ипиша. сихже веселѧщихсѧ срд҃цемъ» [1, сл. 172].

Выданне Скарыны: «Иегда наелисѧ ипочали почивати поүтружании путѧ» [2, т. 2, с. 86].

Кніга Руф (I, 22)

Чэшская Біблія 1506 г.: «Y przyssla gest Noemi s Rúth newiestú swú z zemie Moabské: kdežto byla po hostinu do Bethléma we žni, gdyž nayprw žali geczmen» [4, с. 150].

Астрожская Біблія: «ивъзвратисѧ ноемминь, ирүѳа сноха еѧ снею, ѡбращаюшисѧ съ села моавлѧ, ипридоста въ виѳлеомъ вначало жатвы ѣчменѧ» [4, с. 150].

Полацкі рукапіс: страчаны аркуш з адпаведным фрагментам (павінен знаходзіцца паміж арк. 183 і 184).

Выданне Скарыны: «Ипришла ест Ноеми Зруѳомъ невестъкою своею изъземли Моавъское Довиѳълеома Іюдина вначало жатвы ѣчменѧ» [2, Т. 2, с. 106].

Кнігі Царстваў (1, XIV, 44)

Чэшская Біблія 1506 г.: «toto mi vcžyn pan buoh: a nadto przyday: žeť gest nelze než vmrzyeti Jonato» [4, с. 131].

Астрожская Біблія: «да смертію үмреши днесь іонаѳан» [4, с. 131].

Полацкі рукапіс: «тако створи ми б҃гъ исе приложи ми ида смер҃тию үмреши днес҃» [1, сл. 257].

Выданне Скарыны: «сие ми үчини боже инадто придаи, ижеть есть нельзе токмо үмрети Енаѳо» [2, Т. 2, с. 175].

Кніга Эсфір (VIII, 9)

Чэшская Біблія 1506 г.: «Tehdy powolawsse kanczlérzuow a pijsarzuow králowských» [4, с. 166].

Астрожская Біблія: «ивозвани быша пѣсцы цр҃вы» [4, с. 166].

Полацкі рукапіс: «и возвани быша писцы цр҃вы» [1, сл. 702].

Выданне Скарыны: «Тогда позвали диаковъ ипсаревъ Царевыхъ» [2, Т. 2, с. 679].

Такім чынам, пераклад біблейскіх кніг у выданнях Францішка Скарыны ажыццяўляўся паводле Чэшскай Бібліі 1506 г., а царкоўнаславянскія рукапісы выкарыстоўваліся толькі з мэтай надання тэксту звыклага для чытача выгляду.

Прысутныя ў Скарынавым перакладзе фрагменты царкоўна-славянскага тэксту паказваюць, што рэдагаванне, верагодна, адбывалася паводле рукапісаў той самай рэдакцыі, што прысутнічаюць у Полацкім канвалюце. Аднак наяўны матэрыял не дазваляе на дадзены момант выявіць індывідуальныя рысы выкарыстаных друкаром рукапісаў.

Інакш кажучы, хоць непасрэдных сведчанняў пра тое, што рукапісы з канвалюту польскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве BOZ 105 выкарыстоўваліся Скарынам, не выяўлена, аднак яны дэманструюць тэкстуальныя супадзенні з перакладам біблейскіх кніг у выданнях першадрукара. Гэта дае падставы меркаваць, што Скарына мог пры перакладанні карыстацца Полацкім канвалютам – ці падчас непасрэднай працы з тэкстам, ці загадзя зрабіўшы з іх копію.

Тым не менш, каб выказацца на гэты конт больш катэгарычна, неабходна ажыццявіць больш дэтальнае супастаўленне Скарынавых выданняў з тэкстам Чэшскай Бібліі, з аднаго боку, і з іншымі царкоўнаславянскімі рукапісамі адпаведных старазапаветных кніг – з другога.

ЛІТАРАТУРА

1. **BOZ** 105 [Электронны рэсурс] : Biblia. Księgi Starego Testamentu. – S. l., ca 1475 – ca 1500 // Cyfrowa Biblioteka Narodowa «Polona». – Рэжым доступу: https://polona.pl/item/8629319. – Дата доступу: 13.10.2016.

2. **Біблія** : факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынаю ў 1517–1519 гг. : у 3 т. / [адказ. рэд. С. В. Кузьмін]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 1990–1991. – Т. 1–3.

3. **Варонін, В. А.** «Книга светого Софея» : (да гісторыі полацкіх кніжных збораў XV–XVI стст.) / В. А. Варонін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 3. – С. 46–51.

4. **Владимиров, П. В.** Доктор Франциск Скорина : его переводы, печатные издания и язык / П. В. Владимирова. – [Санкт-Петербург] : Тип. Императ. Акад. наук), 1888. – [10], XXVI, [2], 351 с., [1] л. фронт., [11] л. : ил. – (Общество любителей древней письменности).

5. **Восточнославянские** и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской народной республики : в 2 ч. / сост. Я. Н. Щапов. – М., 1976. – Ч. 1, 2.

6. **Щапов, Я. Н.** Библиотека полоцкого Софийского собора и библиотека Академии Замойской / Я. Н. Щапов // Очерки русской истории, источниковедения, археографии / Рос. акад. наук, Отд-ние ист.-филол. наук. – М. : Наука, 2004. – С. 297–313.

Макараў М.Д. *(г. Мінск)*

НОВАЯ КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ВАСКРАСЕНСКАЙ РЫНКАВАЙ ЦАРКВЫ Ў ВІЦЕБСКУ

Васкрасенская Рынкавая царква – адзін з найпрыгажэйшых будынкаў гістарычнага цэнтра Віцебска і архітэктурных сімвалаў горада. Узвядзенне мураванага храма было завершана ў 1772 г. На жаль, пра гісторыю царквы ў больш ранні час захавалася адносна мала звестак. Вядома, што ў другой палове XVI – першых дзесяцігоддзях XVIII ст. храм быў драўляным, размяшчаўся на рагу вул. Падзвінскай (сучасная вул. Талстога) і Узгорскай (сучасная вул. Суворава), усходняй алтарнай часткай выходзіў на Рынкавую плошчу [3, с. 54–55].

Падчас вывучэння захаваных кніг віцебскага магістрата, што зберагаюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску, намі быў выяўлены дакумент, які дадае да гісторыі Васкрасенскай Рынкавай царквы некалькі істотных, раней невядомых дэталяў. Гэта ліст аб продажы ў 1733 г. мешчанінам зямельнага ўчастка, што непасрэдна прылягаў да храма, царкоўнаму брацтву [1, арк. 410 – 412 адв.]. Тэкст крыніцы змешчаны ў канцы артыкула.

Дакумент асвятляе наступную сітуацыю. 20 верасня 1733 г. віцебскі мешчанін Сымон Фелінскі Лытка прадаў старастам брацтва Васкрасенскай Рынкавай царквы (віцебскім райцам Сымону і Міхалу Лапам, бурмістру Цімафею Мушчынку, райцу Даніэлю Бабурку) свой пляц у Віцебску, размешчаны побач з храмам. Грошы, неабходныя для набыцця зямельнага ўчастка (115 талераў), былі выплачаны мяшчанкай Таццянай Бонічаўнай і яе мужам Ільёй Лускіным са сродкаў памёрлага брата Таццяны, віцебскага мешчаніна Яна Тэадоравіча Боніча, згодна з тастаментам апошняга. Царкоўнае брацтва атрымала права свабодна распараджацца згаданым пляцам: магло пабудаваць на ім шпіталь для бедных або адвесці яго пад могілкі. За гэта яно павінна было ўпісаць імёны самога Яна Боніча, яго бацькі Тэадора і сястры Таццяны ў сінодзік-памяннік (брацкі каталог) Васкрасенскай Рынкавай царквы. Усе ўмовы трансакцыі, несумненна, былі агавораны яе ўдзельнікамі яшчэ пры жыцці мецэната.

Як вынікае з тэксту крыніцы, набыты на карысць царквы зямельны ўчастак знаходзіўся непадалёк ад Рынкавай плошчы на вул. Суражскай. Такую назву ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. магла мець пракладзеная з рынку ў паўночным напрамку вул. Узгорская, бо менавіта яна выводзіла да Суражскай брамы Узгорскага замка. Пляц Лыткі меў форму няправільнага чатырохвугольніка, прычым, як вынікае з апісання, рэльеф мясцовасці на ім значна паніжаўся ў кірунку з усходу на паўднёвы захад. Сваім галоўным усходнім бокам, што меў даўжыню каля 39 віленскіх локцяў, пляц выходзіў на вул. Суражскую насупраць зямельных участкаў віцебскай ратушы і будынка гарадской важніцы. Паўднёвым бокам (звыш 30 локцяў) участак непасрэдна прылягаў да Васкрасенскай Рынкавай царквы. Яго заходняя, дакладней паўднёва-заходняя мяжа (амаль 46 локцяў), бегла па схіле гары ўздоўж размешчанай ніжэй, ужо на вул. Падзвінскай, зямлі бурмістра Цімафея Мушчынкі. Паўночным бокам (37 ½ локцяў) пляц прылягаў да ўчастка пад назвай «Кабак», што належаў каталіцкай царкве і выходзіў на тую ж вул. Суражскую.

Дакумент сведчыць пра тое, што на момант продажу пляца (20 верасня 1733 г.) на прылеглым да яго з паўднёвага боку царкавішчы не існавала ніякага будынка храма. Тут знаходзіўся толькі «закладзены падмурак згарэлай віцебскай Васкрасенскай Рынкавай царквы». Вызначыць, калі здарыўся пажар, што знішчыў большую частку драўлянай забудовы Узгор'я разам з царквой, няцяжка. У Летапісе Аверкі і Панцырнага паведамляецца, што 31 мая 1733 г. па старым календары (11 чэрвеня 1733 г.) «горад Віцебск, рынак, крамы і цэрквы выгарэлі ад вялебных айцоў бернардынаў, якія рабілі арган і зайгралі на ўвесь свет» [2, с. 200]. У запісе пра гэты пажар на палях экзэмпляра рукапіснай «Кнігі прывілеяў Віцебска», што захоўваецца ў Кракаве, Васкрасенская Рынкавая царква згадваецца сярод знішчаных агнём будынкаў [4, арк. 227]. 11 чэрвеня 1733 г. старая царква перастала існаваць, а ўжо праз 3 месяцы (да 20 верасня) працы па закладцы на яе месцы падмурка новага храма былі завершаны. Сціслыя тэрміны выканання будаўнічых работ схіляюць да высновы, што размова ідзе пра падмурак драўлянага, а не магутнага мураванага будынка. Можна ўпэўнена казаць пра тое, што пасля пажару 1733 г. храм на рынку быў яшчэ раз адноўлены з дрэва.

Археолаг І. Цішкін на падставе матэрыялаў раскопак 1991–1994 гг. выказаў меркаванне, што ўзвядзенне арыентаванай апсідай на поўнач мураванай Васкрасенскай Рынкавай царквы «пачалося недзе на мяжы 40-х – 50-х гг. 18 ст.». Ім было таксама ўстаноўлена, што «на пагорку з паўночнага боку (старой драўлянай. – *М. М.*) царквы знаходзіліся могілкі», а «новы мураваны храм быў пастаўлены на тэрыторыі старых могілак», і «падчас закладкі падмуркаў будаўнікі натыкаліся на пахаванні, рэшткі якіх былі сабраны імі і перазахаваны ў адмыслова зробленай дзеля гэтага нішы ў цэнтры падмурка алтарнай апсіды» [3, с. 54–55]. Неабходна нагадаць, што ўмовы перадачы

Сымонам Фелінскім Лыткам свайго пляца старастам царкоўнага брацтва прадугледжвалі магчымасць арганізацыі на ім могілак. Не выключана, што пахаванні на былым мяшчанскім агародзе з'явіліся толькі пасля 1733 г.

Такім чынам, зямельны ўчастак, пра які ідзе размова, непасрэдна прылягаў да старога драўлянага будынка Васкрасенскай Рынкавай царквы з паўночнага боку. Пасля перадачы царкоўнаму брацтву ён некаторы час выкарыстоўваўся як могілкі. Гэты пляц можна ўпэўнена лакалізаваць. У нашы дні на ім узвышаюцца паўночная частка асноўнага аб'ёму і апсіда мураванага храма. Дакумент не дае магчымасці дакладна датаваць, калі тут пачалося быдаўніцтва з цэглы, аднак, несумненна, трансакцыя 20 верасня 1733 г. адыграла выключнае значэнне ў пазнейшай гісторыі царквы. У яе выніку зямельны ўчастак на рынку ў Віцебску, што належаў храму, значна павялічыўся і набыў выцягнуты ўздоўж вул. Узгорскай з поўдня на поўнач выгляд. Дзякуючы гэтаму праз некалькі дзесяцігоддзяў пры ўзвядзенні мураванай царквы невядомы нам дойлід атрымаў магчымасць адмовіцца ад традыцыйнай арыентацыі будынка апсідай на ўсход, развярнуць яго корпус па асі поўдзень–поўнач і арганічна ўпісаць галоўным фасадам у архітэктурны ансамбль Рынкавай плошчы.

1733 г. кастрычніка 2. г. Віцебск. – Актыкацыя мешчаніну г. Віцебск Сымону Фелінскаму Лытку ліста 1733 г. верасня 20. г. Віцебск. аб продажы ім за грошы мешчаніна г. Віцебск Яна Боніча старастам брацтва Васкрасенскай Рынкавай царквы Сымону і Міхалу Лапам, Цімафею Мушчынку і Даніэлю Бабурку зямельнага ўчастка на вул. Суражскай у г. Віцебск.

«*[410]* Zeznania zapisu wieczysto przżedażnego od szlachetnego pana | Symona Felinskiego szlachetnym panom starostom | cerkwi Woskresenskiey Rynkowey witebskiey da|nego, służącego y należącego. |

Roku tysiąc siedemsetnego trzydziestego trzeciego | m(ie)s(ią)ca octobra dnia wtorego. |

Przede mną Antonim Pioro, skarbnikiem woie|wodzstwa, lantwoytem witebskim od iasnie wiel|możnego j(ego)mosci pana Marcijana Michała z | Kozielska Oginskiego, woiewody y woyta witeb|skiego, borysowskiego, przżewalskiego, babilickiego | et c(etera) starosty, pułkownika J(ego) K(rólewskiej) M(o)sc(i) ustanowionym. Y | przed nami burmistrżami, raycami, ławnikami | y cało rado magistratu miasta J(ego) K(rólewskiej) M(o) sc(i) Witebska na | sądach maydeburij w ratuszu zasiadaiącymi. |

Stanowszy oczewisto szlachetny pan Symon Felin|ski Łytko, burmistrżowicz witebski, zapis swoy | wieczysto przżedażny szlachetnym panom Symo|nowi y Michałowi Łapom, raycom, Danielowi | Boburce, raycowi, witebskim, fundatorom sta|rostom cerkwi Woskresenskiey Rynkowey witeb|skiey dany, służący y należący przżyznał, a przyznawszy | prosił nas urżędu aby był do akt xiąg mieskich ratusz|nych witebskich przyięty y wpisany.

Iakoż mi, urząd, ony | przyiowszy y ogłondawszy że wszytko rzeczo w nim in|serwowaną wpisac w akta zlecilismy. Który wpisuiąc | słowo do słowa tak się w sobie ma. || *[410 адв.]*

Ia, Symon Felinski Łytka, burmistrzowicz wi|tebski, czynię wiadomo y iawno zeznawam tym | moym dobrowolnym przedażnym zrzeczonym listem | nieodzownym zapisem, komu

by o tym wiedziec będzie | należało teraznieyszego y napotym będocego wieku | ludziom.

Iż ja maiąc w mocy, władzy, w spokoynym | wieczystym dzierżeniu y uzywaniu moim od w Bogu | zeszłych dobrodzieiow rodzica y matki mey Felins|kich Łytkow po rozdzieleniu placow z bracią mo|ią Felinskami Łytkami na moią częsc plac z | ogrodem naturalnym prawem przyrodzonym wiecz|noscią na moią osobe successive spadły leżący w | miescie Je(g)*o* Kr(ólewskiej) M(oś)c(i) Witebskim przy ulicy Suraz|kiey niedaleko od Rynku, mianowicie idąc z | targu żytnego obok cerkwi Woskresenskiey Ryn|kowey witebskiey z jedney strony, z drugiey strony | obok placu kapitulnego Kabakiem nazwa|nego szynkownego, na którym mieszka żyd Mow|sza Ickowicz, prżodem do ulicy Surazkiey prze|ciwko placow mieskich ratusznych witeb|skich y ważnicy, tyłem ku dołowi przyległy | do placu szlachetnego pana Tymofieja Musz|czynki, burmistrża y kupca miasta Je(g)*o* Kr(ólewskiej) | M(oś)c(i) Witebska, na którym mieszka sławetny pan | Niceta Abramowicz, ławnik miasta Je(g)*o* Kr(ólewskiej) M(oś)ci | Witebska, łokciową miarą wilensko z przodu od | ulicy Surazkiey od placu kapitulnego Kabackiego | do fundamentu założonego zgorżałey cerkwi Wos|kresenskiey Rynkowey witebskiey wdłuż łokci trzy|dziescie dziesięc y pułczwierci, tym fundamentem | cerkiewnym z jedney strony od placu szlachetnego | pana Muszczynki poprżek szyrżyni od ulici wdoł | łokci trzydziescie y trzec, od ulici od | placu pana Muszczynki poprzek łokci | trzydziescie siedem y puł łokcia w | klin, z tyłu od fundamentu około placu | pana Muszczynki wdłuz do płacu Kabaku w klin łokci | cztyrydziescie || *[411]* czty(r)dziescie pięc y czwierci trzy. Który ten plac do | daty tego listu mego dobrowolnego wieczysto | przedażnego zrzeczonego nikomu ni w czym | niepienny, niewinny, przewodami prawnemi, | długami, zapisamy obligacijnemi niobciążony, | wolny y swobodny, pod jurizdykcią mieską pod | przysądem prawa maydeburskiego zostaiący. | A będąc ja teraz pilno potrzebnym summy pie|niędzi na rożne potrzeby y expensa moie, przeto | nie z żadnego przymusu y ludzkiey namowy, lecz | sam po swey dobrey woli, ten plac z ogrodem | przedałem prawem wieczystym dla przyle|głosci onego, ku chwale Bożey na cerkiew | Woskresenską Rynkową witebską na ten | czas będącom fundatorom szlachetnym panom | Symonowi y Michałowi Łapom, szlachetnym | panom Timofiejowi Muszczynce, burmis|trżowi, Danielowi Boburce, raycowi, starostom | y successorom po nich następuiącym za sum(m)ę | w Bogu zeszłego sławentnego pana Theodoro|wicza Bonicza, raycowicza witebskiego, | przed zeysciem z tego swiata za żywota | na kupienie placu mego testamentem za|pisał sławetnemu panu Heliaszowi Łuskinie, | szwagrowi, y siestrze swey rodzoney, Tatianie | Boniczownie Heliaszowey Łuskinczyney, | małżonkom, opiekunom, aktorom y possessorom, | roskazuie onym, aby według stargowaney | summy ten plac zapłacili y na cerkiew Wos|kresenską Rynkową witebsko obrocili y | przyłączyli na wieczne potomne czasy. Na tą | intenciją aby fundatorowie starostowie teraz|nieyszy y sukcessorowie po nich następuiące w | modłach swych codziennych braterskich y | Służbach Bożych kapłanskich za dusze | zmarłych Theodora Bonicza, Tatjany | Boniczowey, y legatora tey summy Jana Bonicza, y wszystkich krewnych, tak żywych, || *[411 адв.]* jako y umarłych, wpisawszy do katałogu bra|terskiego zbawieniu dusz swiadczyc raczyli. | Za ktory plac z legacij summy Jana Bonicza | z wiernych rąk od pana Heliasza Łuskinki y | pani Tatiany Boniczowny Heliaszowey Łus|kinczyney, małżonkow, odliczyłem y odebrałem, | to iest talarow bitych sto y piętnascie, y urzędo|wnie przez ła(w)nika y sług mieskich ratusznych | witebskich na wiecznosc do cerkwi Woskresenskiey | Rynkowey witebskiey podałem y instromi|towałem. Wolni tedy y mocny będą wiż pomie|nioni fundatorowie starostowie y successorowie | onych ten plac spokoynie trzymac, szpitał dla | ubogich stawic, na cmentarz ku pogrzebowi z|marłych ludzi

chrżescianskich obrocic, pożytki | wynayduiąc odbierac, a odbieraiąc pod sum|nieniem na chwałę Bożą potrzebnę cerkwi | obracac, jednak ten plac od cerkwi Rynkowey | wiecznemi czasy nie ma byc odłączony, bez żad|ney ode mnie samego, krewnych y obczych ludzi | przeszkody y interessacij, ktorey czynic nie mam | y successorowie moi nie powinni będą, ale owszem | od każdego wstępuiącego turbatora, by y o nay|mnieyszo cząstkę u każdego sądu prawa swoim | groszem y nakładem ewinkowac, bronic, chronic, | oczyszczac y zastępowac powinien będę pod za|ręko talarow bitych stu y piętnastu y pod nag(ro)dze(niem) | szkod, kosztow, utrat y nakładow prawnych. O | którą zaręke, szkody, koszty, utraty y nakłady | prawne, jako y o naruszenie tego listu przedażnego | zrżeczonego, w ktorym kolwiek punkcie y para|grafie wyżey y niżey opisanym mnie samego | pozwem pozwac, zakazem zakazac, a gdzie ja | będąc zapozwanym lub zakazanym, nie schodząc | z izby sądowey zaręki, szkody, koszty, utraty, na|klady prawne zapłacic powinien będę pod toż | zaręką wyż opisaną. Spraw żadnych sta|rych nie mam w siebie gwoli drugich placow || *[412]* przedaznych szlachetnemu panu Tymofiejowi | Muszczynce, burmistrzowi witebskiemu, jednak | respektem obrony y ochrony uprosiwszy u pana | Muszczynki dodawac powinien będę.

Y na to ja, | Symon Felinski, burmistrżowicz witebski, dałem szlachetnym panom Symonowi y Michałowi, | raycom, Łapom, Tymofiejowi Muszczynce, bur|mistrżowi, Danielowi Boburce, raycowi, fun|datorom starostom cerkwi Woskresenskiey | Rynkowey witebskiey y successorom po nich na|stępuiącym, ten moy list dobrowolny przedazny | wieczysto zrżeczony zapis przy pieczęci z pod|pisem ręki moiey własney y z podpisem rąk | panow piczętarżow ode mnie ustnie y oczewisto pro|szonych.

Pisan w Witebsku roku tysiąc siedemset|nego trzydziestego trżeciego m(ie)s(ią)ca septembra dwu|dziestego dnia.

U tego zapisu podpisy rąk tak | samych aktorow, iako y panow piczętarżow timi | słowy. Tymofiey Muszczynko, burmistrz witebski, | ręko swą. Symon Felinski Łytka, ręko swą | własną. Ustnie oczewisto proszony pieczentarż | od osoby wysz wyrażoney do tego prawa wieczystego | przedażnego zrzeczonego podpisuię się podług pra|wa, Gabriel Awierka, burmistrz witebski. Ust|nie y oczewisto proszony pieczentarz od szlachet|nego pana Symona Felinskiego Łytki, burmi|strżowicza miasta J(ego) Kr(ólewskiej) M(o)sc(i) Witebska do tego | prawa wieczystego przedażnego zrzeczonego na | plac do cerkwi Rynkowey Woskresenskiey wi|tebskiey z legacij w Bogu zeszłego słł(awetneg)*o* pana | Jana Bonicza kupionego, do ktorego prawa wie|czystego podpisuię się, Symon Ziemkowicz, ławnik | J(ego) K(rólewskiej) M(ości) Witebska. Ustnie y oczewisto proszony od | osoby wiż wyrażoną do tego jego prawa dobrowolnego | przedaznego wieczysto zrzeczonego zapisu podług | prawa iako pieczętarz podpisuię się, Artemi Pawło|wicz, rayca witebski. Ustnie y oczewisto proszony pie|czentarz od osoby w tym liscie wyrażoney do tego jego | prawa wieczysto przedażnego podług prawa pod||*[412 адв.]*pisuię się, Niceta Abramowicz. Który to takowy za|pis za ustnym y oczewistym onego zeznaniem jest | do aktu xiąg mieskich ratusznych przyięty y w|pisany. | Wypis wydany» [1].

ЛІТАРАТУРА

1. **Нацыянальны** гістарычны архіў Беларусі. – Фонд 1805. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 410 – 412 адв.

2. **Полное** собрание русских летописей. Хроники : Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи : Баркулабовская, Аверки и Панцырного / АН СССР, Ин-т истории СССР. – Москва : Наука, 1975. – Т. 32. – 234 с.

3. **Цішкін, І.** Храм на Рынку ў Віцебску / І. Цішкін // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 54–56.
4. **Biblioteka** PAU/PAN w Krakowie. – Rękopis 3143.

Мыслівец Г.М. *(г. Полацк)*

СТАНАЎЛЕННЕ АГУЛЬНАЦАРКОЎНАГА КУЛЬТУ ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ (1910–1917)

Падчас кіравання расійскага імператара Мікалая II (1894–1917) адбылася актывізацыя дзейнасці ў кананізацыйным працэсе, дзякуючы чаму колькасць праслаўленых святых узрасла. Яшчэ ў 1908 г. на Усерасійскім місіянерскім з'ездзе, які праходзіў у Кіеве, была прынята рэзалюцыя аднавіць хадайніцтва аб перанясенні з Кіева-Пячэрскага манастыра ў Полацк святых астанкаў Еўфрасінні [8]. У адпаведнасці з пастановай Кіеўскага з'езда члены полацкага брацтва ў гонар святіцеля Мікалая і прападобнай Еўфрасінні і віцебскага Свята-Уладзімірскага брацтва, тысячы вернікаў на чале з епіскапам Полацкім і Віцебскім Серафімам (Мешчараковым) (1902–1911) у красавіку 1909 г. звярнуліся з прашэннем у Святейшы сінод [19]. Нарэшце (у сёмы раз), прашэнне, выказанае ад прадстаўніка Полацка-Віцебскай епархіі, было задаволена і 8 чэрвеня 1909 г. зацверджана Святейшым сінодам [6, с. 30].

Для таго, каб належным чынам сустрэць святыню, пастанавілі паўсюдна арганізоўваць хрэсныя хады, вызначыўшы загадзя маршруты іх накіравання. На ўсім шляху шэсця працэсіі са святымі мошчамі святары павінны былі прамаўляць пропаведзі, каб вернікі змаглі адчуць значнасць падзеі. У самім Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры была створана адпаведная інфраструктура для ўладкавання вернікаў падчас паломніцкіх візітаў: за адносна кароткі перыяд былі ўзведзены гасцінныя дамы, адрэстаўрыраваны храмы, манаскія карпусы і інш. У сваю чаргу, Савет полацкага брацтва разгарнуў актыўную падрыхтоўку да свята перанясення па ўсёй тэрыторыі Полацка-Віцебскай епархіі: сярод насельніцтва былі распаўсюджаны 5 тыс. экзэмпляраў брашур аб жыцці Еўфрасінні аўтарства членаў брацтва М. Дуброўскага і М. Зорына, складзены і выдадзены ў колькасці 1 тыс. экзэмпляраў «Путеводитель по г. Полоцку». Ва ўсе храмы епархіі былі дасланы іконы Еўфрасінні, а таксама брашуры са службай і акафістам святой з яе выявай, якія прызначаліся для бясплатнай раздачы паломнікам падчас свята. Так, вернікам Полацка-Віцебскай епархіі раздалі да 4 тыс. іконных выяў Еўфрасінні Полацкай на воблаку з шасціканцовым крыжам у руцэ, надрукаваных са старажытнай манастырскай іконы [15].

19 красавіка 1910 г. мошчы Еўфрасінні былі перакладзены ў новую кіпарысавую труну і вынесены з лаўрскіх пячор у Свята-Успенскі сабор. Старая рака з часціцай мошчаў (рука святой) засталася на былым месцы «для утешения братии Киево-Печерской Лавры» [10]. 22 красавіка мошчы перанеслі на прыстань да парахода «Галавачоў». У насавой частцы парахода, куды паставілі грабніцу пад балдахінам, была ўладкавана капліца з пасярэбраным купалам. Звонку верхняя частка парахода была абвіта гірляндамі з жывых кветак, а на мачце ўзведзены крыж з электрычных лямпачак [14, с. 19].

Сустрэча працэсіі адбылася 20 мая 1910 г. прыкладна ў 2 км ад Полацка, за так званай Віцебскай заставай, куды былі накіраваны хрэсныя хады з Полацка і вакольных мясцін [7, с. 4]. каля чыгуначнага віядука была ўладкавана засень, аздобленая жывымі кветкамі і нацыянальнымі флагамі. Рака з мошчамі, размешчаная пад парчовым балдахінам, была пакрыта аксамітным малінавым покрывам. Тканіна абабіта рэдкім гарнастаевым мехам, які выкарыстоўваўся з мэтай аздаблення мантый дзяржаўных асоб і з'яўляўся сімвалам улады. Як слушна заўважыў Л. Гарошка, «…тагачасная расейская ўлада і Царква аддавалі св. Еўфрасінні сапраўды царскія почасці» [2, с. 57]. Падчас правядзення Свята-Еўфрасіннеўскіх урачыстасцей мітрапаліт Флавіян завочна блаславіў расійскага імператара іконай Еўфрасінні Полацкай, асвячонай на яе мошчах [3, с. 138].

Акрамя Канстанціна Канстанцінавіча, вядомага пад паэтычным псеўданімам К. Р., у свяце перанясення мошчаў прыняў актыўны ўдзел шэраг іншых прадстаўнікоў дома Раманавых (Лізавета Фёдараўна, каралева Грэцыі Вольга Канстанцінаўна, Ігар Канстанцінавіч, Алег Канстанцінавіч). Трэба падкрэсліць выключную ролю Лізаветы Фёдараўны, якая падчас правядзення свята ў Полацку (20–23 мая) пасялілася ў Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры. У ноч на 23 мая 1910 г. яна асабіста прысутнічала пры пераапрананні мошчаў Еўфрасінні Полацкай перад пакладаннем іх у новую сярэбраную раку. Падчас знаходжання мошчаў у манастырскім Крыжа-Узвіжанскім саборы княгіня ў белым манаскім адзенні «…всю ночь, не сменяясь, простояла у раки преподобной, оправляя ее покров и служа крестьянам – подавая им иконки, вату, омоченную елеем из лампады» [3, с. 189–190]. 22 мая 1910 г. мошчы Еўфрасінні былі ўнесены ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр і першапачаткова пакладзены ў Крыжа-Узвіжанскім саборы [5, с. 50]. 23 мая 1910 г. мошчы Еўфрасінні Полацкай канчаткова пакладзены ў Спаса-Праабражэнскай царкве перад іканастасам між калонамі (падлога ў алтары была спецыяльна ўзнята на 18 см разам з прастолам). Такім чынам, труна была размешчана ў адным з найбольш значных месцаў храма, што з'яўлялася дэманстрацыяй неабходнасці шанавання і значнасці святой.

Перанясенне мошчаў Еўфрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк у 1910 г. спрыяльным чынам адбілася на павелічэнні колькасці паломнікаў у ма-

настыр. У 1915 г. епіскап Кірыён (Садзагелаў) (1915–1917) у справаздачы ў Свяцейшы сінод пазначаў: «Наиболее благотворным влиянием своей благочестивой жизнью на окружающее население отличается Спасо-Евфросиньевская обитель, в которой почивают мощи святой преподобной Евфросинии Полоцкой <…> Эта святыня в течении всего года привлекает многочисленных богомольцев не только из разных мест епархии, но даже из-за ее пределов» [18].

Факт перанясення мошчаў Еўфрасінні Полацкай таксама паўплываў на рост колькасці насельніц (у манастыры была прадстаўлена ўся еўрапейская частка Расіі) і даходаў манастыра [4]. Акрамя таго, адкрытасць мошчаў прападобнай мела вызначальнае значэнне для паспяховага існавання ўнутрыманастырскага культу. Адкрытыя мошчы (не знаходзяцца «пад спудам» у глуха запячатаных раках) давалі пачуццё блізкасці і відавочнай прысутнасці святой асобы, з'яўляліся крыніцай моцнага эмацыянальнага ўздзеяння на вернікаў. Згодна з высновамі мітрапаліта Яўлогія (Георгіеўскага), які прымаў удзел у перанясенні мошчаў: «Все это полоцкое торжество, несомненно, имело большое значение для местного населения, создало великий подъем его духа и укрепило его в преданности Православной Церкви и противостоянии соблазнам католичества» [3, с. 190]. Такім чынам, перанясенне мошчаў з узвядзеннем спецыяльнага мемарыяла над імі ў Спаса-Праабражэнскай царкве (рака, ківорый) стала завершанай формай царкоўнага шанавання Еўфрасінні Полацкай.

Усплёск у шанаванні прападобнай Еўфрасінні, абумоўлены перанясеннем мошчаў, стаў сур'ёзным штуршком для наступнага развіцця шматвобразнай іканаграфіі святой. Важнае месца пачалі займаць парныя выявы, у якіх падбор святых, як правіла, з'яўляўся адбіткам устойлівых сувязяў гістарычнага, сацыяльнага ці іншага характару. На абразе 10-х гг. XX ст., што знаходзіцца ў Мінскім Кафедральным саборы ў гонар Сашэсця Святога Духа, Еўфрасіння Полацкая была адлюстравана ў так званым «васняцоўскім» стылі разам з Ганнай Кашынскай [13, с. 17]. Святыя падзвіжніцы прадстаўлены не ў франтальным павароце, а нібыта звернутымі падчас гутаркі адна да адной. Позірк Еўфрасінні накіраваны ўверх, рукі складзены ў малітоўным звароце. Спалучэнне гэтых дзвюх святых на абразе можна патлумачыць тым фактам, што шанаванне Ганны Кашынскай, дэканізаванай Маскоўскім саборам 1677–1679 гг., было адноўлена ў 1909 г., за год да перанясення мошчаў Еўфрасінні з Кіева-Пячэрскай лаўры ў Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

У гонар свята перанясення мошчаў былі ўзведзены храмы Еўфрасінні Полацкай у Карсаве (Латвійская Рэспубліка) і Санкт-Пецярбургу (Расійская Федэрацыя). У 1913 г. у Івянцы (Мінская вобласць) епіскап Мінскі і Тураўскі Мітрафан (Краснапольскі) пры Свята-Троіцкім храме заснаваў Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр. 7 мая 1915 г. там быў асвячоны аднай-

менны храм [11, с. 181]. Акрамя таго, абнаўляліся і адраджаліся былыя храмы Еўфрасінні Полацкай. Так, напрыклад, намаганнямі мясцовага прычту і валаснога пісара С. Хадчынскага 28 лістапада 1910 г. быў адноўлены храм-капліца Еўфрасінні Полацкай у в. Бабынічы (Віцебская вобласць), які згарэў у 1906 г. Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр са свайго боку падараваў капліцы абразы і неабходнае царкоўнае начынне, а былы яраслаўскі губернатар А.А. Рымскі-Корсакаў ахвяраваў іканастас [16, с. 168–170]. Як вядома, феномен мошчаў заключаецца ў тым, што іх святасць і цудадзейная моц не памяншаецца падчас драбнення і застаецца раўназначнай па гаючай сіле ўсяму касцяку святой асобы.

Пасля таго, як 22 мая 1910 г. Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр цалкам прыняў цялесны склад Еўфрасінні Полацкай, прычт і прыхаджане Свята-Мікалаеўскага кафедральнага сабора хадайнічалі перад архіепіскапам Полацкім і Віцебскім Савай аб перанясенні часціцы мошчаў (сярэдні перст правай рукі) прападобнай у Віцебск [9]. Пасля задавальнення хадайніцтва Духоўная кансісторыя выпрацавала падрабязны цырыманіял і маршрут перанясення мошчаў [12]. 24 мая 1911 г. каўчэг з часціцай быў пакладзены пад спецыяльна падрыхтаваную засень і пранесены на руках праз шэраг населеных пунктаў Віцебскай губерні (Расоны, Язна, Невель, Гарадок, Рудня) [20]. Згодна з вызначаным маршрутам у вёсках Пустошы, Сухі Бор і Арцейкавічы былі ўладкаваны аркі, аздобленыя каляровымі ручнікамі і абразамі, пад якімі былі пастаўлены сталы з хлебам і соллю. 11 чэрвеня 1911 г. епіскап Полацкі і Віцебскі Серафім з працэсіяй сустрэў каўчэг на ўскраіне Віцебска. Месца сустрэчы святыні, як і Свята-Мікалаеўскі сабор, дзе пасля памясцілі куфар з часціцай мошчаў, былі ўпрыгожаны жывымі кветкамі і флагамі [1; 20]. У 1912 г. епіскап Холмскі і Люблінскі Яўлогій (Георгіеўскі) хадайнічаў у Свяцейшы сінод аб перадачы Турковіцкай жаночай абшчыне (з 1912 г. Турковіцкі жаночы манастыр на Холмшчыне, Украіна) часціцы мошчаў Еўфрасінні Полацкай для новазбудаванага храма ў імя полацкай ігуменні [17]. Вядома, што да 1915 г. часціцы ад мошчаў прападобнай былі таксама аддзелены для праваслаўных храмаў Рыгі, Варшавы і Новачаркаска [21].

З пачатку Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі Полацк апынуўся ў ваенным становішчы прыфрантавога горада. Свянцянскі прарыў германскіх войскаў каля станцыі Маладзечна прывёў да пагрозы захопу горада, і ваенныя ўлады выдалі загад аб эвакуацыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Прыярытэт быў нададзены святыні і людзям. Згодна з загадам Свяцейшага сінода рака з мошчамі ў суправаджэнні ігуменні і сясцёр манастыра была накіравана ў Растоў Вялікі (Яраслаўская вобласць, Расійская Федэрацыя). Вяртанне мошчаў Еўфрасінні на радзіму было зацягнута рэвалюцыйнымі падзеямі. Акрамя таго, з лютага па лістапад 1918 г. Полацк захоплены нямецкімі войскамі, а з верасня 1919 па май 1920 г. левабярэж-

ная частка горада апынулася пад польскай акупацыяй. За гады «растоўскай эвакуацыі» была знішчана большая частка манастырскай маёмасці, канфіскаваны царкоўныя рэліквіі (старажытныя абразы, каштоўныя рызы, аклады, еўхарыстычныя сасуды).

Такім чынам, мясцовае шанаванне Еўфрасінні Полацкай, захаванае ў народнай традыцыі ў межах Полацка, працягнута на якасна новым узроўні з 1840-х гг., калі культ набывае епархіяльныя рысы. У 1893 г. Сінод зацвердзіў службу ў гонар святой, а ў пачатку XX ст. быў складзены акафіст. Адсутнасць мошчаў Еўфрасінні Полацкай замарудзіла працэс трансляцыі культу з полацкага манастыра Святога Спаса, але не спыніла яго наогул. З моманту аднаўлення дзейнасці Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра ў 1841 г. і заснавання пры ім вучылішча для дзяўчын духоўнага чыну культ прападобнай пачаў актыўна пранікаць на тэрыторыю Расійскай Імперыі.

Паваротным момантам у развіцці культу Еўфрасінні Полацкай з'яўляецца яго выхад за межы Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Пасля аднаўлення яго дзейнасці ў імя прападобнай Еўфрасінні на тэрыторыі Віцебскай губерні быў як узведзены, так і пераасвячоны шэраг храмаў (в. Бабынічы, Бароўка, Росіца, Сакалішча, г. Полацк). У пачатку XX ст. адбываецца ўздым шанавання памяці святой, звязаны з падзеямі перанясення яе мошчаў (поўны цялесны склад) у Полацк.

Урачыстае перанясенне мошчаў у Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у 1910 г. стала падзеяй, якая прадвызначыла безумоўны росквіт шанавання святой і канчатковае афармленне яе культу пры архіепіскапе Полацкім і Віцебскім Серафіме (Мешчаракове). Маштаб урачыстасцей (красавік – май 1910 г.) паказаў, якога развіцця дасягнуў культ Еўфрасінні Полацкай, што некалі з'яўляўся выключна манастырскай традыцыяй. Той факт, што манастыр наведвалі прадстаўнікі дынастыі Раманавых, сведчыць аб тым, што культ святой канчаткова набыў дзяржаўнае значэнне.

ЛІТАРАТУРА

1. **Встреча** частицы св. мощей преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1911. – № 25. – С. 564.

2. **Гарошка, Л.** Святая Еўфрасіння-Прадслава, патронка Беларусі : нарыс жыцця і дзейнасці : артыкулы / уклад., прадмова У. А. Арлова. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 124 с.

3. **(Георгиевский)**, Евлогий. Путь моей жизни / Евлогий (Георгиевский). – Москва : Моск. рабочий : Всецерков. православ. молодеж. движение, 1994. – 621 с.

4. **Григорович, А.** Полоцкие торжества 20–24 мая 1911 г. / А. Григорович // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1911. – № 41. – С. 904–912.

